ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

БОЛЬШЭВІК БЕЛАРУСІ

№ 11 № 11



МІНСК
Выдавецтва ЦК КП(б)Б „ЗВЯЗДА"
1939

ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

БОЛЬШЭВІК БЕЛАРУСІ

ТЭАРЭТЫЧНЫ І ПАЛІТЫЧНЫ
ЖУРНАЛ ЦК КП(б)Б
ГОД ВЫДАННЯ XIII

№ 11

Лістапад 1939 г.

ЗМЕСТ

Адрас рэдакцыі:
Мінск, вул. Карла Маркса.
Памяшканне Парткурсаў пры ЦК КП(б)Б,
пакой 13.
Тэлефоны рэдакцыі: нам. рэдактара—камутатар 20.100, доб. 271; агульны—24.667.

Прывітанне таварыша СТАЛІНА

Байцам і кіраўнікам 1 Коннай арміі ў дзень яе дваццацігадовага юбілея—баявое прывітанне!

Прывітанне Будзённаму, Варашылаву, Куліку, Тімашэнко, Шчадэнко, Гарадавікову, Апанасенко, Тюленеву, Чэрэвічэнко, Ерэменко і другім, паклаўшым аснову Коннай арміі і ператварыўшым яе ў грозную сілу!

Прывітанне байцам, камандзірам, палітработнікам Коннай арміі, разграміўшым генералаў—Дзенікіна, Мамантава, Шкуро, Чэснакова, Врангеля і апракінуўшым войскі Пілсудскага ў часе гістарычнага рэйда ў раёне Жытоміра!

Прывітанне ўсёй нашай конніцы, у тым ліку—нашым конармейцам, пакрыўшай сябе славай у баях за вызваленне Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ад гнёту польскіх паноў!

Вечная памяць і слава таварышам Пархоменка, Дундзічу, Марозаву, Літунову, Бахтураву і многім другім конармейцам, склаўшым свае галовы ў баях за перамогу нашай вялікай совецкай радзімы!

І. СТАЛІН.

ПРЫВІТАННЕ ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ І СНК БССР БАЙЦАМ, КАМАНДЗІРАМ І ПАЛІТРАБОТНІКАМ КАВАЛЕРЫЙСКІХ ЧАСЦЕЙ І ЗЛУЧЭННЯЎ БЕЛАРУСКАГА ФРОНТА

ЦК КП(б) Беларусі і СНК БССР віншуюць байцоў, камандзіраў і палітработнікаў кавалерыйскіх часцей і злучэнняў Беларускага фронта ў дзень слаўнага дваццацігадовага юбілея Першай Коннай арміі.

Прывітанне слаўным патрыётам і ўдзельнікам арганізацыі Першай Коннай арміі таварышам Чэрэвічэнко і Ерэменко.

Чэсць і слава байцам, камандзірам і палітработнікам кавалерыйскіх часцей і злучэнняў Беларускага фронта—вызваліцелям працоўных Заходняй Беларусі ад гнёту польскіх паноў.

Вечная памяць і слава байцам, камандзірам і палітработнікам конармейцам, склаўшым свае галовы за справу вызвалення працоўных Заходняй Беларусі.

Сакратар ЦК КП(б) Беларусі П. ПАНАМАРЭНКА.
Старшыня СНК БССР К. КІСЕЛЁЎ.

Прамова па радыё Старшыні Совета Народных Камісараў СССР тав. В. М. МОЛАТАВА

29 лістапада 1939 г.

Грамадзяне і грамадзянкі Совецкага Саюза!

Варожая ў адносінах нашай краіны палітыка цяперашняга ўрада Фінляндыі вымушае нас прыняць неадкладныя меры па забеспячэнню знешняй дзяржаўнай безапаснасці.

Вы ведаеце, што на працягу двух апошніх месяцаў Совецкі ўрад цярпліва вёў перагаворы з фінляндскім урадам аб прапановах, якія, у сучаснай трывожнай міжнароднай абстаноўцы, ён лічыў мінімальнымі для забеспячэння безапаснасці краіны і асабліва для безапаснасці Ленінграда. Фінляндскі ўрад заняў у гэтых перагаворах непрымірыма варожую да нашай краіны пазіцыю. Замест таго, каб дружэственным чынам знайсці глебу для пагаднення, цяперашнія фінляндскія правіцелі, ва ўгоду замежных імперыялістаў—падпальшчыкаў варожасці да Совецкага Саюза, пайшлі па іншаму шляху. Не гледзячы на ўсе зробленыя намі ўступкі, перагаворы скончыліся безрэзультатна.

Цяпер вядома, да чаго гэта прывяло.

У апошнія дні на совецка-фінляндскай граніцы пачаліся абураючыя правакацыі фінляндскай ваеншчыны, аж да артылерыйскага абстрэлу нашых воінскіх часцей пад Ленінградам, прывёўшага да цяжкіх афяр у чырвонаармейскіх часцях. Спробы нашага ўрада практычнымі прапановамі, звернутымі да фінляндскага ўрада, папярэдзіць паўтарэнне гэтых правакацый, не толькі не сустрэлі падтрымання, але зноў наштурхнуліся на варожую палітыку правячых кругоў Фінляндыі. На нашы прапановы, як вы ведаеце з учарашняй ноты Совецкага ўрада, яны адказалі варожай адмовай і нахальным адмаўленнем фактаў, здзеклівымі адносінамі да панесеных намі афяр, непрыкрытым імкненнем і ў далейшым трымаць Ленінград пад непасрэднай пагрозай сваіх войск.

Усё гэта канчаткова паказала, што цяперашні фінляндскі ўрад, які заблытаўся ў сваіх антысовецкіх сувязях з імперыялістамі, не хоча падтрымліваць нармальных адносін з Совецкім Саюзам. Ён прадаўжае займаць варожую пазіцыю ў адносінах нашай краіны і не хоча лічыцца з патрабаваннямі заключанага паміж нашымі краінамі пакта ненападу, жадаючы трымаць наш слаўны Ленінград пад ваеннай пагрозай. Ад такога ўрада і яго безрассуднай ваеншчыны можна чакаць цяпер толькі новых наглых правакацый.

Таму Совецкі ўрад вымушан быў учора заявіць, што ад гэтага часу ён лічыць сябе свабодным ад абавязацельстваў, узятых на сябе ў сілу пакта аб ненападзе, заключанага паміж СССР і Фінляндыяй і безадказна нарушаемага ўрадам Фінляндыі.

З прычыны новых фактаў нападу фінляндскіх воінскіх часцей на

совецкія войскі ля совецка-фінляндскай граніцы, урад вымушан цяпер прыняць новыя рашэнні.

Урад не можа больш цярпець ствары́ўшагася становішча, адказнасць за якое поўнасцю кладзецца на ўрад Фінляндыі.

Урад прышоў да вываду, што больш ён не можа падтрымліваць нармальных адносін з урадам Фінляндыі і таму прызнаў неабходным неадкладна адклікаць з Фінляндыі сваіх палітычных і гаспадарчых прадстаўнікоў.

Урад даў, разам з тым, распараджэнне галоўнаму камандаванню Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота—быць гатовым да ўсякіх нечаканасцей і неадкладна прасякаць магчымыя новыя вылазкі з боку фінляндскай ваеншчыны.

Варожая нам замежная прэса сцвярджае, што прымаемыя намі меры праследуюць мэты захвату або далучэння да СССР фінляндскай тэрыторыі. Гэта—злосны паклёп. Совецкі ўрад не меў і не мае такіх намераў. Больш таго. Пры наяўнасці дружаственнай палітыкі з боку самой Фінляндыі ў адносінах Совецкага Саюза, Совецкі ўрад, які заўсёды імкнуўся да дружаственных адносін з Фінляндыяй, быў-бы гатоў пайсці ёй насустрач па частцы тэрытарыяльных уступак з боку СССР. Пры гэтай умове Совецкі ўрад быў-бы гатоў спрыяюча абмеркаваць нават такое пытанне, як пытанне аб з'яднанні карэльскага народа, насяляючага асноўныя раёны цяперашняй Совецкай Карэліі, з родственным яму фінскім народам у адзінай і незалежнай фінляндскай дзяржаве. Для гэтага, аднак, неабходна, каб урад Фінляндыі займаў у адносінах СССР не варожую, а дружаственную пазіцыю, што адпавядала-б кроўным інтарэсам абодвух дзяржаў.

Другія сцвярджаюць, што праводзімыя намі меры накіраваны супроць незалежнасці Фінляндыі або на ўмяшанне ў яе ўнутраныя і знешнія справы. Гэта—такі-ж злосны паклёп. Мы лічым Фінляндыю, які-б там рэжым не існаваў, незалежнай і суверэннай дзяржавай ва ўсёй яе знешняй і ўнутранай палітыцы. Мы стаім цвёрда за тое, каб свае ўнутраныя і знешнія справы рашаў сам фінляндскі народ, як гэта ён сам лічыць патрэбным. Народы Совецкага Саюза зрабілі ў свой час тое, што патрэбна было для стварэння незалежнай Фінляндыі. Народы нашай краіны гатовы і ў далейшым аказаць дапамогу фінляндскаму народу ў забеспячэнні яго свабоднага і незалежнага развіцця.

Совецкі Саюз не мае таксама намераў ушчаміць у якой-небудзь меры інтарэсы іншых дзяржаў у Фінляндыі. Пытанні ўзаемаадносін паміж Фінляндыяй і іншымі дзяржавамі з'яўляюцца справай выключна самой Фінляндыі, і Совецкі Саюз не лічыць сябе ў праве ўмешвацца ў гэтую справу.

Адзінай мэтай нашых мерапрыемстваў з'яўляецца — забеспячэнне безапаснасці Совецкага Саюза і асабліва Ленінграда з яго трох з палавінай мільённым насельніцтвам. У сучаснай накалёнай вайной міжнароднай абстаноўцы рашэнне гэтай жыццёвай і неадкладнай задачы дзяржавы мы не можам паставіць у залежнасць ад злой волі цяперашніх фінляндскіх правіцеляў. Гэтую задачу прыдзецца рашыць намаганнямі самога Совецкага Саюза ў дружаственным супрацоўніцтве з фінляндскім народам.

Мы не сумняваемся, што спрыяючае вырашэнне задачы забеспячэння безапаснасці Ленінграда паслужыць асновай непарушнай **дружбы паміж СССР і Фінляндыяй.**

Заява поўнамоцнай камісіі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі

Прамова тав. МАЛЕВІЧА А. С.

(Селянін вёскі Гулі, Слабадской воласці, Вілейскай вобласці)

Таварышы дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі!

Народы Заходняй Беларусі, вызваленыя гераічнай Чырвонай Арміяй, даручылі нам, сваім поўнамоцным прадстаўнікам, вітаць у Вашай асобе сваіх братоў шчаслівай, квітнеючай, ордэнаноснай Совецкай Беларусі. Яны даручылі нам перадаць нашу шчырую народную ўдзячнасць вялікаму совецкаму народу за выратаванне нас ад панскіх бізуноў, ад дзікага тэрору і здзекаў, ад вечнай нішчаты, голаду, ад нацыянальнага прыгнечання і няроўнасці.

Наша першая думка звернута да таго, хто прывёў совецкі народ да шчаслівага і радаснага жыцця, хто забяспечыў магутнасць і несакрушымую сілу вялікай краіны соцыялізма, забяспечыў мірную працу і творчае жыццё народу, хто ўсяляе сілы і ўпэўненасць прыгнечаным і эксплаатуемым народам свету ў іх барацьбе за сваё вызваленне,—да вялікага, мудрага настаўніка, нашага друга таварыша Сталіна. (Бурныя, працяглыя апладысменты, пераходзячыя ў авацыю. Усе ўстаюць. Голас: Няхай жыве вялікі Сталін! Аркестр грае «Інтэрнацыянал»).

Дарагія таварышы! Народнае Сабранне Заходняй Беларусі, выконваючы волю вызваленага народа, пастанавіла ўстанавіць на тэрыторыі Заходняй Беларусі Совецкую ўладу, адзіную ўладу ў свеце, дзе рабочыя і сяляне самі кіруюць сваёй дзяржавай і будуюць сваё жыццё без памешчыкаў і капіталістаў. Народнае Сабранне пастанавіла канфіскаваць памешчыцкую зямлю, нацыяналізаваць буйную прамысловасць і банкі.

Дарагія таварышы! Дваццаць год мы былі адарваны ад шчаслівага народа Совецкай Беларусі. Дваццаць год польскія памешчыкі і капіталісты грабілі і прыгняталі беларускі народ, дваццаць год яны марылі голадам нашу малазямельную і беззямельную вёску, дваццаць год капіталісты трымалі рабочы клас у становішчы пастаяннага беспрацоўя, жабрацкай заработнай платы і падвяргалі жорсткай эксплаатацыі.

Невялікая кучка ў 16.000 памешчыкаў мела ў сваім распараджэнні 45 проц. усёй зямлі, а 45 проц. сялянскіх гаспадарак не мелі зямлі. Толькі адна тысяча памешчыкаў Палесся ўладала $^2/_3$ усёй зямельнай плошчы, а 70.000 бедняцкіх сялянскіх гаспадарак вало-

далі толькі адной шаснаццатай часткай зямельнай плошчы. Вось вам характэрны прыклад, хто валодаў зямлёй і лясамі. Апрача гэтага, польскі ўрад правёў грабежніцкую хутарызацыю, адняў у сялян лепшыя землі і перадаў іх сваім ланцужным сабакам—польскім асаднікам. Польскія правіцелі ўзвалілі на плечы беларускіх сялян цяжкія падаткі, якія раслі з года ў год. Сяляне штогод уплачвалі да 90 страхавых і падатковых плацяжоў, а іменна: памаёмасны, зямельны, дарожны, школьны, больнічны, страхавы, падатак на сабак, на коміны і т. д. З нас бралі сродкі на больніцы, а іх у нас не было. З нас бралі грошы на школы, а большая колькасць насельніцтва непісьменная; многа дзяцей у школу не ходзяць, бо нехапае школ. Мы плацілі падаткі, а нашы грошы расплываліся па кішэнях міністраў, чыноўнікаў і эксплаататараў. Жорсткі эканамічны гнёт быў лёсам беларускіх рабочых і інтэлігентаў. Польскія капіталісты і фабрыканты, якой-бы яны нацыі ні былі, набівалі сабе кішэні, жорстка эксплаатуючы рабочых. Яны будавалі сваё шчасце за кошт эксплаатацыі працоўных. Затое колькасць беспрацоўных у Польшчы дасягала да 2,5 мільёна чалавек, з іх у Заходняй Беларусі было каля 400.000 чалавек. Большасць рабочых працавала па 6—7 месяцаў у годзе, атрымліваючы жабрацкую заработную плату.

Нацыянальны гнёт і няроўнасць—вось які лёс быў народаў Заходняй Беларусі. Памешчыкі і капіталісты былой панскай Польшчы ператварылі Заходнюю Беларусь у сваю калонію, яны наваднілі яе жандарамі, паліцэйскімі, шпіёнамі і правакатарамі, яны знішчылі беларускую нацыянальную культуру, яны адабралі ў нас права гаварыць на сваёй роднай мове. Яны хацелі вытравіць усякую думку аб вас—нашых братах, аб шчаслівым савецкім народзе, аб вялікім Савецкім Саюзе, але мы прагна лавілі малейшую праўду аб вас. Пад пагрозай турмаў і бізуноў мы тайна слухалі па радыё перадачы з Чырвонай Масквы і Мінска. Перад намі заўсёды быў светлы вобраз Савецкага Саюза—вялікае брацтва народаў, вызваленых ад пут капіталізма, шчаслівага і паспяхова будуючых сваё жыццё.

Савецкі Саюз з'яўляўся для нас пуцяводнаю зоркай, маяком, якіх не маглі скрыць ад народа ніякі паклёп буржуазных газет. Мы бачылі, як жыве Савецкі беларускі народ. З нашых прыгоркаў з вузенькімі палоскамі мы бачылі бязмежныя калгасныя палі, на якіх працавалі трактары, мы чулі вясёлыя песні савецкіх людзей, мы бачылі новыя сталінскія школы ў пагранічных сёлах. Мы марылі аб тым часе, калі злучымся з вамі ў адзіную дружную сям'ю, каб разам будаваць сваё жыццё, каб разам змагацца супроць ворагаў беларускага народа.

Не ўдалося польскім панам знішчыць беларускі народ. Многа дзесяткаў і соцень год беларускі народ змагаўся супроць прыгнечання польскіх паноў, многа гераічных старонак упісана ў гісторыю барацьбы беларускага народа.

Агульны лёс, агульная барацьба спаяла ў адно працоўны беларускі народ, і не ўдалося польскім панам вытравіць у нас імкненне да адзінства з народам Савецкай Беларусі. Выключныя поспехі Савецкай Беларусі яшчэ больш усялялі ў нас веру і імкненне да адзінства.

Вось чаму Народнае Сабранне Заходняй Беларусі, выражаючы волю, імкненні, спадзяванні і надзею народаў Заходняй Беларусі,

пастанавіла прасіць Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік і Вярхоўны Совет Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі прыняць Заходнюю Беларусь у састаў Совецкага Саюза і Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі **(бурныя апладысменты)**, з'яднаць беларускі народ у адзіную дзяржаву і пакласці тым самым канец раз'яднанню беларускага народа.

Дазвольце мне агласіць дэкларацыю, прынятую Народным Сабраннем Заходняй Беларусі па гэтаму пытанню.

ДЭКЛАРАЦЫЯ НАРОДНАГА САБРАННЯ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ АБ УВАХОДЖАННІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў САСТАЎ БЕЛАРУСКАЙ СОВЕЦКАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІКІ

Прынята аднагалосна на пасяджэнні 29 кастрычніка 1939 года

У цяжкую гадзіну, пагражаўшую разарэннем і знішчэннем нашаму народу, вялікі Совецкі Саюз узяў пад сваю абарону жыццё і маемасць насельніцтва Заходняй Беларусі.

З дапамогаю непераможнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі народы Заходняй Беларусі вызваліліся ад панавання памешчыкаў і капіталістаў. Назаўсёды мінулі чорныя годы знявагі беларускага народа пад ігам польскіх паноў, папіраўшых элементарныя правы і нацыянальнае дастоінства беларускага народа.

Працоўныя Заходняй Беларусі заўсёды лічылі сябе звязанымі неразрыўнымі, кроўнымі узамі з сваімі братамі, пабудаваўшымі Совецкую Соцыялістычную Беларусь.

Працоўныя Заходняй Беларусі рашуча патрабуюць аб'яднання дагэтуль расчлененых двух частак адзінага беларускага народа, адзінай беларускай зямлі.

Лічачы волю беларускага народа вышэйшым законам, Беларускае Народнае Сабранне пастанаўляе:

прасіць Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік і Вярхоўны Совет Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі прыняць Заходнюю Беларусь у састаў Совецкага Саюза і Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, аб'яднаць беларускі народ у адзіную дзяржаву і пакласці тым самым канец раз'яднанню беларускага народа.

Толькі ў саставе Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі народ Заходняй Беларусі здолее залячыць глыбокія раны, нанесеныя яму доўгімі гадамі зняволення, і з дапамогаю вялікага Совецкага Саюза падняць і пераўтварыць гаспадарку, развіць сваю народную культуру, дастойную свабоднага народа, і забяспечыць росквіт добрабыту ўсіх працоўных Заходняй Беларусі.

Няхай жыве Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка!

Няхай жыве наша магутная радзіма—вялікі Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік!

(Бурныя апладысменты, пераходзячыя ў авацыю. З усіх канцоў зала раздаюцца воклічы ў чэсць кіраўнікоў партыі і ўрада. «Няхай жыве таварыш Сталін!», «Тав. Сталіну ўра!», «Няхай жывуць народы Заходняй Беларусі!», «Бацьку і настаўніку—роднаму Сталіну ура!»).

Дарагія таварышы! Мы бязмежна шчаслівы і захоплены тым прыёмам, які быў аказан нам, членам Поўнамоцнай Камісіі народамі вялікага Совецкага Саюза.

Мы бязмежна шчаслівы і горды тым, што на нашу долю выпала найвялікшае шчасце ў прысутнасці вялікага Сталіна і яго бліжэйшых саратнікаў перадаць Сесіі Вярхоўнага Совета СССР просьбу народа Заходняй Беларусі аб прыняцці нас у састаў вялікага Совецкага Саюза. Мы ўбачылі вялікага Сталіна і яго саратнікаў. Як друг, як бацька, ён сустрэў нас, і яго ўсмешка напоўніла нас шчасцем. Гэтыя шчаслівыя дні, дні сустрэчы з родным Сталіным, астануцца на ўсё жыццё ў кожным з нас.

Нашы сэрцы напоўніліся радасцю, калі Унечарговая V Сесія Вярхоўнага Совета СССР прыняла рашэнне і задаволіла нашу просьбу—прыняла нас у дружную сям'ю народаў Совецкага Саюза радзіму працоўных усяго свету (Бурныя апладысменты).

Скончыліся назаўсёды жудасныя дні панскай няволі. Мы сталі свабоднымі грамадзянамі краіны Советаў—краіны соцыялізма. Няма большага шчасця ў свеце, як быць грамадзянінам вялікага Совецкага Саюза, няма большага шчасця ў свеце, як мець правы грамадзяніна Совецкага Саюза—права на працу, права на адпачынак, права на асвету, права на забяспечаную старасць. Няма большага шчасця ў свеце, як жыць, працаваць пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі—Канстытуцыі перамогшага соцыялізма, няма большага шчасця ў свеце, як мець такую магутную, квітнеючую соцыялістычную радзіму. (Бурныя апладысменты).

Дні нашага прабывання ў Маскве, сталіцы вялікага Совецкага Саюза,—гэта былі дні бязмежнага захаплення і здзіўлення. Тое, што мы ўбачылі, пераўзышло ва многа разоў усе нашы ўяўленні. Мы ўбачылі на прыкладзе горада Масквы поспехі соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР—тую гіганцкую работу, прароблeную Совецкім народам у справе перабудовы ўсёй краіны. Мы былі здзіўлены і захоплены маскоўскім метрапалітэнам, каналам Волга—Масква, гіганцкімі новапабудаванымі прадпрыемствамі. Мы ўбачылі соцыялістычны горад: прыгожыя жылыя дамы, вызначаныя для работнікаў працы, а не для капіталістаў і іх прыхвасняў. Мы ўбачылі дзіцячыя сады, яслі, школы, шчаслівую совецкую дзетвару, тэатры, кіно, паркі, музеі, інстытуты, універсітэты—усё гэта належыць народу і для народа. Мы бачылі радасную працу на соцыялістычных прадпрыемствах. Вызваленая жанчына заняла роўнапраўнае месца з мужчынай. Мы ўбачылі самае каштоўнае ў Совецкім Саюзе—гэта совецкі народ. Мы ўбачылі дружбу народаў і аднадушша ў рашэнні ўсіх дзяржаўных пытанняў.

Тое, што мы ўбачылі на Краснай плошчы ў Маскве ў дзень XXII гадавіны Вялікай Пралетарскай Соцыялістычнай Рэвалюцыі ў СССР, не паддаецца ніякаму апісанню. Бязмежнае адзінства Совецкага народа і згуртаванасць вакол Комуністычнай партыі, вакол свайго ўрада, бязмежная любоў да свайго друга і бацькі, роднага Сталіна. (Бурныя апладысменты). Магутнасць Чырвонай Арміі выпрабавалі на сваіх спінах польскія паны. Тое, што мы ўбачылі на парадзе на Краснай плошчы ў Маскве, наглядна нам паказала, што Совецкаму Саюзу не страшны ніякія ворагі. Няхай запомняць гэта падпальшчыкі другой імперыялістычнай сусветнай вайны.

Чырвоную Армію—узброеную сілу соцыялістычнай дзяржавы,



армію, якая прышла ратаваць нас ад жахаў вайны, праігранай незадачлівымі польскімі правіцелямі, мы сустракалі 17 верасня на нашых дарогах, у нашых сёлах і гарадах, засыпалі кветкамі шлях арміі-вызваліцельніцы. Мы актыўна дапамагалі Чырвонай Арміі, кожны воін яе стаў для нас дараг, як родны сын.

Таварышы дэпутаты! Велізарныя поспехі дасягнуты Совецкай Беларуссю за гэтыя годы. Выраслі гіганцкія прадпрыемствы. У 23 разы вырасла прамысловасць Совецкай Беларусі ў параўнанні з даваенным часам, пераўтварыліся гарады Совецкай Беларусі. Мінск з захудалага горада ператварыўся ў прыгожую, упарадкаваную сталіцу Совецкай Беларусі; ён упрыгожыўся грандыёзнымі будынкамі — Домам Урада, Дзяржтэатрам, бібліятэкай, Палацам піонераў, будынкам Акадэміі навук і т. д. З краіны непісьменнай і адсталай, Совецкая Беларусь ператварылася ў краіну суцэльнай пісьменнасці, высокай культуры. Яна мае 22 вышэйшыя навучальныя ўстановы, 41 навукова-даследчы інстытут, узначальваемы Акадэміяй навук БССР, 7.067 пачатковых і сярэдніх школ. Расцвіло мастацтва Совецкай Беларусі. Далёка за межамі Совецкай Беларусі вядомы імёны совецкіх пісьменнікаў, артыстаў, музыкантаў, мастакоў. Вырасла совецкая інтэлігенцыя.

Пераўтварылася вёска. Калгаснае сялянства жыве заможным і культурным жыццём. Велізарная дапамога аказана ім дзяржавай — 227 машынна-трактарных станцый, 8.141 трактар і больш тысячы камбайнаў працуе на палях калгаснай вёскі Совецкай Беларусі.

Таварышы дэпутаты! Ад імені 5-мільённага народа Заходняй Беларусі, упаўнаважыўшага нас, мы просім прыняць Заходнюю Беларусь у састаў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі. (Бурныя апладысменты). [illegible] чанне ў той частцы Беларусі, якая была ў панскай Польшчы. Увесь беларускі народ будзе разам будаваць сваё новае, шчаслівае жыццё.

Вы ведаеце, што наш народ працавіты і працу любіць. На сваім вопыце вы ведаеце, як вызваленая праца нараджае і паднімае таленты з народа. На вашым вопыце мы бачым, якую дапамогу аказвае Совецкі Саюз раней прыгнечаным і адсталым народам. [illegible]мі сіламі мы справімся з усякімі цяжкасцямі і ў максі[illegible] гістарычны тэрмін падцягнем Заходнюю Беларусь, аграбленую і прыдаўленую польскімі панамі, да узроўню перадавых соцыялістычных рэспублік, якой стала ўжо Беларусь Совецкая.

Мы ведалі і ведаем, што ў Совецкім Саюзе няма нацыянальнай розні, не гаворачы ўжо аб нацыянальным гнёце. Усе народы дружна працуюць пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі над росквітам сваёй соцыялістычнай гаспадаркі, сваёй соцыялістычнай культуры і разам высока паднімаюць эканоміку і культуру Совецкага Саюза — іх агульнай радзімы. Многанацыянальнасць — тое, што з'яўляецца для капіталістычных краін цяжкай, смяротнай хваробай, — у Совецкім Саюзе ператварылася ў брацкую сталінскую дружбу народаў, што не толькі яднае і ўмацоўвае Совецкі Саюз, але служыць прообразам аб'яднання ўсіх нацый у свеце і служыць лепшым агітатарам за Совецкую ўладу.

Мы ведалі і ведаем, што ў Совецкім Саюзе няма эксплаатацыі чалавека чалавекам, што тут ажыццяўляецца самая поўная роўнасць людзей, што тут «владыкой мира» стала свабодная, радасная і

чэсная праца на сябе, на сваіх дзяцей, на соцыялістычнае грамадства, што тут кожны грамадзянін акружан сталінскімі клопатамі аб чалавеку. Совецкі чалавек адказаў на гэта стаханаўскім рухам, высокай палітычнай свядомасцю і актыўнасцю, вялікім совецкім патрыятызмам.

Мы з радасцю ідзем у гэтую сям'ю народаў, у соцыялістычнае грамадства. Мы будзем старанна вучыцца ў вас, чэсна працаваць, змагацца за новае, шчаслівае жыццё. А для тых вар'ятаў, якія не кінулі яшчэ сваёй думкі аб звароце нас у ярмо панскай Польшчы, мы скажам: «як не ўзыходзіць сонцу з захаду і як Нёману і Дзвіне не бегчы назад з Балтыйскага мора да сваіх вытокаў, так не бываць нашай з'яднанай Совецкай Беларусі пад пятой польскага і ўсякага іншага пана». (Апладысменты). Усё сваё жыццё, да апошняй кроплі крыві, мы аддадзім у абарону Совецкай улады, нашай роднай улады, доўгачаканай. Заходнія рубяжы Совецкага Саюза, гарады і сёлы Заходняй Беларусі стануць непрыступнай крэпасцю вялікага Совецкага Саюза. А уся Совецкая Беларусь будзе цвердым, несакрушымым аплотам вялікага Совецкага Саюза, які вядзе Комуністычная партыя большэвікоў і яе ЦК на чале з таварышам Сталіным.

Няхай жыве Совецкая ўлада!

Няхай жыве Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік!

Няхай жыве Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка!

Няхай жыве вялікая Комуністычная партыя!

Няхай жыве доўгія-доўгія годы на радасць усяму чалавецтву наш правадыр, друг і настаўнік Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!

(Усе устаюць. Бурныя, доўга несмаўкаючыя апладысменты. Воклічы: «Няхай жыве таварыш Сталін!», «Няхай жыве вялікі Сталін!», «Няхай жыве Совецкая ўлада!», «Няхай жыве Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік!», «Няхай жыве Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка!», «Вялікаму Сталіну ура!, ура!», «Няхай жыве доўгія доўгія годы на радасць усяму чалавецтву наш правадыр, друг і настаўнік таварыш Сталін! Ура!», «Няхай жыве таварыш Сталін!», «Няхай жыве ЦК ВКП(б)!», «Таварышу Сталіну ура!», «Няхай жыве вялікая Комуністычная партыя!», «Дэпутату Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі таварышу Барашылаву ура!», «Няхай жыве дружба народаў СССР!», «Няхай жывуць вызваленыя народы Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, уваходзячыя ў вялікую совецкую сям'ю!», «Няхай жыве совецкая палітыка міру» (сказана на польскай мове). «Няхай жыве тварэц Сталінскай Канстытуцыі таварыш Сталін! Ура!»).

Прамова старшыні Совета Народных Камісараў БССР дэпутата тав. Кісялёва К. В.

Таварышы дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі!

2-га лістапада 1939 г., у гэты гістарычны дзень, Унечарговая Пятая Сесія Вярхоўнага Совета СССР слухала заяву Поўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі і пастанавіла: задаволіць просьбу Народнага Сабрання Заходняй Беларусі і ўключыць Заходнюю Беларусь у састаў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік са з'яднаннем яе з Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай.

Дазвольце ад імені ўрада БССР, ад імені працоўных Совецкай Беларусі павіншаваць вас, членаў Поўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі, а ў вашай асобе ўсіх працоўных Заходняй Беларусі, з вызваленнем вас нашай доблеснай Чырвонай Арміяй ад іга польскіх памешчыкаў і капіталістаў.

Таварышы дэпутаты! Мы слухалі заяву Поўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі з просьбай прыняць Заходнюю Беларусь у састаў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі. Гэтая заява Поўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання выражае ісціную волю і жаданне народаў Заходняй Беларусі.

У адпаведнасці з просьбай Поўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі і законам «Аб уключэнні Заходняй Беларусі ў састаў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік са з'яднаннем яе з Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай» Унечарговай Трэцяй Сесіі Вярхоўнага Совета БССР прадстаіць вырашыць гістарычнае пытанне аб прыняцці Заходняй Беларусі ў састаў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

Польскія паны, адарваўшыя 20 год таму назад ад рэволюцыйнай Расіі землі беларускія і украінскія, падвяргалі самай жорсткай эксплаатацыі і нацыянальнаму прыгнечанню народы, насяляючыя гэтыя землі. 20 год, змрочных і страшных год, народ Заходняй Беларусі быў адорван ад сваіх адзінакроўных братоў, ад шчаслівага народа Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

Адчуваючы побач з усімі працоўнымі былой польскай дзяржавы цяжкую эксплаатацыю, эканамічнае разарэнне, беларусы і украінцы апрача таго падвяргаліся бесчалавечнаму нацыянальнаму гнёту, ганенням, здзекам і гвалту. Пазбаўленыя права гаварыць на сваёй роднай мове, яны падвяргаліся гвалтоўнаму апалячванню, пазбаўляліся ўсякіх чалавечых праў, цярпелі знявагі, марнелі.

Заходняя Беларусь была поўкалоніяй польскай буржуазіі, культываваўшай яшчэ феадальна-памешчыцкія традыцыі.

Польская шляхта наўмысля тармазіла развіццё прамысловасці на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Эксплаатацыя рабочых дасягала крайніх межаў. Сяляне Заходняй Беларусі былі заціснуты ў страшэнныя ціскі беззямелля, нястачы і бяспраўя. Многія дзесяткі тысяч сялянскіх двароў зусім не мелі зямлі і цягла. Са смуткам і слязьмі глядзелі беларускія сяляне на прыгожыя азёры, пасьбішчы і лясы, якія яны бязмежна любілі, але якія былі захвачаны ненавіснымі памешчыкамі.

Працоўны селянін не мог беспакарана ступіць на панскую зямлю, якая па праву павінна была належаць народу. За галінку, зламаную ў памешчыцкім лесе, селяніна збівалі панскія леснікі. Калі карова выпадкова трапляла на памешчыцкае поле, селяніна штрафавалі, а карову забіралі панскія найміты.

Сяляне жылі ў курных хатах, пры лучыне, карыстанне лямпай было роскашшу. Яны не маглі купіць запалак, солі, цукру.

Польскія капіталісты і памешчыкі грамілі беларускую культуру. Родная беларуская мова была прагнана са школ. Усе беларускія школы былі закрыты, нацыянальная чэсць беларускага народа зняважана, яго культура ўтаптана ў гразь паліцэйскім ботам.

Сотні тысяч рабочых і сялян Заходняй Беларусі былі непісьменнымі. Вёска пазбаўлена была ўсякай медыцынскай дапамогі.

Заходняя Беларусь—гэта быў край сацыяльнага і нацыянальнага прыгнечання. Жабрацтва, голад, бяспраўе былі адвечнымі спадарожнікамі працоўных Заходняй Беларусі. Якіх толькі зняваг не перацярпелі працоўныя народы Заходняй Беларусі! Але гісторыя свабодалюбівага украінскага і беларускага народаў мае гераічныя старонкі барацьбы з польскай шляхтай. Польскія паны злобна помсцілі працоўным Заходняй Беларусі за кожную іх спробу паўстаць, вырвацца з панскага хамута. Але не можа быць моцнай, жыццяздольнай дзяржава, якая трымала цэлыя народы на становішчы каланіяльных рабоў. Довадам гэтаму служыць імклівы распад былой панскай Польшчы.

Беларусь да Кастрычніцкай рэвалюцыі з'яўлялася каланіяй рускага царызма, адсталай нацыянальнай «акраінай», амаль не мела буйнай прамысловасці. Дробная саматужная прамысловасць займала ў валавой прадукцыі 70 проц. Вельмі паказальны «пункт погляду» царскіх заправіл на пытанне аб развіцці прамысловасці ў Беларусі. Захаваліся дакументы, у якіх прама указвалася, што «развіццё і стварэнне прамысловых цэнтраў у заходнім краі, неспакойным, блізкім да заходняй дзяржаўнай граніцы, непажадана».

У рэзультаце такіх установак прыродныя багацці краіны трымаліся пад спудам або варварскі разбазарваліся. Драмала творчая думка. Лічылася за лепшае нажываць барышы на бесчалавечнай эксплаатацыі працоўных мас.

Зусім іншае становішча мы маем зараз у Беларускай Совецкай Социялістычнай Рэспубліцы.

Няўхільнае правядзенне ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, велізарная дапамога, нястомныя клопаты нашай партыі і асабіста таварыша Сталіна (працяглыя апладысменты) забяспечылі індустрыяльнае развіццё нацыянальных рэспублік і абласцей, быстры рост іх эканомікі і культуры, нацыянальнай па форме і социялістычнай па зместу.

Беларусь з былой калоніі царскай Расіі, з краіны непраўных да-

рог, адсталасці, непісьменнасці, забітасці, страшэннага жабрацтва і бяспраўя, з краіны, дзе голад, кашмарныя эпідэміі—калтун, трахома і інш. хваробы—былі спадарожнікамі працоўных, -за годы совецкай улады, пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў, пад асабістым і непасрэдным кіраўніцтвам таварыша Сталіна (працяглыя апладысменты), пры брацкай дапамозе рускага рабочага класа і працоўных усяго Совецкага Саюза, у барацьбе з ворагамі народа,—ператварылася ў Беларускую Совецкую Соцыялістычную Рэспубліку, у індустрыяльна-калгасную квітнеючую ордэнаносную рэспубліку. (Апладысменты). Няма неабходнасці прыводзіць мноства прыкладаў і цыфр для ілюстрацыі гэтага становішча. Дастаткова указаць толькі некаторыя з іх.

Асноўныя фонды прамысловасці за дзве сталінскія пяцігодкі павялічыліся больш чым у 9 раз. У 1938 г. удзельная вага прамысловай прадукцыі ўзрасла да 79,6 процанта. За 9 месяцаў 1939 года прадукцыя ўсіх прамысловых наркаматаў павялічылася ў параўнанні з тым-жа перыядам мінулага года на 8,7 процанта.

Здабыча торфу супроць дарэволюцыйнай павялічылася у 180 раз, выпрацоўка электраэнергіі—у 100 раз супроць 1913 года. Такія наркаматы як Наркамлегпром, Наркамхарчпром, Наркаммясцпром БССР датэрмінова выканалі 10-месячную праграму 1939 года. Рост прадукцыйнасці працы ў прамысловасці БССР за годы двух сталінскіх пяцігодак складае 65 проц. Вельмі важна адзначыць, што прырост прамысловай прадукцыі ў другой пяцігодцы пакрываўся на ³/₄ за кошт павелічэння прадукцыйнасці працы і толькі на ¹/₄ за кошт колькаснасці рабочай сілы.

Сельская гаспадарка дарэволюцыйнай Беларусі была надзвычай адсталай. Выпустошаныя, няўгнойваемыя палоскі зямлі давалі нізкі ўраджаі. Прымітыўнай сахою не мог пракарміцца тружанік. Недаяданне было звычайнаю з'явай у беларускай вёсцы. Усе лепшыя землі знаходзіліся ў памешчыкаў: 64,8 процанта ўсіх зямель належала ім і толькі 35,2 процанта належала сялянам, прычым 12 процантаў кулацкіх гаспадарак трымалі ў сваіх руках 38 процантаў усёй зямлі сялянскага ўладання. Голад і холад гналі сотні тысяч тружанікаў на пошукі лепшага жыцця.

Такі бязрадасны малюнак прадстаўляла сабой беларуская дарэволюцыйная вёска.

Многа песень, легенд і паданняў склаў беларускі народ аб годах цяжкіх пакут. У людзей вякамі расла мара «аб залатой волі, аб шчаслівай долі». І гэтая мара збылася. Шчаслівае, заможнае і культурнае жыццё беларускія сяляне набылі пры совецкай уладзе, дзякуючы калгаснаму ладу. Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя дала беларускаму сялянству ў працоўнае карыстанне звыш 8 мільёнаў гектараў зямлі. У выніку ажыццяўлення 2-га пяцігадовага плана сельская гаспадарка БССР, як і ўсяго Совецкага Саюза, прадстаўляе сабой буйную механізаваную соцыялістычную гаспадарку ў выглядзе соўгасаў, МТС і калгасаў.

К сучаснаму моманту ў БССР 91 процант сялянскіх гаспадарак аб'яднаны ў калгасы, якія займаюць 97 процантаў пасеўнай плошчы.

Удзельная вага механізаванай цягавай сілы ў агульным балансе цягла ў калгасах дасягнула 47,2 проц. Пасеўныя плошчы БССР на канец другой пяцігодкі ўзраслі ў параўнанні з 1913 г. на 37,1 проц.

Змянілася і сама структура пасеўных плошчаў. Пасеўныя плошчы ільну ў 1913 г. складалі 71,8 тысячы гектара, у 1938 г.—210,3 тысячы гектара. Совецкая Беларусь па ўдзельнай вазе пасеву бульбы ва ўсей пасеўнай плошчы вышла на першае месца ў Саюзе. Беларуская рэспубліка займае першае месца ў Совецкім Саюзе па вытворчасці насення і прымяненню на зялёнае ўгнаенне лубіну і сарадэлы. БССР вышла ў лік асноўных раёнаў па таварнаму плодаводству.

Аб росце заможнасці і культуры калгаснай вёскі гавораць такія факты: калгасы БССР у 1938 г. набылі ў спажывецкай кааперацыі 1500 грузавых аўтамашын; у гэтым-жа годзе калгаснікі і сельская інтэлігенцыя купілі 5.500 патэфонаў, 130 піяніно, 6.300 веласіпедаў, 115 матацыклаў, 5.000 швейных машын.

Выраслі новыя калгасныя кадры. За апошні час падрыхтавана звыш 23 тысяч трактарыстаў, 2.000 машыністаў малатарань, 1.200 камбайнераў, 1.400 трактарных механікаў, 13.000 паляводаў, дзесяткі тысяч вадзіцеляў машын.

З ростам матэрыяльнага дабрабыту працоўных мас пышным цветам расцвіла культура беларускага народа, нацыянальная па форме і соцыялістычная па зместу.

З года ў год дзяржава павялічвае водпуск сродкаў на соцыяльна-культурныя мерапрыемствы. Царскі ўрад расходаваў на народную асвету ў 1913 г. па ўсёй Расіі, у тым ліку і ў Беларусі, 60 капеек на кожнага чалавека. У сучасны момант Совецкі ўрад траціць на народную асвету ў 200 раз больш сродкаў, чым траціў царскі ўрад у 1913 г. У 1939 г. на народную асвету было асігнавана 608 670 тысяч рублёў, або ў 63 разы больш, чым было выдаткавана ў 1924—25 вучэбным годзе.

К канцу другой пяцігодкі кантынгенты навучаючыхся ў школах Беларусі ўзраслі да 1015,8 тысячы чалавек (разам з школамі ПКШЗ), што складае 384,1 проц. у адносінах да 1914—15 г.

Але справа не толькі ў адным колькасным росце школ. Вельмі важнымі з'яўляюцца глыбокія якасныя зрухі, што адбыліся ў развіцці народнай асветы за годы другой пяцігодкі. Гэтыя зрухі ідуць па лініі бурнага росту сярэдняй асветы, што ў сваю чаргу азначае ўздым культуры беларускага народа.

Наколькі вялік быў размах росту сярэдняй школы ў БССР за годы другой пяцігодкі, можна бачыць з наступных даных: у 1932—33 г. у БССР было 30 поўных сярэдніх школ, у якіх навучалася 23,1 тысячы чалавек, у 1937—38 вучэбным годзе колькасць поўных сярэдніх школ узрасла да 409.

У 8—10 класах у 1932—33 г. навучалася 700 чал., а ў 1937—38 г. у гэтых класах было ўжо 35,2 тысячы чалавек—рост у 50,3 раза.

За годы сталінскіх пяцігодак у Совецкай Беларусі пабудавана 565 новых сталінскіх, светлых, прасторных школ. 40 тысяч совецкіх настаўнікаў выхоўваюць у комуністычным духу выдатную дзетвару нашай рэспублікі.

За годы другой пяцігодкі значна змяніўся кваліфікаваны састаў рабочых і служачых, а таксама змяніўся па ўзроўню асветы састаў кіруючых кадраў. Значна ўзрасла насычанасць народнай гаспадаркі спецыялістамі. На 1-е студзеня 1939 г. у БССР ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі налічвалася звыш 13.000 спецыялістаў з вышэйшай асветай: інжынераў, аграномаў, педагогаў, урачоў, эканамістаў і т. д.

Асабліва выраслі кадры педагогаў і ўрачоў. У 1932 г. на 100 тысяч насельніцтва прыходзілася 32 урачы і 415 настаўнікаў, на пачатак 1939 г. на 100 тысяч насельніцтва прыходзілася 47 урачоў і 604 настаўнікі.

Вырасла тэатральная культура беларускага народа. Мы маем 12 тэатраў, філармонію, дзяржаўную кансерваторыю. Пышным цветам расцвіла народная мастацкая самадзейнасць.

Усіх гэтых поспехаў беларускі народ дабіўся пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі большэвікоў і яе ленінска-сталінскага ЦК. **(Працяглыя апладысменты).**

За шчасце і радасць, за цудоўнае, заможнае і культурнае жыццё беларускі народ дзякуе вялікую комуністычную партыю большэвікоў, асабіста таварыша Сталіна. **(Усе ўстаюць. Воклічы «ура». Бурныя, доўга незмаўкаючыя апладысменты. Воклічы: «Вялікаму маршалу комунізма таварышу Сталіну ўра!»).**

Прайшло ўсяго толькі каля двух месяцаў з таго часу, як Чырвоная Армія зламіла штучна створаныя бар'еры, насільна раздзяляўшыя беларускі народ. На землях Заходняй Беларусі няма больш нераўнапраўя нацыянальнасцей, вярней бяспраўя нацыянальнасцей, якое існавала ў панскай Польшчы. Чырвоная Армія вызваліла народы ад жахаў вайны, якую абрушылі на голаву народаў бяздарныя і труслівыя драпежнікі, складаўшыя былы польскі ўрад. Насельніцтва Заходняй Беларусі ўпершыню за гэты кароткі тэрмін перажывае радасць сапраўднай свабоды—свабоды друку, свабоды сходаў, свабоды грамадскіх арганізацый.

Адкрываюцца школы, дзе выкладанне вядзецца на роднай беларускай мове.

Ужо выпушчана з друку і накіравана для школ Заходняй Беларусі 150 тысяч экземпляраў беларускай граматыкі і 200 тысяч буквароў. Арганізуецца сетка школ па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці. Для падрыхтоўкі настаўнікаў намечана адкрыць 3 настаўніцкія інстытуты.

Праводзіцца вялікая работа па стварэнню гандлёвай сеці. Ужо ва многіх месцах Заходняй Беларусі адкрыты кааперативы, у якіх насельніцтва купляе хлеб, соль, запалкі і інш. тавары.

Радасныя песні спяваюць вёскі і гарады Заходняй Беларусі, навекі знікла з іх твару пячатка забітасці, страху, бездапаможнасці. Людзі выпрасталі спіны, горда ўзнялі галаву, адчулі сябе сапраўды свабоднымі.

Ніколі яшчэ гарады і вёскі Заходняй Беларусі не бачылі такіх многалюдных сходаў, не чулі такіх свабодных прамоў, не бачылі столькі радасных твараў, не чулі столькі гучных, бадзёрых рэволюцыйных песень.

Упершыню жанчына адчула сябе роўнапраўнай удзельніцай вялікай грамадскай справы. Народы Заходняй Беларусі ўпершыню на аснове самага дэмакратычнага ў свеце выбарчага закона правялі выбары дэпутатаў у Народнае Сабранне.

Народ Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі,—каму інтарэсы, перажыванні, пачуцці працоўных Заходняй Беларусі асабліва блізкі,—сустрэў рашэнне Унечарговай Пятай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР аб уключэнні Заходняй Беларусі ў састаў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік са з'яднаннем яе з Беларускай

Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай, як радаснае свята, як гаржаство ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Жывучы звыш 2-х дзесяткаў год на рубяжы з панскай Польшчай, народ Совецкай Беларусі з жалем наглядаў, як згорбленыя, абарваныя сяляне позняй восенню збіралі мерзлую бульбу, з болем у сэрцы наглядаў беспрасветнае, гаротнае жыццё сваіх зарубежных братоў па класу.

Я шчаслiву заявiць з высокай трыбуны Вярхоўнага Совета БССР ад імені працоўных Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, што мы усе, як адзін, рады прыняць працоўных Заходняй Беларусі, як любімых доўгачаканых братоў, у састаў Беларускай ССР. **(Бурныя, доўга незмаўкаючыя апладысменты, пераходзячыя ў авацыю).**

Таварышы! Ад гэтага часу народ, які сілай быў адарваны ад радзімы, ад сваіх адзінакроўных братоў, назаўсёды аднаўляе брацкае супрацоўніцтва з народамі Совецкага Саюза і з народам Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі. **(Бурныя апладысменты).**

Ніколі больш не ступіць нага прыгнятальніка і эксплаатататара польскага памешчыка—на адваяваную кроўю народа зямлю Заходняй Беларусі. **(Бурныя апладысменты).**

Таварышы працоўныя Заходняй Беларусі!

Сення вы уступаеце ў сям'ю народа Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, якая пад сцягам Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна пераможна ідзе па шляху будаўніцтва комунізма. **(Апладысменты).**

Цяпер Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка па займаемай тэрыторыі стала значна большай, чым такія дзяржавы, як Данія, Бельгія, Швейцарыя, Галандыя, разам узятыя. Насельніцтва БССР павялічылася з 6 да 11 мільёнаў, гэта значна больш, чым у кожнай такой дзяржаве, як Нарвегія, Фінляндыя, Грэцыя, Венгрыя, Балгарыя і Партугалія.

Працоўныя Заходняй Беларусі пры брацкай дапамозе народа Беларускай ССР і народаў усяго Совецкага Саюза большэвіцкімі тэмпамі будуць будаваць сваё заможнае і светлае жыццё, усямерна павышаючы рэволюцыйную пільнасць, змятаючы са свайго шляху ўсіх ворагаў працоўнага народа

На варце шчаслівага, мірнага творчага жыцця працоўных стаяць звеяныя славай палкі Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Яны ахоўваюць працу рабочых, сялян, інтэлігенцыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны гэтак сама, як і мірную працу ўсяго совецкага народа. **(Апладысменты).**

Аб'яднаны беларускі народ разам з усімі працоўнымі Совецкага Саюза пад кіраўніцтвам слаўнай комуністычнай партыі большэвікоў і любімага правадыра вялікага Сталіна у далейшым дабецца яшчэ больших перамог. **(Усе ўстаюць. Бурныя апладысменты. Воклічы: «Ура!»).**

Няхай жывуць вызваленыя народы Заходняй Беларусі! **(Бурныя апладысменты).**

Няхай жыве наша родная Чырвоная Армія і яе правадыр першы Маршал Совецкага Саюза таварыш Варашылаў. **(Бурныя апладысменты. Вокліч: «Ура!»).**



Няхай жыве Совецкі ўрад і яго глава таварыш Молатаў. **(Бурныя апладысменты. Вокліч: «Ура!»).**

Няхай жыве наша магутная партыя Леніна—Сталіна і яе Цэнтральны Камітэт! **(Бурныя апладысменты).**

Няхай жыве правадыр усяго прагрэсіўнага чалавецтва—бацька і друг, вялікі Сталін! **(Бурныя апладысменты. Воклічы: «Ура!», «Няхай жыве вялікі маршал пролетарскай рэволюцыі вялікі Сталін!», «Любімаму Сталіну ура!». Гром апладысментаў).**

Таварышы дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР!

Ад імені ўрада Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі я ўношу наступную прапанову:

Вярхоўны Совет Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, заслухаўшы заяву Поўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі, **пастанаўляе:**

1. Вітаць усямерна гістарычную пастанову Вярхоўнага Совета СССР ад 2 лістапада 1939 года аб уключэнні Заходняй Беларусі у састаў Совецкага Саюза. **(Бурныя апладысменты, пераходзячыя ў авацыю).**

2. Прыняць Заходнюю Беларусь у састаў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі і з'яднаць тым самым вялікі беларускі народ у адзінай Беларускай дзяржаве. **(Доўга незмаўкаючыя апладысменты. Крыкі «Ура!»).**

3. Даручыць Прэзідыуму Вярхоўнага Совета назначыць дзень выбараў дэпутатаў у Вярхоўны Совет БССР ад Заходняй Беларусі. **(Апладысменты).**

4. Даручыць Прэзідыуму Вярхоўнага Совета БССР вызначыць адміністрацыйнае дзяленне абласцей і раёнаў Заходняй Беларусі і, у адпаведнасці з п. «б». арт. 19 Канстытуцыі БССР, прадставіць на зацверджанне Вярхоўнага Совета СССР праект аб стварэнні новых абласцей і праект размежавання раёнаў і абласцей паміж Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай і Украінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай. **(Бурныя апладысменты, пераходзячыя ў доўгую авацыю).**

ЗАКОН

аб прыняцці Заходняй Беларусі ў састаў Беларускай Савецкай Соцыялістычнай Рэспублікі

Вярхоўны Совет Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, заслухаўшы заяву Поўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі, **пастанаўляе:**

1. Вітаць усямерна гістарычную пастанову Вярхоўнага Совета СССР ад 2-га лістапада 1939 года аб уключэнні Заходняй Беларусі ў састаў Совецкага Саюза.

2. Прыняць Заходнюю Беларусь у састаў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі і ўз'яднаць тым самым вялікі беларускі народ у адзінай беларускай дзяржаве.

3. Даручыць прэзідыуму Вярхоўнага Совета назначыць дзень выбараў дэпутатаў у Вярхоўны Совет БССР ад Заходняй Беларусі.

4. Даручыць Прэзідыуму Вярхоўнага Совета БССР вызначыць адміністрацыйнае дзяленне абласцей і раёнаў Заходняй Беларусі і, у адпаведнасці з пунктам «б» артыкула 19 Канстытуцыі БССР, прадставіць на зацверджанне Вярхоўнага Совета СССР праект аб утварэнні новых абласцей і праект размежавання раёнаў і абласцей паміж Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай і Украінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Н. НАТАЛЕВІЧ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Л. ПАПКОЎ.

14 лістапада 1939 г.
г. Мінск.



Пад вялікім сцягам Сталінскай Канстытуцыі

5-га снежня совецкі народ у трэці раз адзначау гістарычную дату ў жыцці сваей краіны — дзень прыняцця Сталінскай Канстытуцыі.

Тры годы назад, 25 лістапада 1936 года, у Маскве адкрыўся Надзвычайны VIII з'езд Советаў, скліканы для абмеркавання і прыняцця праекта новай Канстытуцыі Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Да прыняцця Канстытуцыі Надзвычайным з'ездам Советаў, прыкладна за пяць з лішнім месяцаў, на прэзідыуме ЦВК СССР быў заслуханы даклад Старшыні Канстытуцыйнай Камісіі таварыша Сталіна. Прэзідыум адобрыў прадстаўлены на зацверджанне праект Канстытуцыі Саюза ССР і пастанавіў апублікаваць яго для ўсенароднага абмеркавання.

Народы Совецкага Саюза з вялікай радасцю і захапленнем віталі праект новай Канстытуцыі СССР — самай дэмакратычнай у свеце, творцам якой з'яўляецца вялікі правадыр народаў таварыш Сталін.

Усенароднае абмеркаванне праекта новай Канстытуцыі выклікала небывалы рост палітычнай актыўнасці працоўных і вылілася ў грандыёзную дэманстрацыю бязмежнай адданасці і любві да вялікай партыі большэвікоў, да таварыша Сталіна — арганізатара і натхніцеля сусветна-гістарычных перамог соцыялізма, творца новай Канстытуцыі. Яшчэ тады наш народ аднадушна назваў новую Канстытуцыю Сталінскай.

Працоўныя нашай краіны з нецярплівасцю чакалі дня 25 лістапада, калі з трыбуны з'езда па неабсяжных прасторах краіны Советаў павінны былі разнесціся словы вялікага генія чалавецтва. І гэты дзень настаў. На першым пасяджэнні Надзвычайнага VIII з'езда Советаў таварыш Сталін выступіў з дакладам аб праекце Канстытуцыі Саюза ССР.

З геніяльнай яснасцю і вычарпальнай поўнасцю таварыш Сталін падвёў вынікі дзевятнаццаці год існавання совецкай улады, даў класічны марксісцкі аналіз змяненням, што адбыліся ў жыцці СССР, раскрыў узаемную сувязь карэнных пераўтварэнняў у галіне эканомікі, класавой структуры і нацыянальных узаемаадносін у нашай краіне.

Непазнавальнай стала наша прамысловасць. Яна вырасла ў гіганцкую сілу і базіруецца на новай, удасканаленай тэхніцы з моцна развітай цяжкай індустрыяй і асабліва машынабудаўніцтвам.

> «Самае-ж галоўнае,—як адзначыў таварыш Сталін,—у тым што капіталізм выгнан зусім са сферы нашай прамысловасці, а соцыялістычная форма вытворчасці з'яўляецца цяпер безраздзельна пануючай сістэмай у галіне нашай прамысловасці»

Непазнавальнаю стала і наша сельская гаспадарка.

> «... Замест акіяна дробных аднаасобных сялянскіх гаспадарак з іх слабай тэхнікай і засіллем кулака мы маем цяпер самую буйную ў свеце машынізаваную, узброеную новай тэхнікай вытворчасць у выглядзе ўсеабдымнай сістэмы калгасаў і соўгасаў».

Савецкі народ не ведае, што такое эксплаатацыя, крызіс, беспрацоўе, галеча і разарэнне. Сацыялістычная сістэма гаспадаркі пазбавіла наш народ ад гэтага спадарожніка працоўных у капіталістычным грамадстве і дала ўсе магчымасці для заможнага і культурнага жыцця.

Разам са зменамі ў эканоміцы змянілася і класавая структура нашага грамадства. Ліквідаваны паразітычныя эксплаататарскія класы ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, таваразвароце. Савецкае грамадства складаецца цяпер з двух дружаственных класаў: з рабочага класа і класа сялян.

Рабочы клас нашай краіны зусім не падобны на рабочы клас капіталістычнага грамадства. Ён не пазбаўлен прылад і сродкаў вытворчасці, а валодае імі сумесна з усім народам, з'яўляючыся кіруючай сілай сацыялістычнай дзяржавы. Гэта—«зусім новы, вызвалены ад эксплаатацыі, рабочы клас, падобнага якому не ведала яшчэ гісторыя чалавецтва».

Наша калгаснае сялянства базіруе сваю работу, свой здабытак на калектыўнай працы, на сучаснай механізаванай тэхніцы. Няма больш памешчыкаў і кулакоў, якія-б маглі эксплаатаваць сялянства. Такім чынам і наша сялянства зусім новае, падобнага якому не ведала гісторыя чалавецтва.

Савецкая інтэлігенцыя таксама зусім новая—народная інтэлігенцыя. Яна выйшла з народа і кроўнымі узамі звязана з народам.

Перамога ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі у нашай краіне выклікала да жыцця мільёны раней прыгнечаных нацыянальнасцей. Савецкі Саюз—шматнацыянальная сацыялістычная дзяржава, аснаваная на роўнапраўі і дружбе народаў, «моцнасці якой магла-б пазайздросціць любая нацыянальная дзяржава ў любой частцы свету».

У выніку бліскучых перамог сацыялізма ў нашай краіне «мы маем цяпер зусім новую, сацыялістычную дзяржаву, нябачаную яшчэ ў гісторыі, дзяржаву, якая значна адрозніваецца па сваёй форме і функцыях ад сацыялістычнай дзяржавы першай фазы» (Сталін).

5 снежня 1936 года Надзвычайны VIII з'езд Советаў прыняў новую Канстытуцыю Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік — Асноўны Закон сацыялістычнай дзяржавы, выдатны дакумент сусветна-гістарычнага значэння.

Сталінская Канстытуцыя адкрыла новую эру ў гісторыі чалавецтва. На яе старонках залатымі літарамі запісаны вялікія правы і абавязкі грамадзян першай у свеце дзяржавы рабочых і сялян. Грамадзянам СССР гарантавана права на працу, права на адпачынак, на асвету, на матэрыяльнае забеспячэнне ў старасці. Жанчыны зраўнаваны ў правах з мужчынамі ва ўсіх галінах гаспадарчага, дзяржаўнага і грамадска-палітычнага жыцця. Узаконена роўнапраўе ўсіх грамадзян незалежна ад іх нацыянальнага і расавага паходжання.

У процілегласць буржуазным канстытуцыям, якія, фармальна прадастаўляючы правы ўсім грамадзянам, на сутнасці пазбаўляюць усякіх праў большую частку насельніцтва, а іменна працоўных,— Сталінская Канстытуцыя свабодна ад усіх і ўсякіх абмежаванняў дэмакратычных праў грамадзян; паслядоўны, да канца вытрыманы дэмакратызм—адна з яе асаблівасцей.

Сталінская Канстытуцыя сведчыць усяму свету, што ў СССР ужо ажыццёўлена тое, аб чым марылі і працягваюць марыць мільёны чэсных людзей у капіталістычных краінах. Яна гаворыць усім прыгнечаным і эксплаатуемым народам свету аб тым, «што тое, што ажыццёўлена ў СССР, цалкам можа быць ажыццёўлена і ў іншых краінах».

Указваючы на значэнне новай Канстытуцыі для народаў Совецкага Саюза, таварыш Сталін сказаў:

> «Калі для народаў капіталістычных краін Канстытуцыя СССР будзе мець значэнне праграмы дзеянняў, то для народаў СССР яна мае значэнне выніку іх барацьбы, выніку іх перамог на фронце вызвалення чалавецтва. У рэзультаце пройдзенага шляху барацьбы і лішэнняў прыемна і радасна мець сваю Канстытуцыю, якая трактуе аб пладах нашых перамог. Прыемна і радасна ведаць, за што біліся нашы людзі і як яны дабіліся сусветна-гістарычнай перамогі. Прыемна і радасна ведаць, што кроў, багата пралітая нашымі людзьмі, не прайшла дарэмна, што яна дала свае рэзультаты. Гэта ўзбройвае духоўна наш рабочы клас, наша сялянства, нашу працоўную інтэлігенцыю. Гэта рухае наперад і ўзнімае пачуццё законнай гордасці. Гэта ўмацоўвае веру ў свае сілы і мабілізуе на новую барацьбу для заваявання новых перамог комунізма».

Дзень прыняцця Канстытуцыі—5 снежня—наша краіна адзначае штогод як усенароднае свята. Надзвычайны, VIII з'езд Советаў у сваёй пастанове запісаў:

> «У азнаменаванне прыняцця новай Канстытуцыі Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік абвясціць дзень прыняцця Канстытуцыі—5-ае снежня—усенародным святам».

За тры годы жыцця і працы пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі нязмерна вырасла і ўмацавалася маральна-палітычнае адзінства совецкага народа ў барацьбе за новыя перамогі на фронтах палітычнага, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

З кожным годам усё ярчэй расцвітае наша радаснае жыццё, усё больш атрымлівае перамог совецкі народ у сваёй многаграннай дзейнасці. 1939 год быў годам далейшага росту магутнасці, культуры, заможнасці народа, уздыму прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

Узніклі новыя формы стаханаўскай працы—пераход на многастаночнае абслугоўванне, сумяшчэнне прафесій, асваенне жанчынамі «мужчынскіх» прафесій у чыгуналіцейнай прамысловасці і т. д. Патрыятычны ўздым мас на будаўніцтве Ферганскага канала сведчыць аб росце комуністычнай свядомасці ў шырокіх слаях калгаснага сялянства.

Вырасла брацкая сям'я народаў Совецкага Саюза. Вызваленыя народы Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны аб'ядналіся са сваёй радзімай краінай Советаў. 13 мільёнаў новых грамадзян СССР, якія ўчора яшчэ стагналі ў «турме народаў» пад гнётам польскіх памешчы-

каў і капіталістаў, у царстве беспрацоўя і галечы, нацыянальнай варожасці і палітычнага бяспраўя, назаўсёды звязалі свой лёс з соцыялізмам і пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі будуюць новае жыццё.

Велізарныя зрухі ва ўнутраным жыцці Совецкага Саюза адлюстраваліся і на міжнародным становішчы. Заключэнне дагавораў аб узаемадапамозе паміж СССР, Эстоніяй, Латвіяй і Літвой, устанаўленне дружаственных адносін з Германіяй, распад былой польскай дзяржавы і аказанне дапамогі сваім аднакроўным братам беларусам і украінцам, паслядоўная барацьба за мір—усё гэта ўзняло міжнародны прэстыж Совецкага Саюза на небывалую вышыню. Уплыў СССР у міжнародных справах узрастае з кожным днём.

Умацаванне ваеннай магутнасці нашай краіны наглядна паказвае усяму свету, што Совецкі Саюз, праводзячы палітыку міру, нястомна клапоціцца аб ахове сваіх дзяржаўных граніц. Няхай ведаюць падпальшчыкі вайны, што совецкі народ беражэ сваю свабодную зямлю, як зяніцу вока, што яе ахоўвае доблесная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія, за якою стаіць многамільённы совецкі народ.

З глыбокім абурэннем сустрэў совецкі народ паведамленне аб правакацыях фінскайваеншчыны. Хваля гневу пракацілася па ўсей краіне. На многалюдных мітынгах рабочыя, сяляне, інтэлігенцыя—усе працоўныя нашай краіны ў сваіх рэзалюцыях прасілі совецкі ўрад даць рашучы адпор правакацыйным вылазкам падпальшчыкаў вайны.

Выконваючы волю многамільённага совецкага народа, глава совецкага ўрада таварыш В. М. Молатаў 30 лістапада г. г. выступіў па радыё з прамовай, у якой даў ясную ацэнку паводзін правячых кругоў Фінляндскай плутакратыі. Было зроблена апошняе папярэджанне зарваўшымся фінляндскім кіраўнікам. Аднак, на прапанову тав. Молатава фінскія мракабесы ўзмацнілі правакацыйныя дзеянні на совецка-фінскай граніцы. Нашаму цярпенню прыйшоў канец. Галоўнае камандаванне Чырвонай Арміі аддало загад войскам Ленінградскай ваеннай акругі перайсці граніцу Фінляндыі, каб дапамагчы фінляндскаму працоўнаму народу сцерці з твару зямлі правакатараў—ненавісных каяндраў, эркаў, танераў, манергеймаў і ім падобных і ўстанавіць мір і дружбу з Совецкім Саюзам.

Як толькі часці Чырвонай Арміі пераступілі фінскую граніцу, фінскі народ узняўся на звяржэнне тыраніі катаў і правакатараў. Новаствораны Народны Урад Фінляндскай дэмакратычнай рэспублікі ўзначаліў барацьбу фінляндскага народа і заклікаў яго сумеснымі намаганнямі з Чырвонай Арміяй знішчаць крыважэрных катаў, ненавісных усяму народу. Плутакратычны ўрад Каяндра, Эрко, Танера, сарваўшы мірныя перагаворы з Совецкім Саюзам, накіраваныя на забеспячэнне ў супрацоўніцтве з Фінляндыяй трывалага міру на Балтыцы і ва ўсей Усходняй Еўропе, уверг краіну ў бессэнсоўную вайну. Толькі новы Народны ўрад, апіраючыся на падтрымку шырокіх мас, здолее забяспечыць фінскаму народу трывалы мір і незалежнасць краіны. Падпісаны 2 снежня ў Маскве дагавор аб узаемадапамозе і дружбе паміж Совецкім Саюзам і Фінляндскай Дэмакратычнай Рэспублікай кладзе пачатак дружаственным узаемаадносінам паміж абодвума дзяржавамі. Дзякуючы гэтаму дагавору, Фінляндыя перастала быць той краінай, якая служыла імперыялізму для арганізацыі контррэволюцыйнай вайны супроць СССР.

Совецка-фінляндскі дагавор устанаўляе трывалы мір ва Усходняй і Паўночна-Усходняй Еўропе, пазбаўляе правакатараў вайны магчымасці зрабіць Фінляндыю плацдармам для нападу на СССР і ў першую чаргу на Ленінград. Дружба совецкага і фінляндскага народа, умацаваная пактам аб узаемадапамозе і дружбе, будзе няўхільна расці і ўмацоўвацца.

Трэцяя гадавіна Сталінскай Канстытуцыі супадае з пачаткам выбарчай кампаніі ў мясцовыя советы дэпутатаў працоўных. Уся краіна рыхтуецца дастойна сустрэць і правесці выбары, якія завяршаюць перабудову ўсіх органаў дзяржаўнай улады Совецкага Саюза ў [illegible] паведнасці з вялікімі прынцыпамі Сталінскай Канстытуцыі.

Значэнне гэтай самай буйнай палітычнай кампаніі велізарна. Звыш 1 мільёна 300 тысяч дэпутатаў будуць выбраны ў мясцовыя Советы. Да кіраўніцтва дзяржавай прыдуць мільёны новых людзей. Час, які [illegible] застаўся да выбараў, неабходна скарыстаць для поўнага вы[illegible]ння ўсіх арганізацыйных мерапрыемстваў, для яшчэ шырэйшага разгортвання масава-растлумачальнай работы.

Няма сумнення, што выбары ў мясцовыя советы дэпутатаў пра[illegible]ых яшчэ раз прадэманструюць усяму свету маральна-палітычнае [illegible]дзінства совецкага народа, будуць новым грозным папярэджаннем [illegible]ым імперыялістычным драпежнікам, якія правацыруюць вайну супроць вялі[illegible]й краіны Советаў

Настойна авалодваць марксісцка-ленінскай тэорыяй

14 лістапада 1938 года была апублікавана гістарычная пастанова ЦК ВКП(б) «Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выпускам «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Разам з «Кароткім курсам гісторыі ВКП(б)», [illegible] яго часткі, [illegible] пава-роту нашых кіруючых кадраў і ўсёй савецкай інтэлігенцыі да ліквідацыі сваёй тэарэтычнай адсталасці, паклала пачатак новаму магутнаму ідэйна-палітычнаму ўздыму ў жыцці нашай партыі і ўсяго савецкага народа.

Для ўсёй нашай партыі, вялікай партыі Леніна—Сталіна, гэты дакумент з'явіўся разгорнутай праграмай перабудовы прапагандысцкай работы, ідэйнага ўзбраення рэвалюцыйнай тэорыяй марксізма-ленінізма партыйных [illegible] кіруючых кадраў. Мільёны савецкіх людзей пераканаліся ў тым, што пры самастойным вывучэнні яны могуць паспяхова авалодваць асновамі марксісцка-ленінскай тэорыі.

Пастанова ЦК ВКП(б) асудзіла саматужніцтва і неарганізаванасць у галіне прапаганды і ўказала, што асноўнай формай вывучэння марксізма-ленінізма павінна стаць палітычная самаадукацыя, самастойная работа над кнігай. Гэтыя ўказанні Цэнтральнага Камітэта нашай партыі цалкам і поўнасцю апраўданы практыкай, пацверджаны самім жыццём. Яны паклалі пачатак нябачанаму ідэйна-палітычнаму росту кіруючых кадраў нашай краіны і забяспечваюць далейшае павышэнне [illegible] партыйных [illegible] бальшавікоў.

За мінуўшы год нашы прапагандысцкія кадры правялі вялікую [illegible] работу па [illegible] сталін[illegible] [illegible] гісторыі, [illegible] справядлівых [illegible] справядлівых, аб ролі [illegible] Палажаны канец той антымарксісцкай блытаніне, якая мела месца па гэтых пытаннях.

Пастанова Цэнтральнага Камітэта нашай партыі аб прапагандзе не [illegible] «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», [illegible] заключаецца ў тым, што гісторыя партыі выкладаецца на [illegible] разгортвання асноўных ідэй марксізма-ленінізма, а марксісцка-ленінскае вучэнне даецца на аснове гістарычных фактаў.

«Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» з'яўляецца выдатным навукова-тэарэтычным творам, новым каштоўным укладам у ідэйную скарбніцу марксісцка-ленінскай тэорыі і яе далейшым бліскучым развіццём

Над стварэннем гэтай кнігі працавала аўтарытэтнейшая рэдакцыйная камісія ЦК ВКП(б) і, што асабліва важна, асабіста таварыш Сталін, які выканаў галоўную тэарэтычную работу. Ва ўсім змесце кнігі мы бачым сталінскую мудрасць, сталінскі баявы дух, сталінскі стыль.

Таварышом Сталіным поўнасцю напісаны важнейшыя раздзелы кнігі, як напрыклад, «Аб дыялектычным і гістарычным матэрыялізме», дзе даецца неперазўзыйдзеная па глыбіні, чоткасці і яснасці характарыстыка дыялектычнага матэрыялізма і выкладаюцца асновы марксісцка-ленінскай тэорыі, сіла якой у тым, што «яна дае партыі магчымасць арыентавацца ў абстаноўцы, зразумець унутраную сувязь акружаючых падзей, прадбачыць ход падзей і распазнаць не толькі тое, як і куды развіваюцца падзеі ў сучасным, але і тое, як і куды яны павінны развівацца ў будучым»*).

Толькі сталінскі ЦК ВКП(б), які ўвасобіў увесь вопыт большэвіцкай партыі, увесь вопыт дыктатуры рабочага класа, усю мудрасць нашага века, мог стварыць такую сапраўды навуковую работу, у якой з такой чоткасцю і яснасцю раскрыты законы грамадскага развіцця, паказана слаўная гісторыя большэвіцкай партыі.

«Кароткі курс гісторыі ВКП(б)»—гэта адзінае кіраўніцтва па гісторыі партыі, якое прадстаўляе сабою пункт погляду ЦК ВКП(б), пункт погляду большэвізма па ўсіх важнейшых пытаннях гісторыі партыі і партыйнай тэорыі. Ён узброіў нас супроць спрашчэнцтва і вульгарызацыі, пакончыў з сваявольствам і блытанінай у тлумачэнні такіх важнейшых пытанняў, як пытанне аб перарастанні буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў сацыялістычную, аб ленінска-сталінскай тэорыі магчымасці перамогі сацыялізма ў адной асобна ўзятай краіне, аб советах і т. д.

У «Кароткім курсе гісторыі ВКП(б)» пакладзен канец шкоднаму, штучнаму разрыву паміж марксізмам і ленінізмам, што мела месца ў галіне прапаганды. Дыялектычны і гістарычны матэрыялізм звязаны з палітыкай партыі, паказана неразрыўнае адзінства, пераемнасць і цэласнасць вучэння Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна, адзінства марксізма-ленінізма. У ім знаходзім мы тое новае, што ўнесена велізарнейшымі геніямі чалавецтва *Леніным* і *Сталіным* у марксісцкую тэорыю на аснове абагульнення новага вопыту класавай барацьбы пралетарыята ў эпоху імперыялізма і пралетарскіх рэвалюцый, у эпоху перамогі сацыялізма на адной шостай зямнога шара.

Гісторыя ВКП(б) расказвае аб перамогах вялікай партыі Леніна—Сталіна ў нястомнай барацьбе з апартуністамі ўсіх масцей, з лютымі ворагамі народа—іудушкамі-троцкімі, зіноўевымі, бухарынымі.

Гэта кніга вучыць кожнага з нас тактыцы і стратэгіі большэвіцкай партыі, асвятляе шлях да шчаслівага жыцця працоўным усяго свету, на жывых гістарычных прыкладах паказвае, што вучэнне Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна не догма, а кіраўніцтва к дзеянню.

Баявыя старонкі гісторыі ВКП(б), дзе сказана аб тым, як зара дзілася наша партыя, як складаліся, раслі і мацнелі яе арганізацыйныя прынцыпы, дапамагаюць выхоўваць членаў партыі ў духу большэвіцкай партыйнасці, святой ідэйнасці, непрымірымасці і бязлітаснасці да ворагаў сацыялізма.

Сталінскі курс гісторыі ВКП(б) выхоўвае нашы кадры на ўсепера-

*) [1] „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)", стар. 33[illegible].

магаючых ідэях марксізма-ленінізма. Ён узбройвае не толькі веданнем баявога мінулага нашай большэвіцкай партыі, але і веданнем законаў грамадскага развіцця, законаў пабудовы комуністычнага грамадства. Ён дапамагае правільна арыентавацца ў абстаноўцы цяперашняга дня, паказвае, як і куды трэба ісці заўтра.

*

Год работы па-новаму, на аснове гістарычнай пастановы ЦК ВКП(б) аб партыйнай прапагандзе з'явіўся для нашай беларускай партыйнай арганізацыі, як і для ўсёй партыі, годам велізарнага ўздыму ўсёй ідэйна-палітычнай работы. За вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» узяліся мільёны людзей. Гэта кніга стала ў народзе самай папулярнай, самай любімай, самай каштоўнай. Пераважная большасць нашых кадраў, партыйных і непартыйных большэвікоў, прачытаўшы выдатнае сталінскае тварэнне, пачала вывучаць рэволюцыйную тэорыю ў першакрыніцах — па творах Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна.

Аб небывалым размаху марксісцка-ленінскай прапаганды сведчыць і гэты факт, што за адзін толькі год «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» выдан у СССР на 11-ці мовах у колькасці 15.020.900 экземпляраў, у тым ліку на беларускай мове — у 150 тысячах экземпляраў. Акрамя таго, тэкст «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» друкаваўся ў журналах, тыраж якіх складаў больш 2 млн. экземпляраў, і ў газетах, тыраж якіх перавысіў 6,5 млн. экземпляраў. І ўсё-ж патрэбнасць у гэтай кнізе поўнасцю яшчэ не задаволена. Толькі па адной нашай рэспубліцы «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» разышоўся ў колькасці звыш 400 тысяч экземпляраў. Працоўныя БССР набылі 293 тыс. кніг з творамі класікаў марксізма-ленінізма.

Нашы кадры партыйных і непартыйных большэвікоў смела ўзяліся за самастойную тэарэтычную вучобу. А ціпата патрэба ў рабоце вялікай колькасці гурткоў. Калі да пастановы ЦК ВКП(б) ад 14 лістапада 1938 года ў нашай рэспубліцы было 2.336 гурткоў партыйнай асветы, то цяпер іх толькі 278. У Бабруйску самастойна вывучаюць гісторыю партыі больш 8 тысяч чалавек, сярод якіх 1.500 членаў і кандыдатаў партыі, каля 5 тысяч комсамольцаў і беспартыйная інтэлігенцыя горада. У Барысаўскім сельскім раёне над вывучэннем гісторыі партыі працуе звыш 600 чалавек.

Многія комуністы Бабруйскай партарганізацыі ўжо закончылі вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» і цяпер паглыбляюць свае веды, працуючы над творамі класікаў марксізма-ленінізма. Комуністы Гучын, Шэрман, Вараненка, Кацнельсон, Пракопчык, Рамашэўскі, Гінзбург, Рутман і многія таварышы акрамя «Кароткага курса» вывучылі работы Леніна «Развіццё капіталізма ў Расіі», «Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваююць супроць соцыял-дэмакратаў», а таксама ленінскую кнігу «Што рабіць?».

Упарта і настойліва працуюць над павышэннем свайго тэарэтычнага ўзроўню комуністы Асіповіцкага раёна тт. Шыпак — дырэктар лесгаса, Захаронак — агроном раёна, Каношка — дырэктар МТС. Вось што расказвае тав. Каношка: «Я працую сур'ёзна над «Кароткім курсам» і кожны дзень адчуваю, як многа гэта мне дае. Я палітычна вырас і разам з тым мне куды лягчэй стала працаваць, вырашаць пытанні практычнай работы. Я адчуў густ да вывучэння гісторыі

партыі і цяпер ужо мяне ад гэтага не адарвеш. Побач з вывучэннем «Кароткага курса» я прачытаў за гэты год творы В. І. Леніна «Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваююць супроць сацыял-дэмакратаў», «Крок уперад, два крокі назад», артыкул Уладзіміра Ільіча аб рэвалюцыі 1905 года і яго класічную работу «Імперыялізм як вышэйшая стадыя капіталізма». Зараз прыступіў да вывучэння пасля-кастрычніцкага перыяда жыцця нашай партыі».

Паспяхова працуюць над авалоданнем марксісцка-ленінскай тэорыі камуністы Жлобінскай партарганізацыі тав. Канстанцінаў — старшыня калгаса «Праўда», тав. Жукаў—старшыня Пірэвіцкага сельсовета.

Вывучэнне «Кароткага курса» пашырае светапогляд, спрыяе ўключэнню ўсё новых людзей у актыўную грамадскую работу. Вельмі многія таварышы становяцца добрымі агітатарамі, прапагандыстамі. Так, камуністка-ткачыха агітатар т. Эльман з Мінскага раёна вылучана на кіруючую работу ў райвыканком. Не малых поспехаў дабіўся тав. Загарулька—рабочы стругальшчык мінскага вагавага завода «Ударнік». Ён ужо вывучыў дзевяць раздзелаў «Кароткага курса» і паралельна працуе над паасобнымі творамі Леніна і Сталіна, прапагандысцкімі артыкуламі з газет і журналаў, наведвае лекцыі. «Самастойнае вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)»,—піша тав. Загарулька,—узняло маю свядомасць і палітычную падрыхтоўку. Цяпер мне даручана работа агітатара ў цэху. Узраслі і мае вытворчыя паказчыкі. Я [illegible] нормы на 150 процантаў».

У радах партыйнай і непартыйнай інтэлігенцыі Беларусі нямала людзей, якія, закончыўшы вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», [illegible] Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна. Тав. Расінскі—настаўнік з Любаньскага раёна, тав. Шыёнак дырэктар [illegible] школы [illegible] раёна, тав. Корж урач з Жлобінскага раёна і многія іншыя прадстаўнікі нашай інтэлігенцыі глыбока і сур'ёзна авалодваюць большэвізмам.

Нашы кадры глыбока засвоілі тую сталінскую ісціну, што майстэрства [illegible] марксізмам-ленінізмам, што «чым вышэй палітычны узровень і марксісцка-ленінская свядомасць работнікаў любой галіны дзяржаўнай і партыйнай работы, тым вышэй і плодатворней сама работа, тым эфектыўней рэзультаты работы».

Многія тысячы нашых савецкіх, гаспадарчых, камсамольскіх і прафсаюзных работнікаў упарта і сістэматычна авалодваюць марксісцка-ленінскай тэорыяй, узмацняюць сваю актыўнасць на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва.

Сакратары райкомаў партыі тт. Войценкаў (Асіповічы), Макарэнка Дзянісаў (Бялынічы), Аксёнаў (Гарадок), Раскін [illegible] з'яўляюцца не толькі кіраўнікамі-арганізатарамі, але і ідэйнымі кіраўнікамі сваіх арганізацый, іх памочнікамі і кансультантамі па пытаннях марксісцка-ленінскай тэорыі.

Лекцыі па асновах марксізма-ленінізма паўсюды набылі вялікую папулярнасць. За мінуўшы год у абласцях і раёнах прачытаны тысячы такіх лекцый. У адным толькі горадзе Віцебску па асобных раздзелах «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» прачытана 454 лекцыі, [illegible]

якіх прысутнічала 70 тысяч чалавек, з іх 60 проц. склалі кантынгент слухачоў. Лектарскім калектывам Мінскага абкома партыі прачытана ў раёнах (не лічачы гарадоў Мінска і Барысава, дзе пры гаркомах ёсць самастойныя лектарскія групы) каля 600 лекцый, на якіх прысутнічала звыш 70 тысяч слухачоў. У большасці раёнаў Мінскай вобласці лекцыі наведвае сталая аўдыторыя ў 50—70 чалавек. Якасць лекцый у параўнанні з мінулым годам значна палепшылася.

Вельмі папулярнымі сталі гутаркі і бяседы па тэарэтычных пытаннях і асабліва тэарэтычныя канферэнцыі як адна з важнейшых форм дапамогі і падвядзення вынікаў работы ў марксісцкай самаадукацыі.

Добрахвотнасць выбару форм вучобы павысіла цікаўнасць і якасць работы гурткоў. Стымулявалася цікавасць. Слухачы на заняткі прыходзяць падрыхтаванымі, самі расказваюць аб прачытаным, прымаюць актыўны ўдзел у абмеркаванні тэарэтычных пытанняў. Добра працуе гурток пры Асіповіцкім чыгуначным дэпо (кіраўнік тав. Цікуноў): слухачы вывучылі ўжо 7 раздзелаў «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Не горш працуе гурток на Мінскай фабрыцы [illegible] тав. Хейфец [illegible] ЦК ВКП(б) [illegible] Неабходна [illegible] ЦК ВКП(б) у сваёй пастанове аб партыйнай прапагандзе.

Гурткі — далёка не галоўная форма дапамогі ў самаадукацыі. Але трэба з усёй сілай ісці насустрач таварышам, якія хочуць працаваць у гуртках. Трэба вылучыць кваліфікаванага прапагандыста, падабраць аднолькавы састаў гуртка, каб забяспечыць самастойную падрыхтоўку слухачоў да заняткаў у гуртку, актыўнае абмеркаванне тэарэтычных пытанняў, сур'ёзнае засваенне асноў марксізма-ленінізма.

Выконваючы ўказанні Цэнтральнага Камітэта партыі, наш друк правёў вялікую работу ў галіне прапаганды асноў марксізма-ленінізма. У цэнтральных і абласных газетах надрукавана многа кансультацый на важнейшыя пытанні марксісцка-ленінскай тэорыі. Усе гэтыя [illegible] адзначаны ў пастанове ЦК ВКП(б) ад 16 жніўня «Аб пастаноўцы прапаганды марксізма-ленінізма ў Беларускай ССР, Арлоўскай і Курскай абласцях». Аднак [illegible] на рад істотных недахопаў.

«Галоўны недахоп у пастаноўцы прапаганды марксізма-ленінізма заключаецца ў тым, што абласныя і раённыя партыйныя камітэты не арганізавалі вывучэння «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» усімі кіруючымі кадрамі, у асаблівасці партыйнымі і савецкімі. Сакратары райкомаў і партыйных бюро, работнікі аддзелаў прапаганды і агітацыі [illegible] асуджаных ЦК ВКП(б) метадаў бюракратычнага «кантролю», прадста-

> вілі справу індывідуальнай палітычнай самаадукацыі комуністаў самацёку. Многія партыйныя кіраўнікі поўнасцю адхіліліся ад усякага кіраўніцтва палітычнай самаадукацыяй комуністаў».

Кожная партыйная організацыя абавязана зрабіць для сябе большэвіцкія вывады з гэтай пастановы.

Вялізарны інтарэс і настойлівасць у вывучэнні марксісцка-ленінскай тэорыі, характэрныя для пераважнай масы комуністаў, не павінны засланяць таго факта, што некаторая частка партыйных, совецкіх і гаспадарчых работнікаў яшчэ не прыступіла да сістэматычнага вывучэння асноў марксізма-ленінізма або абмежавалася чытаннем першых раздзелаў «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

Зусім мала працуюць над сабой адказныя работнікі Барысаўскага РВК комуністы Моніч, Лапцінскі, Каткоў і Лізеўскі. На шклозаводзе імені Дзержынскага партыйны камітэт (сакратар тав. Каспяровіч) самаўхіліўся ад кіраўніцтва партыйнай прапагандай. Комуністы шклозавода тт. Бушман, Карнач, Трушкевіч і інш. яшчэ не пачыналі працаваць над павышэннем свайго тэарэтычнага ўзроўню, а Мухін, Гібельчук, Сарокін ніяк не могуць пайсці далей другога і нават першага раздзела «Кароткага курса».

Сакратар Жыткавіцкага райкома партыі тав. Маслякоў, сакратар Халопеніцкага райкома тав. Жукаў не кіруюць выхаваннем кадраў і самі не авалодваюць рэвалюцыйнай тэорыяй, спасылаючыся на «адсутнасць часу». Яны забываюць, што авалодванне большэвізмам— пярвейшы абавязак кожнага партыйнага і непартыйнага большэвіка, што партыйныя арганізацыі павінны сістэматычна кіраваць палітычнай самаадукацыяй, дапамагаць кадрам партыйных і непартыйных работнікаў авалодваць навукай аб будаўніцтве новага комуністычнага грамадства. Яны забываюць аб указанні ЦК ВКП(б) на неабходнасць «узняць грамадскую партыйную думку супроць тых, хто не працуе над сабой, не вывучае сістэматычна асноў марксізма-ленінізма».

Вялікім недахопам у прапагандысцкай рабоце з'яўляецца і тое, што тэматыка лекцый часта адстае ад індывідуальнага вывучэння гісторыі партыі, што «аддзелы прапаганды і агітацыі часта раўняюцца не на перадавых, а на адстаючых у вывучэнні гісторыі партыі людзей, тэмы лекцый не садзейнічаюць больш хуткаму прасоўванню ўперад таварышоў, самастойна вывучаючых «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)». ЦК ВКП(б) спецыяльна ўказаў, што лекцыі трэба чытаць па ўсіх раздзелах «Кароткага курса», удзяляючы галоўную ўвагу паслякастрычніцкаму перыяду гісторыі партыі, тэмам, непасрэдна звязаным з практыкай нашай сённешняй барацьбы за пабудову комунізма.

Неабходна звярнуць увагу і на палепшанне якасці лекцый. Трэба так прыпадносіць матэрыял, каб лекцыя выклікала ў слухачоў цягу да ведаў, каб яна прывівала густ да работы над кнігай, да аўладання астрэйшаю зброяй рэвалюцыйнай тэорыі, каб яна мабілізоўвала масы на гераічныя ўчынкі ў справе выканання трэцяй сталінскай пяцігодкі, у справе пабудовы комунізма ва ўмовах капіталістычнага акружэння.

Нельга забываць таксама і аб сістэматычнай прапагандзе бягучай палітыкі, аб практыцы папулярных масавых лекцый для менш падрыхтаваных членаў і кандыдатаў партыі, рабочых і калгаснікаў, аб узмацненні работы парткабінетаў.

У справе марксісцка-ленінскай загартоўкі нашых кадраў пачэсна і адказна роля друку. Нашы газеты абавязаны асвятляць не толькі ар-

ганізацыйны вопыт прапаганды, не толькі паведамляць аб тым, дзе і што робіцца у галіне прапаганды, але і даваць ацэнку якасці лекцый, кансультацый, заняткаў гурткоў. Некаторыя раённыя газеты, захапіўшыся кансультацыямі па тэарэтычных пытаннях, упусцілі з-пад увагі сваю асноўную задачу—шырока асвятляць вопыт самастойнага вывучэння гісторыі партыі, работу гурткоў і вопыт прапагандыстаў, ацэньваць па сутнасці якасць лекцый і кансультацый.

Уся асноўная кансультацыйная работа друку павінна быць сканцэнтравана ў цэнтральных і абласных газетах, у журналах. Работнікам большэвіцкага друку неабходна многа працаваць над якасцю публікуемых артыкулаў, лекцый і кансультацый, сачыць за тым, каб чотка і ясна выкладаліся асвятляемыя пытанні, каб не было ніякіх скажэнняў. Паспяховае вырашэнне гэтай задачы ў першую чаргу залежыць ад стварэння моцнага, сталага аўтарскага актыва.

Разварот друкаванай прапаганды ў газетах і журналах, шырокі размах лекцыйнай работы сіламі кваліфікаваных лектароў садзейнічал, павышэнню ідэйнага ўзроўню нашых кадраў.

Зроблена безумоўна многа. Але яшчэ нельга сказаць, што партыйная прапаганда перабудавана поўнасцю так, як гэтага патрабуюць указанні ЦК ВКП(б).

Прапаганда марксізма-ленінізма—важнейшая справа кожнай партыйнай арганізацыі. Сакратары райкомаў і партбюро, сакратары пярвічных партыйных арганізацый абавязаны сістэматычна бяседаваць з комуністамі аб тым, як яны авалодваюць большэвізмам. Ведаючы, хто і як працуе над авалоданнем большэвіцкай тэорыяй, партыйныя арганізацыі здолеюць па-сапраўднаму кіраваць самастойнай работай нашых кадраў.

Па-большэвіцку кіраваць прапагандай марксізма-ленінізма, сістэматычна дапамагаць партыйным і непартыйным кадрам авалодваць большэвізмам, забяспечыць нястомнае вывучэнне асноў марксізма-ленінізма ўсімі кіруючымі работнікамі—вось баявыя задачы, аб якіх напамінае нам знамянальная гадавіна з дня прыняцця Цэнтральным Камітэтам гістарычнага рашэння «Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выпускам «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

Аб гэтым-жа напамінае нам і пастанова ЦК ВКП(б) ад 16 жніўня «Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў Беларускай ССР, Арлоўскай і Курскай абласцях». Яна патрабуе ад усіх партыйных арганізацый падняць марксісцка-ленінскае выхаванне на яшчэ больш высокую ступень.

> «Для таго, каб паспяхова ажыццявіць асноўную задачу трэцяй пяцігодкі, задачу комуністычнага выхавання працоўных, задачу пераадолення перажыткаў капіталізма ў сазнанні людзей, для таго, каб паспяхова вырашаць практычныя пытанні соцыялістычнага будаўніцтва, для таго, каб быць падкаваным у барацьбе супроць капіталістычнага акружэння і яго агентуры, нашы кадры павінны быць узброены тэорыяй, г. зн. веданнем законаў грамадскага развіцця і палітычнай барацьбы» (Жданаў).

Нястомная работа над авалодваннем марксісцка-ленінскай тэорыяй, над ідэйным выхаваннем усіх нашых кадраў з'яўляецца ўмовай нашых поспехаў на ўсіх участках партыйнага, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

У сваім геніяльным дакладзе на XVIII з'ездзе ВКП(б) таварыш Сталін указаў, што марксісцка-ленінская навука аб грамадстве, аб законах развіцця грамадства, аб законах развіцця пралетарскай рэвалюцыі, аб законах развіцця сацыялістычнага будаўніцтва, аб перамозе камунізма ёсць такая галіна навукі, веданне якой павінна быць абавязковым для бальшавікоў усіх галін навукі.

> «Ленінец,—гаварыў таварыш Сталін,—не можа быць толькі спецыялістам аблюбаванай ім галіны навукі,—ён павінен быць разам з тым палітыкам-грамадскім работнікам, які жыва цікавіцца лёсам сваёй краіны, знаём з законамі грамадскага развіцця, умее карыстацца гэтымі законамі і імкнецца быць актыўным удзельнікам палітычнага кіраўніцтва краінай».

Веды, набытыя пры вывучэнні гісторыі бальшавіцкай партыі, трэба ўмець прымяняць на практычнай рабоце. Толькі той, хто, вывучыўшы асноўныя законы развіцця грамадства, вопыт барацьбы бальшавіцкай партыі, здолее стаць майстрам сваёй справы,—толькі той можа сказаць, што ён сапраўды творча, а не па-кніжнаму зразумеў сутнасць самай перадавой навукі.

Творчае веданне рэвалюцыйнай тэорыі дае работніку любой галіны шырокую перспектыву у яго дзейнасці, упэўненасць у перамозе, бо толькі такі работнік умее спалучаць кожны крок сваёй практычнай работы з канчатковаю мэтай нашай барацьбы.

Авалодваючы тэорыяй марксізма-ленінізма, якая ўзбройвае веданнем законаў грамадскага развіцця, нашы кадры стануць сапраўды непераможнымі і яшчэ больш паспяхова павядуць пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна ўвесь савецкі народ да перамогі камунізма.

С. Будзённы

Чырвоная конніца ў грамадзянскай вайне

К 20-годдзю Першай Коннай Арміі

Дваццаць год назад, у годы жорсткай барацьбы з белагвардзейцамі, памешчыкамі і інтэрвентамі, якія імкнуліся задушыць Совецкую Рэспубліку, была створана па ініцыятыве вялікага стратэга пролетарскай рэвалюцыі таварыша Сталіна пабеданосная 1-я Конная армія.

З велізарнейшай радасцю і гор[illegible] наш народ [illegible] нацы слаўны шлях 1-й Коннай арміі, беспрыкладныя ўчынкі байцоў, камандзіраў і палітработнікаў—конармейцаў, разграміўшых бела[illegible] гвардзейскія полчышчы і пакрыўшых свае чырвоныя баявыя сця[illegible] незвялаемай славай.

Чырвоная кавалерыя, арганізаваная і непасрэдна кір[illegible] таварышамі Сталіным і Варашылавым, з'явілася рашаючай сілай у разгроме белых армій на поўдні і паўднёвым захадзе Совец[illegible] Расіі.

Шматлікая і моцная царская конніца, якая налічвала бо[illegible] 200 000 сабель, з добрымі салдацкімі кадрамі і дасканалым конскім [illegible]авам, [illegible] і няздольнымі камандзірамі, якія складаліся з князёў, графоў, баронаў і т. п., к канцу 1917 года поўнасцю развалілася і як рэгулярная конніца перастала існаваць.

«Васнепевы» таго часу на чале з прабраўшымся да кіра[illegible] Чырвонай Арміяй злейшым ворагам народа Троцкім самым ра[illegible] чынам процідзейнічалі стварэнню такога каштоўнага манеўранага, рухавага і сакрушальнага роду войск як конніца.

Некаторыя адбітак таксама пакінула і імперыялістычная вайна, у якой конніца, дзякуючы няправільнай яе падрыхтоўцы і выкарыстанню, была зведзена на-нішто яе кіраўніцтвам.

Аднак нішто не перашкодзіла рабоча-сялянскаму ўраду стварыць магутную конніцу пролетарскай рэвалюцыі.

Таварыш Сталін з геніяльнай празарлівасцю ацаніў [illegible] конніцы для сакрушальнага манеўра і разгрому пра[illegible] стэрскі прымяніў марксізм як кіраўніцтва [illegible] справе. Стварэнне буйных мас конніцы і іх выкарыстанне, [illegible] рашаючай с[illegible] знішчэння найбол[illegible] і небяспечнага праціўніка, з'явілася [illegible]ым каштоўным [illegible] гарскага ваеннага майстэрства.

Чырвон[illegible] конніца пачала ствараццa ў 1918 годзе пад Царыцыны[illegible] [illegible]аічнай абароны, якога кіраваў [illegible] а яго бліжэйшым саратнікам быў К. Е. В[illegible].

«Іменна тут, пад Царыцынам, зарадзілася і узм[illegible] Чырвоная конніца, [illegible]аўшая асновай непераможнай Першай Коннай Арміі, пакрыўшай славай баявыя сцягі» (Варашылаў).

* * *

Вялікае было значэнне Царыцына, цяпер Сталінграда, у дні самых жорсткіх баеў мінуўшай грамадзянскай вайны.

Барацьба за Царыцын, якая працягвалася каля года ў самых цяжкіх для нас умовах, прадэманстравала ўсяму свету, як вялікая воля к перамозе у пралетарыята, захапіўшага ў свае рукі уладу, і на якія гераічныя намаганні і ўчынкі ён здольны дзеля ідэй комунізма.

Магутная Чырвоная конніца была арганізавана не адразу і не ў звычайных умовах. Яна расла і мацнела ў ходзе барацьбы з узброенымі да зубоў белымі генераламі.

Яна нараджалася стыхійна, маленькімі атрадамі з рабочых, беднейшага сялянства і працоўнага казацтва, якія адступаў-ж [illegible]нуліся к Царыцыну, дзе ў гарачых баях ствараліся ўзброеныя сілы пад [illegible]іраўніцтвам таварышоў Сталіна і Варашы[illegible].

Тут, пад Царыцыным, параўнаўча невялікая част[illegible], якою я камандаваў, разгарнулася за кароткі тэрмін, к снежню 191[illegible] г., у 4-ю [illegible]алерыйскую дывізію. Затым у чэрвені 1919 г., [illegible] кавалерыйскай [illegible]ізіі, яна разгарнулася ў [illegible] Чырвонай [illegible]мії конны корпус. Абедзве гэтыя дывізі[illegible] [illegible]яніі абаронай Царыцына, потым, [illegible] [illegible]вали пад Варонежам, Раст[illegible] [illegible] баявую работу ў Кр[illegible] [illegible] рэшткі ўнутранай узброенай контррэвалюцыі.

[illegible] не выпадковым з'яўляецца разгортванне контррэвалю[illegible] [illegible]х армій на поўдні Расіі. Казацкія абласці спрадвеку з'яўля[illegible] [illegible] войскі, якія з'[illegible] [illegible] рэакцыі; неабме[illegible]ныя прасторы стэпаў, [illegible] своеасаблівы быт спрыялі шырокім, развіццю [illegible] Контррэвалюцыйныя генералы [illegible] стварыць [illegible] матэрыя[illegible] [illegible] іны [illegible]і на Доны, [illegible]зунгамі ў[illegible]очы [illegible]азацтва ў барацьбу супроць [illegible]

[illegible] [illegible]ыўнага фактара, [illegible] белага фронта. Але гэта [illegible] [illegible]ай Расіі белыя звярачалі паме[illegible] [illegible] насаджалі жорсткае свавольств[illegible] [illegible] [illegible]жарам на працоўнае насель[illegible] на беднейшыя слаі казацтва. Ужо канец рэйда [illegible]уецца масавым дэзерцірствам казакаў.

[illegible]авалі захваціць Царыцын. [illegible] [illegible]груе Донскую армію, якая [illegible] [illegible], і прабуе расшырыць сваю [illegible] [illegible]й абласці.

[illegible] ўдушыць важнейшы [illegible] [illegible]цыйны цэнтр, якім [illegible]уляўся Царыцын, авалодаць [illegible]ом, усім ніжнім цячэннем ракі Волгі і з'яднацца з белай арміяй Калча[illegible]

А[illegible]нак дасягнуць гэтага белым арміям не ўдалося. Царыцын [illegible] нашых руках. Чырвоныя войскі пад камандаваннем т[illegible] [illegible]ылава не толькі адстаялі Царыцын, але к красавіку 1[illegible] [illegible] здолелі адкінуць белых за р. Маныч.

У арганізацыі і кіраўніцтве барацьбой пад Царыцыным асоба следуе адзначыць ініцыятыўную і надзвычай вялікую арганізацыйную, ваенную і палітычную работу, праведзеную І. В. Сталіным. Непасрэдна перад наступленнем белых і ў час самога наступлення дзякуючы выключнай па свайму размаху і тэмпу рабоце таварыша Сталіна Царыцын быў ператвораны ў сапраўдны рэвалюцыйны ваенны лагер. Неарганізаванасці, блытаніне і поўнаму разброду ў адміністрацыйных, ваенных і грамадскіх арганізацыях, шырокаму пранікненню контррэвалюцыйных элементаў у савецкія і ваенныя органы быў пакладзен канец. Усё процідзеючае дыктатуры пролетарыята і проста нягоднае было вычышчана жалезнай мятлой. Часці і тыл значна ўмацаваліся, сталі арганізаванымі. Усё гэта ўзняло нашу боездольнасць на вялікую вышыню.

У баях пад Царыцыным, у перыяд яго неаднаразовых акружэнняў, нашы кавалерыйскія часці не толькі раслі і мацнелі, яны наносілі белагвардзейцам удар за ўдарам і разб[illegible] іх пла[illegible].

Дзейнічаючы на флангах і [illegible] Чырвон[illegible] конніца сваімі рашучымі і ліхім[illegible] бязлітасна біць ворагаў рабочага класа [illegible] чале з князем Тундутавым у раён[illegible] брыгаду палкоўніка Якаўлева ў раён[illegible]

Вялікую цікавасць прадстаўля[illegible] [ген]ерала Галубінцэва пад Прамой Балкай. Тут [illegible] з прыданымі ей двума бранеўікамі. Праціўнік быў за[illegible], нашы бранеўікі ўварваліся ў вёску і пачалі расстр[эльв]аючых з дамоў белых пехацінцаў і коннікаў. За бранеўкамі [illegible]лі конныя часці нашай дывізіі. Конніца праціўніка кінула [св]ою пяхоту, артылерыю і выскачыла за вёску. Але тут, сустрэтая ў шашкі нашай конніцай, яна часткай бы[illegible] [illegible]а ў напрамку на Д[illegible] [illegible]е супра[illegible] [illegible]ама была разгромлена, рэшткі палкоў былі узяты [illegible]

[illegible]мі ўзята звыш 2.000 палонных, 30 кулямётаў, 13 гармат, многа снарадаў, коней з сёдламі і абозы амаль усіх палкоў.

Гэта была першая буйная перамога, атрыманая пасля няудала[illegible] [illegible]энсіен на правым флангу 10-й арміі. [illegible] [illegible] [д]ух 10-й арміі. Перамога была атрыман[а] [illegible]

Не менш цікавым з'яўляецца і разгром бе[illegible] Пасля [з]няцця станіцы Качалінскай, [illegible] прыбег камандзір аднаго з батальёнаў [illegible] ведаміў, што ў раёне Кат[лу]бань конн[illegible] пяці палкоў [illegible] генерала Алексеева ўзяла ў палон два палкі на[ша]й пяхоты, аутаораніявік і [illegible]. Я безадкладна сабраў [illegible] рушыў на Катлубань з абходам [пр]аз хутар Вярцячы, [illegible] [illegible]у, што м[а]ё прабы[ванн]е ў Качалінскай магло быць вядома праціўніку і ён мог ч[акаць] мяне з гэтага напрамку. Я-ж, як заўсёды, хацеў ударыць нечакана з тылу.

Захваціўшы ў Вярцячым папутна інтэнданцкія склады і многа [illegible] Катлубань [illegible] і К[illegible] наш 4-ы полк сустрэў калону да 2.000 палонных чырвонаармейцаў.

Белагвардзейскі канвой быў абяззброен і нашы чырвонаармейцы вызвалены.

Прасоўваючыся далей, дывізія нечаканым ударам авалодала станцыяй Катлубань. Праціўнік кінуўся бегчы ў напрамку к Царыцыну, кідаючы на шляху абозы, кулямёты, артылерыю. Уся гэта маса неслася прама на фронт нашай пяхоты. Апошняя, бачачы хмары дзіка нясучайся на яе белай кавалерыі і ззаду—коннікаў з шашкамі нагала (нашы палкі), прыняла ўсё гэта за атаку белых, дрогнула і ледзь было не ўцякла. Толькі ўраганны артылерыйскі і кулямётны агонь бронепаяздоў, адкрыты па праціўніку, утрымаў нашу пяхоту на месцы. Конніца белых пацярпела поўны разгром.

Наша дывізія захваціла да тысячы палонных, 17 гармат, усе кулямёты і абозы. Тут былі разгромлены група генералаў Алексеева і Маркава—тры конныя і два пяхотныя палкі—і дывізія генерала Папова ў складзе чатырох конных палкоў. Мізэрныя рэшткі белых уцяклі на паўднёвы захад.

Разгром белых пад Катлубанню рашыў лёс усяго Царыцынскага фронта, а таксама і лёс белай арміі генерала Краснова.

У наступленні 10-й арміі на раку Маныч, а таксама пры адыходзе яе к Царыцыну і далей к Камышыну і Саратаву конніца [illegible] выконвае актыўныя і адказныя задачы па разгрому белых, ведучы паспяховыя баі з конніцай Врангеля, Улагая, Пакроўскага, Шацілава і інш.

Такім чынам, у баях пад Царыцыным Чырвоная конніца вырасла, умацнела і ператварылася ў рашаючы аператыўны фактар.

*

У восень 1919 г. абстаноўка для Савецкай Расіі стварылася выключна цяжкая. Белагвардзейскія арміі занялі Орол. Праціўнік набліжаўся к Туле, навісла пагроза над Масквой.

Для таго, каб выратаваць становішча, Цэнтральны Камітэт партыі пасылае для кіраўніцтва Паўднёвым фронтам таварыша Сталіна. Таварыш Сталін разгортвае кіпучую работу па арганізацыі узброеных сіл Паўднёвага фронта і высоўвае свой геніяльны план разгрому Дзенікіна, з нанясеннем галоўнага удару ў напрамку на Харкаў—Данбас—Растоў.

К гэтаму часу конны корпус, як адна з асноўных і рашаючых сіл, перасунуўся ў раён Варонежа і стаў тварам у твар з моцным і небяспечным праціўнікам—белай конніцай Мамантава і Шкуро.

Перад конным корпусам таварышом Сталіным была пастаўлена пачэсная і адказная задача—разграміць конніцу белых, захваціць Варонеж, Касторную і ўдарам на Курск адрэзаць зарваўшагася праціўніка. 19 кастрычніка конны корпус магутным контрударам біе наступаўшыя на яго конныя часці праціўніка, [illegible] дывізію корпуса Шкуро, захватвае велізарныя трафеі. К вечару 23 кастрычніка горад ахватваецца з трох бакоў, і белыя, не вытрымаўшы націску, бягуць, пакідаючы багатыя трафеі, аж да асабістага поезда генерала Шкуро. Так упершыню наносіцца адчувальнае паражэнне мацнейшай конніцы праціўніка.

Узяцце Варонежа аказала велізарны ўплыў на абстаноўку ўсяго фронта. У выніку гэтай нашай перамогі: па-першае, была знішчана пагроза правому флангу 8-й арміі, па-другое, развязаны рукі для

развіцця аперацыі пад ст. Касторнай і, па-трэцяе, ажыццёўлен выхад нашай конніцы на асноўную камунікацыю белай арміі, якая білася пад Орлом.

Па ўсяму Паўднёваму фронту наступае рашучы пералом. Момант патрабаваў новага ўдару для разгрому белых пад Касторнай.

Адпачыўшы 12 лістапада, 1-ы конны корпус аднаўляе наступленне і 15 лістапада, абходам з поўдня, з адначасовай лобавай атакай, разбівае касторненскую групу генерала Пастоўскага і займае ст. Касторную.

Аператыўнае значэнне поспехаў Чырвонай конніцы відавочна, яно не патрабуе каментарыяў. Знаходзячыся ў глыбокім тылу праціўніка, навісаючы грозой над комунікацыямі арлоўскай групы белых, конны корпус сваімі дзеяннямі стварае ўмовы для паспяховага наступлення ўсяго Паўднёвага фронта.

Конны корпус бліскуча выканаў першую частку плана таварыша Сталіна, разграміўшы белую конніцу пад Варонежам і Касторнай.

Дзеянні коннага корпуса пад Варонежам—Касторнай яшчэ раз паказалі, якой рашаючай сілай з'яўляюцца правільна прымяняемыя буйныя кавалерыйскія злучэнні.

Таварыш Сталін, мудра аценіўшы магутнасць і каштоўнасць конных мас у грамадзянскай вайне, паставіў пытанне аб безадкладным стварэнні Коннай арміі, наперакор прамому процідзеянню Іуды-Троцкага. Так была створана сталінская конніца—1-я Конная армія.

Але арміі Дзенікіна яшчэ не былі канчаткова разбіты,—трэба было працягваць наступленне і канчаткова дабіць паўднёвую контррэволюцыю, каб вызваліць рабочых і сялян, вярнуць краіне вугаль, сялянам зямлю.

Пачынаецца другі этап выканання плана таварыша Сталіна па разгрому Дзенікіна.

На гэтым этапе 1-я Конная армія з двума стралковымі дывізіямі складае ударную групу фронта. Арганізацыя стратэгічнага праследавання Данской і Добраахвотніцкай арміі, якія адступаліся к поўдню, дае дасканалы ўзор правільнага аператыўнага выкарыстання конніцы. Да самага Растова 1-я Конная армія безупынна пагражае глыбокім укліненнем паміж Данской і Добраахвотніцкай арміямі, і таму адыход гэтых армій прымае губіцельныя для іх размеры.

Праціўнік робіць адчайныя спробы стрымаць наступленне нашай конніцы. Але ўсе планы белых развальваюцца, як картачны домік.

Чырвоная конніца пабеданосна наступае, знішчаючы рэшткі жывой сілы праціўніка, і толькі ля самага Растова ў пачатку студзеня 1920 г. сустракае арганізаванае супраціўленне белых.

1-й Коннай ставіцца задача—імкліва праследаваць разбітага праціўніка і авалодаць Растовам.

6-га студзеня мы займаем Таганрог, а ў ноч на 9-е студзеня, пасля кровапралітнага вулічнага бою, бярэм Растоў. Растоў быў апошнім аплотам белага камандавання, і захват яго лепш за ўсё пацвярджае правільнасць выкарыстання Коннай арміі як ударнай групы фронта. На ўсім гэтым этапе Чырвоная конніца займае вядучую ролю ва франтавым маштабе.

Пасля ўзяцця Растова Конная армія вядзе кровапралітныя баі пад Батайскам, громіць конніцу генерала Паўлава і бярэ ў палон у поўным складзе пяхотны корпус генерала Крыжаноўскага пад Белай

Гліная. Нішто ўжо не магло стрымаць пабеданосны марш чырвоных войск і канчатковую ліквідацыю контррэвалюцыйных «узброеных сіл поўдня Расіі».

* * *

Вясна 1920 г. Панская Польшча, узброеная і снаражоная французскімі і англійскімі імперыялістамі, уторглася ў межы Украіны і ў пачатку мая захваціла Кіеў.

Для таго, каб збіць ганарыстасць польскім «ваякам», таварышы Ленін і Сталін рашылі перакінуць 1-ю Конную на Польскі фронт.

Зрабіўшы тысячакіламетравы марш, 1-я Конная армія 25 мая сканцэнтравалася ў раёне Умані.

На польскім фронце Коннай арміі давялося яшчэ раз прадэманстраваць усю сілу сваёй зброі. Умовы баёў тут некалькі адрозніваліся ад ранейшых. На змену шырокім стэпавым прасторам Украіны і Дона прыходзяць лясіста-балоцістыя раёны Палесся і Заходняга края. Новы праціўнік Польшча, больш моцны ў тэхнічных адносінах, у шырокіх размерах прымяняе фартыфікацыю—акопы, дротавыя загараджэнні. У кіраўніцтве аперацыямі польскіх войск прымаюць непасрэдны удзел відныя прадстаўнікі французскага генеральнага штаба.

Тым не менш поспехі Чырвонай конніцы ў першы-ж перыяд польска-савецкай вайны былі стольki-ж ашаламляючымі, што і ў грамадзянскай вайне на поўдні.

Першая задача, якую павінна была рашыць 1-я Конная, патрабавала безадкладнага пераходу ў наступленне і захвату пунктаў Казацін, Бердычэў, Жытомір для таго, каб знішчыць штаб кіраўніцтва польскіх войск, а затым разграміць польскую армію па частках.

Удачны выбар аператыўнага напрамку адразу даў сябе адчуць 5 чэрвеня, згарнуўшыся ў кулак, 1-я Конная армія ўтварае каля Озерна бліскучы замаскіраваны прарыў фронта праціўніка і накідаецца на яго тыл. Паслядоўна знішчаючы белапольскія арміі, Чырвоная конніца захоплівае Бердычэў, Жытомір, Новаград-Валынск, Роўна, Дубна, Броды і к сярэдзіне жніўня падыходзіць да сцен Львова. І, калі-б не здрадніцкі загад Троцкага, прымусіўшы Конную армію павярнуць праз Буск, Грубешоў, Замосце, безумоўна Львоў быў бы намі узяты і Польшча напэўна яшчэ тады-б развалілася. Паварот Коннай арміі і высоўванне ў раён Замосце паставілі яе ва ўмовы поўнага акружэння. Палякі скінулі буйныя сілы супроць нашай конніцы і рыхтаваліся тартаствавацъ перамогу. Але гэта былі дарэмныя мары. Конная армія не толькі выйшла з акружэння, але і нанесла вялікае паражэнне палякам.

У выніку баявых дзеянняў на Польскім фронце можна сказаць, што Конная армія ў савецка-польскай вайне адыграла не менш значную ролю, чым у барацьбе з Дзянікіным. Конная армія з'явілася рашаючай і вядучай сілай у разгроме палякаў. Таварыш Сталін, які кіраваў Паўднёва-Заходнім фронтам, у сваёй бяседзе аб становішчы на Польскім фронце гаворыць: «Не падлягае сумненню, што прарыў нашай конніцы ў раёне Жытоміра адыграў рашаючую ролю ў пераломе на фронце».

У канцы жніўня месяца 1920 года пачаў вылазіць з Крыма бела-

гвардзейскі барон Врангель, ствараючы пагрозу тылам Паўднёва-Заходняга фронта.

Для хутчэйшай ліквідацыі врангелеўскай авантуры 1-я Конная армія была перакінута на Крымскі фронт. Зрабіўшы 700-кіламетравы марш, Конная армія атрымала адказную і цяжкую задачу—пасля пераправы праз Днепр, ля Кахоўкі, імклівым маршам выйсці на тылы Врангеля, адрэзаць яго ад перашэйкаў і рашучым ударам знішчыць галоўныя сілы праціўніка.

30 кастрычніка Конная армія вышла на тылы Врангеля, які, адчуўшы ў сябе за спіною Чырвоную конніцу, пачаў хутка адкатвацца ў Крым. Завязаліся гарачыя б(і пад Агайманам, Раждзественскай, Отрадай. На дывізіі Коннай арміі навaліліся пераважаючыя сілы белых, паколькі нашы 2-я конная, 4-я і 13-я арміі, наступаўшыя з фронта, не праявілі патрэбнай рашымасці і гэтым самым увесь цяжар баявых дзеянняў звалілі на Конную армію. Але і ў гэтых цяжкіх умовах Чырвоная конніца сваю задачу выканала з чэсцю.

Разгромам барона Врангеля закончыўся слаўны баявы шлях 1-й Коннай арміі.

* * *

Уся гераічная гісторыя 1-й Коннай арміі з'яўляецца блескучым і непраўзыйдзеным узорам арганізацыі, аператыўнага выкарыстання і баявой дзейнасці конніцы.

Гісторыя не ведае іншых прыкладаў, дзе-б конніца, створаная ў ходзе вайны, недастаткова ўзброеная і з камандзірамі-самародкамі, якія вышлі з рабочых і сялян, разграміла моцна ўзброеныя арміі, узначальваемыя «вучонымі» генераламі і афіцэрамі.

У сусветную імперыялістычную вайну, у час вядомага Свянцянскага прарыва, германскі кавалерыйскі корпус генерала Гарн'е, апынуўшыся ў выключна спрыяючай абстаноўцы на флангу і ў тылах рускіх арміі, не нанёс абсалютна ніякага паражэння ні адной часці рускіх войск.

Чаму-ж Чырвоная конніца мела такія поспехі, якіх не ведае гісторыя войн мінулага? Гэта з'ясняецца таму, што ўвесь асабісты састаў яе — ад байцоў да Рэўваенсовета арміі змагаўся за савецкую уладу, палітыка якой адпавядала кроўным інтарэсам ўсяго народа, таму што конніцу стварала наша родная камуністычная партыя, таму што конніцу выпеставалі і штодзенна ёю кіравалі такія дзеячы як таварышы Сталін і Варашылаў

Бліскучыя прыклады арганізацыі, узбраення, аператыўнага выкарыстання і баявой дзейнасці 1-й Коннай арміі заклалі трывалыя асновы будаўніцтва сучаснай конніцы.

Гэтыя асновы наступныя:

1. Калі раней часці конніцы ў асноўным мелі на ўзбраенні толькі саблі і вінтоўкі, то Конная армія з моманту свайго зараджэння ўбірала ў сябе вялікую колькасць кулямётаў, артылерыю, бронемашыны, самалёты, бронепаязды. І гэта ў той час, калі ў нас адчуваўся востры недахоп агнявых і тэхнічных сродкаў барацьбы.

Следуючы па гэтаму адзіна правільнаму шляху, наша Чырвоная конніца насычана цяпер нязмерна большай колькасцю ручных і станкавых кулямётаў, усіх відаў процітанкавай, палявой і зенітнай артылерыі, магутнымі быстраходнымі танкамі і іншымі сучаснымі тэхніч-

нымі сродкамі барацьбы. Такім чынам матор не выцесніў каня, а стаў яго верным спадарожнікам і другам, а кавалерыйскія злучэнні з дапаможнага сродку ў час сусветнай вайны ператварыліся ў рашучы вырашальны сродак.

Усё гэта зрабіла конніцу родам войск, здольным як самастойна, так і сумесна з іншымі родамі войск рашаць любыя баявыя задачы у сучасных умовах.

У сваёй прамове, прысвечанай дваццацігоддзю РСЧА, таварыш Варашылаў сказаў: «Аднак, мы пераконаны, што наша доблесная конніца яшчэ не раз прымусіць аб сабе гаварыць, як аб магутнай і пабеданоснай Чырвонай кавалерыі. Наша конніца поўнасцю адпаведна сучасным умовам рэарганізавана. Яна не безабаронна супроць авіяцыі і танкаў і пабудавана так, што і ва ўзаемадзеянні з іншымі родамі войск і самастойна можа рашаць сур'ёзныя баявыя задачы». І далей: «Чырвоная кавалерыя па-ранейшаму з'яўляецца пабеданоснай і сакрушальнай узброенай сілай і можа і павінна рашаць вялікія задачы на ўсіх баявых фронтах».

2. Звядзенне кавалерыйскіх дывізій у Конную армію, узмацненне яе на пэўных этапах барацьбы стралковымі злучэннямі і выкарыстанне на самастойным аператыўным напрамку, як рашаючага сродку галоўнага камандавання, утвараліся ўпершыню ў гісторыі.

Конная армія выконвала франтавыя задачы самастойна ў аператыўным узаемадзеянні з суседнімі арміямі і ў тактычным узаемадзеянні з прыданымі або знаходзячыміся ў непасрэднай сувязі з ёю стралковымі часцямі. Так было на Паўднёвым фронце пры разгроме Дзянікіна, на Заходнім фронце пры разгроме палякаў і на поўдні пры ліквідацыі Врангеля. Конная армія, кідаючыся ўперад, грамiла ворагаў па частках і стварала рашучы пералом па ўсяму фронту.

З гісторыі вядомы і раней выпадкі арганізацыі конніцы ў кавалерыйскія корпусы і аб'яднання іх пад адзіным камандаваннем, напрыклад, аб'яднанне кавалерыйскіх корпусаў напалеонаўскай арміі пад адзіным кіраўніцтвам Мюрата. Аднак гэта масіраванне конніцы не даводзілася да канца. Кавалерыя не атрымлівала неабходнай самастойнасці і правільнага прымянення, яна прывязвалася непасрэдна да пяхоты або выконвала другарадныя задачы.

У сучасных умовах прымяненне конніцы павінна быць безумоўна ў буйных масах. Пры гэтым само паняцце масіравання набывае новае значэнне. Буйныя конныя арганізмы, узмоцненыя танкамі, матарызаванай пяхотай і падтрымліваемыя моцнай авіяцыяй, становяцца конна-механізаванымі арміямі, прадстаўляючымі сабою камбінат рухавых родаў войск. Таму пытанні ўзаемадзеяння конніцы з іншымі родамі войск і асабліва з танкавымі, матарызаванымі часцямі і авіяцыяй, набылі велізарнае значэнне.

3. Дзеянні часцей, злучэнняў і ў цэлым Коннай арміі насілі выключна актыўны, наступальны характар, з прымяненнем шырокага і гібкага манеўра, раптоўнасці і імклівасці.

У адрозненне ад пасіўных дзеянняў конніцы ў сусветную вайну, калі яна лічыла за лепшае адседжвацца ў тылу і ўхіляцца ад бою, Чырвоная конніца заўсёды шукала бою і рашала баявыя задачы толькі боем.

Конная армія правяла рад класічных наступальных аперацый у выключна цяжкіх і розьнастайных умовах.

Такімі аперацыямі з'яўляюцца захват Варонежа і Касторнай і разгром конніцы Шкуро і Мамантава, аперацыі па ўзяццю Растова, разгром конніцы Паўлава і стралковага корпуса Крыжаноўскага над Белай Глінай, прарыў Польскага фронта, узяцце Новаград-Валынска і інш.

Большасць аперацый праведзена з фарсіраваннем рачных перашкод (рэкі Дон, Случ, Гарынь, Буг і інш.) і пераадоленнем розных інжынерных умацаванняў, уключна да дротавых загараджэнняў, моцна развітых акопаў і т. п. Пры гэтым усе аперацыі 1-й Коннай арміі паказваюць адсутнасць шаблона ў іх арганізацыі і правядзенні. Усе яны будаваліся з вялікім майстэрствам, на ўсебаковым уліку ўсіх элементаў абстаноўкі.

Камандаванне часцей, злучэнняў Коннай арміі заўсёды мела неабходныя даныя аб абстаноўцы. Разведвальнай службе ўдзялялася вялікая ўвага. Разведка была гнуткая і вялася бесупынна. Гэта становішча, адлюстраванае цяпер у нашых статутах, што падраздзяленні, часці, злучэнні і кожны баец і камандзір, якую-б задачу яны ні выконвалі, павінны весці разведку, з'яўлялася абавязковым патрабаваннем і святым абавязкам усяго асабовага саставу Коннай арміі.

Гібкасць манеўра і хуткасць перагрупіровак, згуртаванне пераважных сіл і сродкаў у рашаючым месцы, раптоўнасць нападу і арганізацыя чоткага ўзаемадзеяння ўсіх сіл і сродкаў, пастаянная падтрымка конніцы агнём у пешых і конных страях, шырокая ініцыятыва, пастаянная сувязь і ўзаемная падтрымка,—усё гэта характарызуе баявую дзейнасць Коннай арміі.

Майстэрства дзеянняў 1-й Коннай арміі заключалася ў тым, што яна, як правіла, біла оптам і ў розніцу больш шматлікага і мацней узброенага праціўніка

Баявая работа Коннай арміі дае нам павучальныя прыклады таго, як трэба рыхтаваць начсастаў, часці і злучэнні конніцы Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі ў духу актыўных і наступальных дзеянняў, зразумела з улікам усёй рознастайнасці сучаснай тэхнікі.

1-я Конная армія, выконваючы важнейшыя аператыўныя задачы, дала не толькі ўзоры арганізацыі і правядзення наступальных аперацый, яна таксама з вялікім майстэрствам ажыццяўляла і іншыя віды баявой дзейнасці. Такімі дзеяннямі з'яўляліся:

а) абараняльныя дзеянні коннага корпуса па прыкрыццю адыходу 10-й арміі к Камышыну і Саратаву; характэрна, што ў гэтым выпадку дзеянні корпуса носяць актыўны характар, шматлікая конніца Мамантава, Шацілава, Пакроўскага і іншых за перыяд адыходу была моцна патрапана;

б) аператыўнае праследаванне адыходзячых войск Дзянікіна з хуткім апракідваннем іх пры спробах затрымацца на пасобных рубяжах;

в) выхад з акружэння на Польскім фронце пад Замосцем, калі палякам і ў гэтай цяжкай для нас абстаноўцы было нанесена вялікае паражэнне.

Такім чынам, уся рознастайная баявая дзейнасць 1-й Коннай арміі, створанай вялікім Сталіным, дае нам выключныя прыклады таго, як трэба арганізаваць і выкарыстаць конніцу і як трэба перамагаць любога, нават мацнейшага ворага малой крывёю.

Чырвоная конніца цвёрда засвоіла аператыўна-тактычныя асновы

дзейнасці 1-й Коннай арміі і, увабраўшы ў сябе яе слаўныя баявыя традыцыі, за годы мірнага жыцця ў значнай меры відазмянілася. Узброіўшыся новай складанай і разнастайнай тэхнікай, яна стала нязмерна мацней і з'яўляецца грознаю сілай, здольнай выканаць любыя аператыўныя задачы.

Чырвоная конніца ва ўзаемадзеянні з танкамі, мота-пяхотай і авіяцыяй паказала сваю гатоўнасць і здольнасць быць рашаючай сілай пры выкананні задач, пастаўленых перад ёю камандаваннем Чырвонай Арміі па вызваленню ад польскіх паноў Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Наша конніца паказала высокую рухавасць і манеўранасць, робячы маршы з баямі ў першыя два дні пасля пераходу граніцы на 75-100 км. Яна таксама паказала вялікую прабіўную сілу, гераізм і адвагу байцоў, камандзіраў і палітработнікаў.

Будзем спадзявацца, што і ўперад, калі гэтага патрабуе абстаноўка, Чырвоная конніца будзе ў першых радах абаронцаў нашай соцыялістычнай радзімы і, сакрушаючы любога ворага, які паспрабуе парушыць наша мірнае жыццё, зноў пакрые чырвоныя баявыя сцягі неўвядаемай славай.

„Правда“

М. Колатаў і Б. Хаіт

Палітычная актыўнасць мас

Выбары ў Народнае Сабранне Заходняй Беларусі ператварыліся для працоўных Слонімскага павета ў вялікае нацыянальнае свята.

Зварот Беластокскага часовага ўпраўлення быў надрукован у мясцовай газеце «Вольная праца» на рускай, беларускай, яўрэйскай і польскай мовах, што дало шырокім масам насельніцтва магчымасць добра з ім азнаёміцца. На вуліцах можна было сустрэць натоўпы людзей, якія калектыўна чыталі і абмяркоўвалі гэты зварот. На ўсіх прадпрыемствах і ўстановах горада і павета былі праведзены мітынгі рабочых, сялян, рамеснікаў, інтэлігенцыі. Выступаючыя на мітынгах цалкам і поўнасцю падтрымлівалі ініцыятыву Беластокскага часовага ўпраўлення склікаць Народнае Сабранне для рашэння хвалюючых пытанняў жыцця беларускага народа.

Яшчэ больш узрасла палітычная актыўнасць мас пры вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Народнага Сабрання. Рабочыя, сяляне, рамеснікі, інтэлігенцыя горача абмяркоўвалі на сваіх сходах кожную кандыдатуру, стараючыся паслаць у Народнае Сабранне сваіх лепшых сыноў і дачок.

На сходзе камітэта Быценьскай воласці сяляне аднадушна выставілі кандыдатам у дэпутаты Народнага Сабрання селяніна Івана Ігаравіча Калесніка, які зараз працуе старшыней валаснога сялянскага камітэта. Калеснік І. Г. на працягу свайго жыцця батрачыў у памешчыкаў і кулакоў, працаваў на лесапільных заводах. У 1936 г. кіраваў рэвалюцыйнай работай у м. Быцень, за што ў 1938 г. быў арыштован і выслан у канцэнтрацыйны лагер Бяроза-Картузка, дзе прабыў да прыходу Чырвонай Арміі.

Па Слонімскаму павету вакол 27 акруговых выбарчых камісій і 215 выбарчых участкаў згуртаваўся вялікі актыў, які многа зрабіў для паспяховага правядзення выбараў.

Выбарчы актыў—гэта рабочыя, сяляне, рамеснікі, інтэлігенты, шчаслівыя тым, што збавіліся ад цяжкага панскага ярма, што атрымалі магчымасць будаваць свабоднае жыццё, якое прынесла ім доблесная Чырвоная Армія.

Актывістка 3-га ўчастка акруговай выбарчай камісіі гор. Слоніма Храбравіцкая Бася, па прафесіі партніха, літаральна тыднямі не пакідала выбарчага ўчастка, дакладна і добрасумленна выконвала ўсе даручэнні.

Член акруговай выбарчай камісіі № 2 гор. Слоніма тав. Хоінскі быў адначасова прымацован да выбарчага ўчастка № 4 той-жа акругі,

дзе забяспечыць 100-працантную яўку ў дзень выбараў—22 кастрычніка, для выбаршчыкаў свайго ўчастка арганізаваў канцэрт.

За час падрыхтоўкі да выбараў па гор. Сloніму і павету быў праведзен рад масавых палітычных і культурных мерапрыемстваў. На сходах рабочых, сялян, рамеснікаў і інтэлігенцыі ставіліся даклады аб Сталінскай Канстытуцыі, аб радасным жыцці [illegible] у СССР, аб парадку выбараў у Народнае Сабранне Заходняй Беларусі. Пасля дакладаў выступаўшыя расказвалі аб сваім горкім мінулым і дзякавалі партыю большэвікоў, Чырвоную Армію і вялікага Сталіна за вызваленне. Удзельнікі мітынгаў і сходаў прымалі рэзалюцыі, у якіх абавязваліся як адзін з'явіцца 22 кастрычніка на выбарчыя участкі і галасаваць за выстаўленых кандыдатаў у дэпутаты. У прывітальных тэлеграмах правадыру народаў вялікаму Сталіну яны горача дзякавалі за клопаты аб лёсе беларускага народа. Пасля сходаў арганізоўваліся мастацкія выступленні мясцовых [illegible] самадзейнасці, дэманстраваліся совецкія кінофільмы

21 кастрычніка, за дзень да выбараў, адбыўся агульнагарадскі мітынг і дэманстрацыя. 10 тысяч працоўных гор. Слоніма вышлі на вуліцы, каб прадэманстраваць сваю адданасць большэвіцкай партыі і правадыру народаў таварышу Сталіну. Дэманстранты неслі партрэты кіраўнікоў большэвіцкай партыі і совецкага ўрада, плакаты і лозунгі, спявалі рэвалюцыйныя песні. Выступаўшы на мітынгу рабочы [illegible] завода тав. Герман дзякаваў Чырвоную Армію за тое, што яна прынесла працоўным Заходняй Беларусі доўгачаканую свабоду

19 кастрычніка адбыўся агульнагарадскі сход моладзі Слоніма. Актыў моладзі з вялікім густам упрыгожыў памяшканне Народнага [illegible], дзе адбываўся сход. Сярэдзіну сцэны займаў вялікі партрэт тав. Сталіна, абвіты жывымі кветкамі. Лозунгі на рускай, беларускай, яўрэйскай і польскай мовах заклікалі моладзь прыйсці на выбарчыя ўчасткі і галасаваць за выстаўленых кандыдатаў у дэпутаты Народнага Сабрання Заходняй Беларусі. Даклад на тэму аб Сталінскай Канстытуцыі зрабіў прадстаўнік Чырвонай Арміі тав. Осіпаў. Пасля дакладу з гарачай прамовай выступіла тав. Лысенка на беларускай мове. Яна расказала пра цяжкую долю жанчыны пры панах, пра светлы і прасторны жыццёвы шлях, адкрыты ёй цяпер. Затым выступіў тав. Гавурын на яўрэйскай мове. Ён гаварыў аб шчаслівай будучыні працоўнай моладзі. Тав. Бунімовіч на польскай мове вітала вызваліцельніцу беларускага народа Чырвоную Арімю. Агульны сход паслаў прывітальную тэлеграму таварышу Сталіну. У заключэнне быў праведзен вечар самадзейнасці. Хор з мясцовай моладзі выканаў песню аб Сталіне і рад іншых совецкіх песень.

Падрыхтоўчая агітацыйна-масавая работа дала свае вынікі. Па Слонімскаму павету у галасаванні ўдзельнічала 99,15 проц. усіх выбаршчыкаў. За вылучаных кандыдатаў галасавала 98,55 проц. усіх прымаўшых удзел у выбарах.

Галасуючы за выстаўленых кандыдатаў у Народнае Сабранне, насельніцтва Слонімскага павета разам з тым галасавала за совецкую ўладу, за далучэнне Заходняй Беларусі да БССР і ўваходжанне ў састаў Саюза ССР, за канфіскацыю памешчыцкіх зямель, за нацыяналізацыю банкаў і буйнай прамысловасці.

Гэта свае жаданне працоўныя Слонімскага павета выказвалі ў сваіх выступленнях на мітынгах і ў друку.

Рабочы кафельнага завода гор. Слоніма тав. Град Браніслаў расказваў: «Усе маё жыццё было поўна слёз і гора. Працаваў па 16—18 гадзін у суткі, а зарабляў столькі, што не мог пракарміць сваю сям'ю. Жылі ў жудасных умовах, у падвале, дзе было цёмна, холадна і сыра. Толькі зараз мы вольна ўздыхнулі. Чырвоная Армія прынесла нам свабоду і радасць. 22 кастрычніка я разам з сям'ёю буду галасаваць за тав. Хомскага. Я ведаю, што ён рабочы і ў Народным Сабранні будзе галасаваць за ўстанаўленне ў нас савецкай улады».

Па Слонімскаму павету ў дэпутаты Народнага Сабрання выбрана 27 чалавек. Усе яны атрымалі абсалютную большасць галасоў. Многія з іх, як тт. Хомскі, Каленік, Русецкая, Скок, праследваліся за рэвалюцыйную дзейнасць пры польскай уладзе, сядзелі ў турмах і канцэнтрацыйных лагерах, адкуль былі вызвалены з прыходам Чырвонай Арміі. Па нацыянальнасці сярод 27 дэпутатаў—24 беларусы, 2 яўрэі, 1 паляк.

Асаблівую цікавасць прадстаўляе характарыстыка дэпутата Скока Міхаіла Раманавіча. 1897 года нараджэння. Сын батрака. За рэвалюцыйную работу тры разы арыштоўваўся. 8 год прасядзеў у турме. У 1938 г. прыгавораны да пакарання смерцю. Прыгавор замянілі пажыццёвым заключэннем у турме. Быў вызвален толькі пасля прыходу Чырвонай Арміі.

Дэпутат Хомскі Хаім Янкелевіч. 1895 года нараджэння. З малых [illegible] працаваць у пякарню. У 1919—20 г. удзельнічаў у грама[illegible] у радах Чырвонай Арміі. У 1926 г. за рэвалюцыйную [illegible] асуджан на 6 год турмы. У 1939 г. польскі ўрад саслаў [illegible] ў канцэнтрацыйны лагер Картуз-Бяроза, адкуль ён [illegible] Чырвонай Арміі.

Выбары дэпутатаў у Народнае Сабранне ўзнялі да палітычнага [illegible] цця многія тысячы працоўных. Часовае кіраўніцтва гор. Слоніма штодзённа наведваюць больш 200 чалавек. Прыходзяць з просьбамі адкрыць школу, перавесці навучанне на беларускую мову, прыняць дзяцей у гімназію, арганізаваць вячэрнюю вучобу. Многія просяць устроіць на работу.

Часовае кіраў[illegible] а перасяленне бежанцаў і беспрацоўных ў раёны [illegible] У горадзе Слоніме праводз[illegible] грамадскія работы, на які[illegible] вялікая колькасць рабочых. [illegible] гортваннем м[illegible] прамысловасці беспрацоўе будзе зусім ліквідавана.

Многа ўвагі ўдзяляецца расшырэнню школьнай сеці. У гімназіі адкрыты паралельныя класы. Для падрыхтоўкі настаўнікаў праводзяцца курсы. Падрыхтоўваецца адкрыццё вячэрніх школ для дарослых. Для бес[illegible] дзяцей адкрываецца дзіцячы дом у былым маентку памеш[illegible]

[illegible] вялікім задавальненнем сустрэла [illegible] адкрыццё [illegible] платных амб[illegible] і больн[illegible] першых дзён іх работы [illegible] вялікі наплыў наведвальнікаў. [illegible] аддзеле аховы здароўя [illegible] хуткая медыцынская дапамога. Машына з [illegible] выкліку выязджае ў валасці і вёскі для бясплатна[illegible] месцы.

Кіраўнікі панскай Польшчы зусім не клапаціліся аб культурным абслугоўванні насельніцтва. На ўвесь Слонімскі павет быў адзін На-

родны дом, які напамінаў хутчэй хлеў, чым культурную ўстанову. Зараз адкрыты клубы і чытальні, якія насельніцтва наведвае з вялікаю ахвотай. У час выступленняў хора імені Пятніцкага колькасць жадаючых паслухаць канцэрт даходзіла да некалькіх тысяч, а памяшканне Народнага дома магло ўмясціць толькі 300-350 чалавек. Вось чаму яго неабходна зараз расшырыць і пераабсталяваць, а так сама [illegible] аб арганізацыі клубаў, чытален, дамоў соцкультуры ў валасцях і вёсках.

Часовае ўпраўленне ўпэўнена, што пры брацкай дапамозе працоўных шчаслівай Совецкай Беларусі яно здолее вырашыць усе злабадзённыя жыццёвыя пытанні гаспадарчага і культурнага характару.

Працоўныя Слонімскага павета, як роўнапраўныя грамадзяне вялікага Совецкага Саюза, у брацкім яднанні з народамі Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, ідуць смела ўперад да новага шчаслівага жыцця пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

І. Саладкоў

Палкі барацьбіт за справу Леніна—Сталіна

Памяці С. М. Кірава

1 снежня 1934 года ў Ленінградзе, ў Смольным, загінуў ад [illegible] [illegible] Леніна—Сталіна Сергей Міронавіч Кіраў. Прайшло пяць год з таго [illegible] калі рабочыя і ўсе працоўныя нашай [illegible] радзімы бы[illegible] ўзрушаны жалобнаю весткай аб [illegible] вогненнага трыбуна большэвізма, сапатні[illegible] [illegible] вецтва—таварыша Сталіна, якім з'яў[illegible] Серг[illegible]

Яго гераічнае жыцце было [illegible] раломнымі зладзеямі, труслівымі забойцамі з а[illegible] рэвалюцыйных трацкісцка-зіноўеўскіх, бухарын[illegible] нікаў. Не стала аднаго з самых слаўных кіраўнікоў нашай ленінска-сталінскай партыі, не стала аднаго з самых светлых, [illegible] самых бе[illegible] Сталіна, [illegible] пера[illegible]могу камун[illegible]

«Таварыш Кіраў прадс[illegible] сабой ўзор больш[illegible] шага страху і цяжкасцей у [illegible] партыяй. Яго прамата, жалезная стойкасць, яго [illegible] натхнёнага трыбуна рэвалюцыі сп[illegible] і мяккасцю ў асабістых таварыскіх [illegible] мяністай цеплыней і скромнасцю, [illegible] нінцу»—так пісаў у сваім жалобным пісьме таварыш Сталін і яго самыя блізкія са[illegible]

Сергей Міронавіч Кіраў з'яўляўся крыштальна чыстым [illegible] стойкім ленінцам-сталінцам, выхаваным і вырашчаным наш[illegible] віцкай партыяй. Ён быў увасабленнем прафесіянала-б[illegible] свята захоўваў у любой абстаноўцы вялікае званне члена [illegible] най партыі. Ён быў сапраўдным арганізатарам і важаком наишырэйшых працоўны[illegible] іх барацьбе за дыктатуру рабочага класа, у іх барацьбе за [illegible]мф ком[illegible]

30 год с[illegible]мага жыцця [illegible] Кіра[illegible] рабочаму клас[illegible] прыкладзе гэта[illegible] жыцця бу[illegible]

Яшчэ ў [illegible] ве, у далекай глушы, кул[illegible] лаў рэвалюцыян[illegible] у ім былі запалены перш[illegible] най мыс[illegible] і ў рэвалюцыі 1905 года, ў [illegible] зняволення, у перыяд глухой рэакцыі, і ў баях за [illegible] Кастрычніцкай социялістычнай рэвалюцыі ў 1917 год[illegible] мадзянскай вайны—на Паўночным Каўказе, пад Астра[illegible] і ў гранітнай цытадэлі пралетарскай [illegible]

усюды Сергей Міронавіч Кіраў у вялікіх і малых справах умеу увасабляць у жыццё лепшыя якасці сына бальшэвіцкай партыі, партыі Леніна—Сталіна.

Таварыш Кіраў глыбока любіў партыйную работу і аддаваў ёй усе свае сілы, усе сваё каштоўнае жыццё. Ён горача, страсна любіў і абераагу нашу партыю, нястомна змагаўся за чыстату і умацаванне яе радоў, за іх ідэйна-палітычную ўзброенасць і боездольнасць, за бальшэвіцкае адзінства і маналітную згуртаванасць.

Надаючы велізарнае значэнне пытанням марксісцка-ленінскай тэорыі, ён прымаў актыўны [illegible] распрацоўцы раду тэарэтычных праблем (пытанні вывучэння гісторыі СССР і іншыя).

> Гісторыя бальшэвізма,—гаварыў тав. Кіраў у сваім дакладзе ў студзені 1932 года на IV Ленінградскай аб'яднанай абласной і гарадской канферэнцыі ВКП(б),—баявая зброя міжнароднага пралетарыята у барацьбе за комунізм, непераможная зброя рабочага класа СССР у будаўніцтве соцыялізма. Гісторыя нашай партыі вучыць таму, як вызваляць працоўных ад гнёту капіта[illegible] [illegible] дыктатуру рабочага класа.
>
> Гісторыя нашай комуністычнай партыі ёсць гісторыя пабеданоснай пралетарскай рэвалюцыі і будаўніцтва соцыялізма. Кожная старонка, кожны радок гісторыі нашай партыі—гэта не проста хроніка падзей, гэта велізарная глыбокая навука, не ведаючы якой нельга рабіць пралетарскую рэвалюцыю».

Выхаваны вялікімі ідэямі Маркса, Энгельса, Леніна і Сталіна, таварыш Кіраў умеў далёка глядзець уперад, у будучае, ясна бачыў перспектыву нашага развіцця, умеу правільна, па-бальшэвіцку рашаць [illegible] задачы партыйнай і гаспадарчай работы.

[illegible] раў заўседы удзяляў выключную увагу пытанням ідэйна[illegible] выхавання комуністаў, авалодання членамі і кандыдатамі партыі марксісцка-ленінскай тэорыяй. Ён бачыў у гэтым сро[illegible] вання жалезнага адзінства радоў партыі, ключ да пасп[illegible] шэння стаячых перад [illegible].

У сваёй выдатнай прамове на XVII з'ездзе ВКП(б) [illegible] гаварыў:

> Я думаю, што ўсякую навуку, у тым ліку і тэхніку і механіку, мы павінны узнімаць на такую вышыню, якая недаступна капіталістычным краінам. Гэта зусім правільна. Скажам, навука аб супраціўленні матэрыялаў—гэта вельмі неабходная на[illegible]. Але мы ні на адну мінуту не павінны забываць, што мы [illegible] у такой абстаноўцы, калі тая навука, [illegible]я вывучае супраціўленне процістаячых нам класаў унутры краіны і за яе межамі гэта навука павінна займаць першае месца.

[illegible]тыя выдатныя словы [illegible] наша партыя ва усю шыр[illegible] [illegible]дыі задачу—авалодаць рэвалюцыйнай тэорыяй мар[illegible]нізма.

Таварыш Кіраў глыбока разумеў мабілізуючую [illegible]раючую і арганізуючую сілу рэвалюцыйнай тэорыі, [illegible] заклікаў членаў партыі да авалода[illegible].

Выключна многа энергіі і сіл, многа [illegible]канай работы, многа бяссонных начэй аддаў Сергей Міронавіч справе умацавання магутнасці нашай доблеснай Чырвонай Арміі і Чырвонага Флота, умацавання абароны горада Леніна і усяго Савецкага Саюза. Тав. Кі-

раў меў усе падставы заявіць на V абласной і II гарадской Ленінградскай партканферэнцыі ў студзені 1934 года:

> «Няхай ведаюць усе, хто хоча папраўляць свае безнадзейныя справы за кошт Совецкага Саюза, што мы здолеем арганізаваць поўны разгром праціўніка на фронце».

Агалцелая зграя фінскіх бандытаў—ланцужных псоў англійскага і французскага імперыялізма -бесперапынна рыхтавала шэраг антысовецкіх ваенных правакацый і, урэшце, увергла Фінляндыю ў злачынную вайну супроць Совецкага Саюза—вялікага друга фінляндскага народа. Але народ Фінляндыі не жадае вайны, ён хоча жыць мірна, у дружбе з вялікім суседам—Совецкім Саюзам.

Наша доблесная Чырвоная Армія яшчэ раз паказала сваю несакрушальную магутнасць, яшчэ раз выканала сваю вялікую вызваленчую місію. Народныя масы Фінляндыі з велізарным энтузіязмам сустракаюць і вітаюць доблесную непераможную Чырвоную Армію. Фінляндскі народ добра ведае, што Чырвоная Армія ідзе ў Фінляндыю не як заваёўнік, а як друг і вызваліцель працоўнага народа ад гнету капіталістаў і памешчыкаў.

Створаны па волі фінскага народа сапраўдны народны ўрад сфарміраваў Першы фінскі корпус і запрасіў урад СССР аказаць Фінляндскай дэмакратычнай рэспублікі неабходнае садзеянне сіламі Чырвонай Арміі. Наша доблесная Чырвоная Армія разам з працоўнымі масамі фінляндскага народа разгроміць белагвардзейскую зграю і забяспечыць незалежнасць і безапаснасць Фінляндыі шляхам устанаўлення дружаственных адносін з Совецкім Саюзам, забяспечыць назаўсёды безапаснасць горада Леніна—калыбелі пролетарскай рэвалюцыі.

Многа ўвагі і клопату ўдзяляў тав. Кіраў большэвіцкай барацьбе за ўмацаванне соцыялістычнай дзяржавы.

> «Без усямернага ўмацавання Советаў, асноўнага рычага дыктатуры пролетарыята, гаварыў ён,—нельга зламаць супраціўленне гінучых капіталістычных элементаў, нельга адстаяць совецкую краіну супроць міжнароднага імперыялізма... Нельга пабудаваць бяскласавае соцыялістычнае грамадства. Умацаванне дыктатуры пролетарыята, узмацненне кіруючай ролі рабочага класа—важнейшы залог нашых новых перамог».

Непахісны, адданы большэвік, ленінец-сталінец, Сергей Міронавіч з выключнай любоўю і адданасцю гаварыў аб правадыру партыі і народа—таварышу Сталіне:

> «Цяжка ўявіць сабе фігуру гэтага гіганта, якім з'яўляецца Сталін. За апошнія годы, з таго часу, калі мы працавалі без Леніна, мы не ведалі ні аднаго павароту ў нашай рабоце, ні аднаго колькі-небудзь буйнага пачынання, лозунга, напрамку ў нашай палітыцы, аўтарам якога быў-бы не таварыш Сталін, а хто-небудзь іншы. Уся асноўная работа—гэта павінна ведаць партыя—праходзіць па ўказаннях, па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна. Самыя вялікія пытанні міжнароднай палітыкі рашаюцца па яго ўказанню, і не толькі гэтыя вялікія пытанні, як, здавалася-б, трэцеступенныя і нават дзесяціступенныя пытанні цікавяць яго, калі яны датычаць рабочых, сялян і ўсіх працоўных нашай краіны..

Магутная воля, каласальны арганізатарскі талент гэтага чалавека забяспечвае партыі своечасовае правядзенне вялікіх гістарычных паваротаў, звязаных з пабеданосным будаўніцтвам **сацыялізма».**

Выключную ролю адыграў Сергей Міронавіч у барацьбе ленінградскіх большэвікоў за перамогу социялізма. Пад яго непасрэдным кіраўніцтвам праведзена карэнная рэканструкцыя ленінградскай прамысловасці і пераабсталяванне Ленінграда ва ўзорны социялістычны горад. Пад непасрэдным кіраўніцтвам таварыша Кірава ажыццяўлялася ў Ленінградскай вобласці, на аснове суцэльнай калектывізацыі, ліквідацыя кулацтва як класа

Сергей Міронавіч Кіраў быў настаўнікам, другам і любімцам найшырэйшых мас рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі і дзяцей. Совецкі народ бачыў у ім свайго [illegible] правадыра партыі. Тым ненавісней яго імя было для ўсіх ворагаў рэволюцыі, тым лютрэй яго ненавідзелі трацкісцка-бухарынскія выралкі. Іх контррэволюцыйныя прошукі так майстэрскі, так метка, нагалаву разбіваў таварыш Кіраў.

Поспехі социялізма ў нашай краіне прыводзілі ў шаленства падгалоскаў разбітых класаў—рэшткі бухарынцаў і трацкістаў.

> «Гэтыя паны расцэньвалі дасягненні рабочых і калгаснікаў не з пункту гледжання інтарэсаў народа, які вітаў кожнае такое дасягненне, а з пункту гледжання інтарэсаў сваёй жалкай, адарванай ад жыцця і наскрозь прагніўшай фракцыйнай групы. Паколькі поспехі социялізма ў нашай краіне азначалі перамогу палітыкі партыі і канчатковы правал палітыкі гэтых паноў, то яны, замест таго, каб прызнаць відавочныя факты і ўключыцца ў агульную справу, сталі помсціць партыі і народу за свае няўдачы, за свой правал, сталі пакасціць і шкодзіць справе рабочых і калгаснікаў, узрываць шахты, падпальваць заводы, шкодзіць у калгасах і соўгасах,—каб сарваць дасягненні рабочых і калгаснікаў і выклікаць у народзе нездаволенне Совецкай уладай. А каб уберагчы пры гэтым сваю жалкую групу ад выкрыцця і разгрому, яны накінулі на сябе маску адданых партыі людзей, сталі ўсё больш і больш лісліваць перад партыяй, славасловіць партыю, прасмыкацца перад ёю, праладжаючы на справе сваю скрытую ад вачэй падрыўную дзейнасць супроць рабочых і сялян» *).

Азлобленыя перамогай социялістычнага будаўніцтва, напоўненыя лютай звярынай нянавісцю да вялікага совецкага народа трацкісцка-бухарынскія мярзотнікі ішлі на самыя нізкія і каварныя злачынствы, каб падарваць гаспадарчую і абаронную магутнасць нашай социялістычнай радзімы, каб спыніць трыумфальнае шэствіе социялізма, каб вярнуць ненавіснае капіталістычнае рабства, каб сарваць велізарны ўздым матэрыяльнага і культурнага ўзроўню працоўных, бесперапынны рост іх заможнага і культурнага жыцця. Прадаўшыяся замежным разведкам, трацкісцка-бухарынскія шпіены і забойцы гандлявалі нашай зямлёй, нашай незалежнасцю і свабодай.

Агідныя каты, подлыя іезуіты, яны арганізавалі і ажыццявілі самымі гнуснымі сродкамі забойства крышталына-чыстых, непахісных большэвікоў В. В. Куйбышэва і В. Р. Менжынскага і вялікага совец-

*) „Кароткі курэ гісторыі ВКП(б)“, стар. 306—307.

кага пісьменніка, генія рускага народа А. М. Горкага, яны-ж учынілі злоснае забойства палкага трыбуна пролетарскай рэволюцыі, незабыўнага С. М. Кірава. Яны падрыхтоўвалі забойства нашага любімага правадыра і настаўніка вялікага Сталіна і яго верных саратнікаў, любімцаў партыі і народа таварышоў Молатава, Кагановіча і Варашылава.

Зладзейскі выстрал у таварыша Кірава глыбокім болем і гневам адазваўся ў сэрцах працоўных нашай краіны і ўсяго свету. Ён узняў ярасць і нянавісць народа супроць наймітаў замежных разведак — злейшых здраднікаў радзіме—трацкісцка-бухарынскай банды забойц, шпіёнаў, дыверсантаў. На выстрал гэтых бандытаў, на іх спробы спыніць [illegible] ход гісторыі, якую твораць працоўныя нашай краіны пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі, народы СССР адказалі сакрушальным ударам, грозна напамінаючым трацкісцка-бухарынскім паслянцам і ўсім ворагам народа аб тым, што ўсякі, хто паспрабуе падарваць будаўніцтва новага грамадства, знішчыць заваяванае шчасце шматмільённага народа, будзе бязлітасна раздушан і, як нечысць, скінут з гістарычнага шляху, па якому вядзе народы СССР таварыш Сталін.

Куля трацкісцка-бухарынскіх бандытаў спыніла страсна жадаўшае жыць і змагацца сэрца Сергея Міронавіча. Гэты выстрал быў выражэннем звярынай злобы і адчаю пацярпеўшых паражэнне класавых ворагаў. Але ім не удалося і ніколі не ўдасца пагубіць тую справу, за якую змагаўся і аддаў сваё жыццё таварыш Кіраў. Большэвіцкія рады не дрогнулі. Партыя яшчэ мацней самкнулася вакол свайго Цэнтральнага Камітэта, вакол таварыша Сталіна.

Гадавіна смерці тав. Кірава, асвяжаючы ў нашай памяці роднае аблічча Сергея Міронавіча, напамінае нам аб неабходнасці весці бязлітасную барацьбу з ворагамі народа, аб неабходнасці павышаць нашу рэволюцыйную пільнасць, аб неабходнасці змагацца за завяршэнне той справы, за якую змагаўся і загінуў тав. Кіраў.

Нашы перамогі—лепшы помнік тав. Кіраву. Няхай яшчэ лепш і хутчэй працуюць нашы станкі, трактары і камбайны. Няхай яшчэ больш арганізаванай і ўшчыльненай стане наша праца. Няхай мацнее і шырыцца сацыялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі. Няхай яшчэ ярчэй гарыць наша нянавісць, большэвіцкая пільнасць і непрымірымасць да ворагаў.

XVIII гістарычны з'езд ВКП(б) з усёй сілай падкрэсліў:

> «Для ажыццяўлення задач трэцяй пяцігодкі неабходна поўнасцю ліквідаваць вынікі контррэволюцыйнага шкодніцтва, шпіёна-трацкісцка-бухарынскіх агентаў фашызма і замежнага капітала, узняць большэвіцкую пільнасць ва ўсёй рабоце па будаўніцтву комунізма і заўсёды памятаць указанне партыі аб тым, што пакуль існуе знешняе капіталістычнае акружэнне, разведкі замежных дзяржаў будуць засылаць да нас шкоднікаў, дыверсантаў, шпіёнаў і забойц, каб псаваць, пакасціць і аслабляць нашу краіну, каб перашкаджаць росту комунізма ў СССР» *).

Сергей Міронавіч Кіраў, чыё вялікае сэрца ўмяшчала энергію, барацьбу і радасць многамільённага Совецкага народа, чыя воля была непадзельна спаяна з непахіснаю воляй партыі Леніна—Сталіна, якая вядзе народ да комунізма, будзе жыць у стагоддзях.

*) Стэнаграф. справаздача XVIII з'езда ВКП(б). стар. 666.

Кожная новая перамога ў будаўніцтве соцыялістычнага грамадства гэта працяг жыцця нястомнага, жыццерадаснага і адданага чалавека, імя якому—Кіраў.

Совецкі народ, як сказаў аб Кіраве тав. Жданаў, «свята ўшаноўвае памяць таго, хто аддаў усё сваё жыццё без астатку за трыумф ідэй Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна. Яго светлы вобраз будзе заўседы прыкладам для працоўных, і памяць аб ім не пагасне навекі».

Слаўнае жыццё С. М. Кірава вучыць нас неабходнасці ўсямерна павышаць большэвіцкую пільнасць, быць бязлітаснымі да трацкістаў, зіноўеўцаў, бухарынцаў, буржуазных нацыяналістаў—гэтых заклятых ворагаў партыі і народа, яно вучыць большэвіцкай непрымірымасці да малейшага адхілення ад марксізма-ленінізма, яно служыць прыкладам таго, як можна і неабходна спалучаць у сабе глыбокія веды марксізма-ленінізма са здольнасцямі арганізатара і кіраўніка.

Сапраўдная рэволюцыйная пільнасць—гэта важнейшая якасць большэвіка—павінна падмацоўвацца яго ідэйнай узброенасцю: веданнем законаў грамадскага развіцця і класавай барацьбы, веданнем усіх подлых прыёмаў, якія ужывалі ворагі ў барацьбе супроць партыі Леніна—Сталіна.

Таварыш Сталін не раз папярэджваў, што пакуль існуе капіталістычнае акружэнне, замежныя разведкі будуць засылаць да нас шпіёнаў, дыверсантаў, шкоднікаў і забойцаў. Таварыш Сталін указвае на неабходнасць усямерна умацоўваць Чырвоную Армію і Чырвоны Ваенна-Марскі Флот, пастаянна трымаць увесь наш народ у стане баявой мабілізацыйнай гатоўнасці, павышаць большэвіцкую пільнасць.

У сваім пісьме да арганізацый партыі, выданым у сувязі са зладзейскім забойствам таварыша Кірава, Цэнтральны Камітэт ВКП(б) указваў, што «не благадушша патрэбна нам, а пільнасць, сапраўдная большэвіцкая рэволюцыйная пільнасць. Трэба памятаць, што чым безнадзейней становіцца ворагаў, тым ахвотней яны будуць хватацца за «крайні сродак», як адзіны сродак асуджаных у іх барацьбе з Совецкай уладай. Трэба памятаць гэта і быць пільнымі» *)

Глыбокае веданне і разуменне гісторыі нашай большэвіцкай партыі партыйнымі і непартыйнымі большэвікамі паскарае пераможны рух да комунізма і з'яўляецца важнейшым сродкам павышэння рэволюцыйнай большэвіцкай пільнасці.

Выдатны рэволюцыянер, палкі змагар за вучэнне і справу Леніна—Сталіна, таварыш Кіраў бязлітасна грамаў ворагаў соцыялізма. Зладзейскі ўчынак трацкісцка-бухарынскіх бандытаў вырваў з нашых радоў палкага народнага трыбуна, непахіснага змагара за комунізм—С. М. Кірава. Ворагі панеслі заслужаную кару—яны былі знішчаны Совецкі народ, моцны сваім маральна-палітычным адзінствам, сваей згуртаванасцю вакол большэвіцкай партыі і совецкага ўрада, вакол свайго правадыра і друга вялікага Сталіна, давядзе да пераможнага канца справу, за якую усё сваё жыццё змагаўся таварыш Кіраў.

Совецкі народ пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі, пад вадзіцельствам мудрага правадыра таварыша Сталіна ідзе да поўнай перамогі комунізма. Гэта мэта, у якую так моцна верыў і за якую ўсё сваё жыццё змагаўся тав. Кіраў, немінуча будзе ажыццёўлена ў нашай краіне і ва ўсім свеце.

---

*) Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», стар. 309.

КАНСУЛЬТАЦЫІ

Я. Стэрнін

Вучэнне Леніна—Сталіна аб Советах

Вучэнне Леніна—Сталіна аб Советах [illegible]ляецца велізарнейшым творчым укладам у скарбніцу марксізма-[illegible]зма, вынікам геніяльнага абагульнення багацейшага вопыту трох рускіх рэвалюцый і [illegible] новага, што дало пасля смерці вялікіх асно[illegible] навуковага соцыялізма Маркса і Энгельса развіццё капіталізма і рабочы рух ва ўсім свеце.

Вучэнне Леніна—Сталіна аб Советах, як адзіна магчымай [illegible] дзяржаўнай форме [illegible]тытуры пролетарыята, паказвае магутную [illegible]лу ленінска-ста[illegible] прадбачання і неацанімае значэнне марксісцка-ленінскай тэорыі, як [illegible], апіраючыся на вопыт рэволюцыйных мас, асвятляе, як пражэктар, шляхі барацьбы рабочага класа за перамогу комунізма.

Сіла марксісцка-[illegible]й навукі аб развіцці грамадства, аб про[illegible] рэволюцыі і [illegible] ўнштве комунізма заключаецца ў тым, што яна безупынна развіваецца і [illegible]асканальваецца, узбагачаючыся [illegible]ім развіцці новым вопытам барацьбы рабочых мас, новымі [illegible]мі. Яна дазваляе вызначаць не толькі тое, як і куды развіваюцца [illegible]зеі ў сучасным, але і тое, як і куды яны павінны развівацца ў [illegible]учым, дае магчымасць прадбачыць ход падзей.

Вучэнне Леніна—Сталіна аб Советах, як адзіна магчымай дзяржаўнай форме дыктатуры пролетарыята і тыпе новай, вышэйшай пролетарскай дэмакратыі, бліскуча пацверджана перамогай соцыялізма і трыумфам пролетарскай дэмакратыі на адной шостай частцы зямнога шара. У ленінска-сталінскім вучэнні аб Советах выражана магутная сіла марксісцка-ленінскага навуковага прадбачання, якое апіраецца на творчы вопыт рэволюцыйных мас, вялікая сіла кіраўніцтва большэвіцкай партыі, геніяльная празарлівасць вялікіх правадыроў і стратэгаў, горных арлоў пролетарскай рэволюцыі Леніна і Сталіна.

* * *

Вялікія асновапаложнікі навуковага соцыялізма—Маркс і Энгельс памерлі задоўга да таго, як творчая ініцыятыва рабочага класа Расіі нарадзіла ў агні [illegible] рэволюцыі [illegible] года [illegible]вую, [illegible] ў свеце палітычную арганізацыю рабочага класа Советы рабочых дэпутатаў.

Маркс, развіваючы ў сваіх працах вялікую ідэю рэволюцыйнага марксізма,—ідэю дыктатуры пролетарыята, не мог указаць той канкрэтнай палітычнай формы, у рамках якой будзе здзейснена вызваленне рабочага класа і поўная перамога соцыялізма.

Маркс пісаў у 1875 годзе:

> «Паміж капіталістычным і комуністычным грамадствам ляжыць перыяд рэволюцыйнага ператварэння першага ў другое. Гэтаму перыяду адпавядае і палітычны пераходны перыяд, і дзяржава гэтага перыяда не можа быць нічым іншым, акрамя як рэволюцыйнай дыктатурай пролетарыята».

Указанне Маркса ў 70-х годах аб тым, што найбольш мэтазгоднаю формай яе з'яўляецца палітычная арганізацыя тыпу Парыжскай Комуны, не атрымала, нажаль, далейшага развіцця ў яго працах і было забыта.

Энгельс у 1891 годзе ў крытыцы праекта Эрфурцкай праграмы заявіў, што «дэмакратычная рэспубліка... з'яўляецца... спецыфічнаю формай для дыктатуры пролетарыята». Грунтуючыся на гэтым палажэнні Энгельса, марксісты ўсіх краін лічылі да 1917 года лепшай палітычнай формай у пераходны перыяд ад капіталізма да комунізма парламенцкую дэмакратычную рэспубліку.

Развіваючы марксізм у новых умовах эпохі імперыялізма і пролетарскіх рэволюцый, вывучаўшы вопыт рэволюцыйнай творчасці рабочага класа Расіі ў 1905 і 1917 годах, навукова абагуліўшы багацейшы вопыт рабочага руху ад Парыжскай Комуны 1871 года да другой рускай рэволюцыі 1917 года, вялікі правадыр і тэарэтык рэволюцыйнага марксізма, бацька нашай партыі Уладзімір Ільіч Ленін зрабіў велізарнейшы ўклад у сусветную скарбніцу марксізма, адкрыўшы Совецкую ўладу, як найбольш мэтазгодную форму палітычнай арганізацыі грамадства ў пераходны перыяд ад капіталізма да соцыялізма.

Развіваючы марксісцкую тэорыю на аснове вопыту рускіх рэволюцый 1905 і 1917 гг., Ленін з геніяльнай празарлівасцю, з велізарнейшай сілай творчага марксізма высунуў у 1917 годзе лозунг арганізацыі рэспублікі Советаў, як лепшай палітычнай формы дыктатуры пролетарыята. У сваіх славутых «Красавіцкіх тэзісах» Ленін пісаў:

> «Не парламентарная рэспубліка,—зварот да яе ад С. Р. Д. было-б крокам назад,—а рэспубліка Советаў Рабочых, Батрацкіх і Сялянскіх Дэпутатаў па ўсёй краіне, знізу да верху» *).

Калі Парыжская Комуна, аб якой гаварыў Маркс, была зародкам палітычнай формы дыктатуры пролетарыята, то Совецкая ўлада, уцверджаная пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі і вялікіх правадыроў Леніна і Сталіна перамогшым пролетарыятам у 1917 годзе, з'яўляецца развіццём і завяршэннем палітычнай формы дыктатуры пролетарыята. Рэспубліка Советаў, як указваў Ленін, з'яўляецца «адзінай формай, здольнай забяспечыць найбольш бязбольны пераход да соцыялізма».

Совецкая ўлада з'яўляецца новай формай дзяржаўнай арганізацыі ў перыяд пераходу ад капіталізма да соцыялізма, прынцыпова адметнай ад старой буржуазна-дэмакратычнай і парламентарнай формы; новым тыпам дзяржавы, якая адпавядае задачам поўнага вызвалення працоўных ад усякага гнету і эксплаатацыі, задачам дыктатуры пролетарыята, задачам пабудовы новага, комуністычнага грамадства.

---

*) Ленін, т. XX, стар. 88.

Перамога Совецкай улады азначае карэнны паварот, пераломны момант у сусветнай гісторыі.

> «Эпоха буржуазна-дэмакратычнага парламентарызма скончылася, пачаўся новы раздзел сусветнай гісторыі: эпоха пролетарскай дыктатуры» (Ленін).

Ленін у баях з ворагамі развіў вялікае вучэнне Маркса і Энгельса аб пролетарскай дыктатуры, ён унёс каштоўнейшы ўклад у скарбніцу марксізма, адкрыўшы дзяржаўную форму дыктатуры пролетарыята— Совецкую ўладу.

У «Каротнім курсе гісторыі ВКП(б)» гаворыцца:

> «Што было-б з партыяй, з нашай рэволюцыяй, з марксізмам, калі-б Ленін спасаваў перад буквай марксізма і не рашыўся замяніць адно з старых палажэнняў марксізма, сфармуляванае Энгельсам, новым палажэннем аб рэспубліцы Советаў, адпавядаючым новай гістарычнай абстаноўцы? Партыя блукала-б у пацёмках, Советы былі-б дэзарганізаваны, мы не мелі-б Совецкай улады, марксісцкая тэорыя пацярпела-б сур'ёзны урон. Прайграў-бы пролетарыят, выйгралі-б ворагі пролетарыята» [*]).

Ленін і Сталін разграмілі ворагаў рэволюцыі—меншавікоў, эсэраў, трацкістаў і бухарынцаў, выступаўшых за захаванне буржуазна-ка-[illegible]тычнай дзяржавы, змагаўшыхся супроць Кастрычніцкай рэволюцыі і дыктатуры пролетарыята, ярасна атакаваўшых ідэю Совецкай улады і самую Совецкую ўладу.

Ленін і Сталін, як велізарнейшыя тэарэтыкі творчага навуковага марксізма, не толькі адстаялі супроць усіх ворагаў вялікія ідэі Маркса і Энгельса, але і развілі далей марксісцка-ленінскую навуку, даўшы міжнароднаму пролетарыяту і ўсяму чалавецтву вялікую ідэю Советаў, як дзяржаўную форму дыктатуры пролетарыята, увасобіўшы гэту вялікую ідэю ў жыццё, узброіўшы рабочы клас усяго свету багацейшым вопытам пераможнай соцыялістычнай рэволюцыі ў СССР, вопытам перамогі соцыялізма і трыумфа пролетарскай дэмакратыі ў краіне Советаў.

Велічным дакументам, завяршаючым гіганцкую гістарычную эпоху [illegible] соцыялізма ў нашай краіне, з'яўляецца Сталінская Канстытуцыя, якая стала маяком, светачам вызвалення для ўсяго прыгнечанага чалавецтва.

У гістарычным дакладзе таварыша Сталіна на XVIII з'ездзе партыі мы бачым далейшае геніяльнае развіццё марксісцка-ленінскага вучэння аб дыктатуры пролетарыята, аб совецкай дзяржаве, аб функцыях, задачах і з'месце работы соцыялістычнай дзяржавы ў перыяд паступовага пераходу ад соцыялізма да комунізма.

Таварыш Сталін узброіў большэвіцкую партыю і рабочы клас Совецкага Саюза яснай і чоткай перспектывай далейшага руху ўперад да поўнай перамогі комунізма.

*

Советы ўпершыню ўзніклі ў ходзе першай рускай рэволюцыі 1905 года. Тады ў радзе буйных гарадоў і амаль ва ўсіх рабочых цэнтрах па ініцыятыве рэволюцыйных мас ствараліся Советы рабочых дэпутатаў, у радзе месц былі створаны Советы рабочых і сялянскіх дэпутатаў, Советы салдацкіх і матроскіх дэпутатаў. Советы ўстанаўлі-

[*]) „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)", стар. 337.

валі 8-гадзінны рабочы дзень, ажыццяўлялі свабоду друку, арыштоўвалі агентаў царскага ўрада, канфіскавалі на патрэбы рэвалюцыі грошы царызма.

Адным з першых быў Совет, створаны рабочымі летам 1905 г. у Іванаве. У снежаньскія дні 1905 г. Совет у Маскве стаў органам узброенага паўстання. У радзе гарадоў Советы дзейнічалі тады як органы паўстання, як зачаткавыя формы рэвалюцыйнай улады. Толькі ў Пецярбургу, дзе на кіраўніцтва Советам прабраліся меншавікі на чале з подлым здраднікам Іудай-Троцкім, Совет не выканаў сваіх задач. Ён адмоўна аднёсся да ўзброенага паўстання і не аказаў падтрымання геранічнай барацьбе пролетарыята Масквы.

Меншавікі прабавалі ўсяляк прынізіць Советы, зводзячы іх функцыі да ролі маленькіх самакіраўнічых, накшталт дэмакратызаваных гарадскіх упраў. Толькі кіруемая вялікімі правадырамі пролетарскай рэвалюцыі Леніным і Сталіным партыя большавікоў умела правільна ацаніць гэту выдатную творчую ініцыятыву рэвалюцыйных мас.

Уплыў Советаў быў велізарны і пасля паражэння рэвалюцыі 1905 года ідэя Советаў засталася жыць у свядомасці рабочых мас. І ў першыя-ж дні лютаўскай рэвалюцыі 1917 года паўстаўшыя рабочыя і салдаты стварылі Советы рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Важна адзначыць, што калі ў 1905 годзе ствараліся Советы рабочых дэпутатаў, то ў лютым 1917 года, па ініцыятыве большэвікоў, паусямесна пачалі ствараць Советы рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

Пасылаючы сваіх прадстаўнікоў, рэвалюцыйны народ глядзеў на Советы, як на органы народнай улады. У Советах рабочых і салдацкіх дэпутатаў ужо тады ўвасаблялася ідэя ўлады пролетарыята і сялянства. Але рэвалюцыйныя масы яшчэ не былі спрактыкаваны ў палітыцы. Яны даверыліся дробна-буржуазным партыям меншавікоў і эсэраў, якіх у Советах аказалася спачатку большасць. Эсэра-меншавіцкае кіраўніцтва Советаў перадало добраахвотна ўладу буржуазіі.

Атрымалася двоеўладдзе, своеасаблівае пераплятанне двух дыктатур: дыктатуры буржуазіі ў асобе Часовага ўрада і дыктатуры пролетарыята і сялянства ў асобе Советаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

У красавіку 1917 года, пасля доўгай эміграцыі, вярнуўся з-за граніцы правадыр партыі Ленін. У сваіх славутых «Красавіцкіх тэзісах» ён даў партыі і рабочаму класу геніяльны план барацьбы за пераход ад буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі да рэвалюцыі сацыялістычнай. Трэба растлумачыць масам, указваў Ленін, што Совет рабочых дэпутатаў ёсць адзіна магчымая форма рэвалюцыйнага ўрада. Ленін паставіў задачу пераходу ўсёй дзяржаўнай улады да Советаў рабочых дэпутатаў. Большэвіцкая партыя павінна была выкрыць здрадніцтва меншавікоў, эсэраў і іншых прыхваснеў буржуазіі, растлумачыць рэвалюцыйным масам, што для поўнай перамогі рэвалюцыі неабходна перадаць усю ўладу ў рукі Советаў. «Уся ўлада Советам!» такі лозунг высунуў Ленін на красавіцкай канферэнцыі нашай партыі, указаўшы ясны курс на падрыхтоўку сацыялістычнай рэвалюцыі.

Уся партыя большэвікоў адобрыла і падтрымала красавіцкія тэзісы Леніна, задачы барацьбы за ўладу Советаў, за перамогу сацыялістычнай рэвалюцыі. Толькі адзінкі, накшталт Каменева, Зіноўева, Рыкава, Пятакова, якія стаялі на меншавіцкіх пазіцыях заха-

вання капіталізма, захавання ўлады буржуазіі і буржуазнай рэспублікі, выступілі супроць Леніна і Сталіна. На красавіцкай канферэнцыі была выкрыта антыленінская пазіцыя гэтых адзінак, якія скаціліся потым у лагер подлых ворагаў рабочага класа.

Партыя цвёрда і аднадушна пайшла за Леніным і Сталіным Яна разгарнула работу па арганізацыі мас для заваявання ўлады Советаў, для перамогі соцыялістычнай рэволюцыі.

Пасля расстрэлу ліпеньскай дэманстрацыі ў Петраградзе закончыўся мірны перыяд рэволюцыі. Буржуазны Часовы ўрад, сканцэнтраваўшы ў сваіх руках усю ўладу, перайшоў у наступленне на рабочы клас і партыю большэвікоў. Здр[illegible] меншавікоў і эсэраў прывялі да таго, што Советы з эсэраўска-меншавіцкім кіраўніцтвам сталі прыдаткам буржуазнага ўрада.

Наша партыя часова зняла лозунг «Уся ўлада Советам». Аднак гэта ні ў якім разе не азначала адмаўлення ад барацьбы за ўладу Советаў, справа ішла толькі аб даных советах, з эсэра-меншавіцкім кіраўніцтвам.

Партыя большэвікоў на чале з Леніным і Сталіным цвёрда прымала курс на соцыялістычную рэволюцыю. На VI з'ездзе партыі таварыш Сталін, разбіваючы трацкісцкія выказванні Праабражэнскага, гаварыў:

> «Не выключана магчымасць, што іменна Расія з'явіцца краінай, пракладаючай шлях да соцыялізма... Трэба адкінуць аджыўшае ўяўленне аб тым, што толькі Еўропа можа ўказаць нам шлях. Існуе марксізм дагматычны і марксізм творчы. Я стаю на глебе апошняга»*).

Таварыш Сталін гаварыў, што трэба ўзяць уладу сілай, скінуўшы Часовы ўрад, што ўзяць уладу сілай можа толькі пралетарыят у саюзе з вясковай беднатой. Таварыш Сталін указаў, што рэволюцыя становіцца па свайму характару соцыялістычнай. VI з'езд партыі пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна нацэліў партыю на ўзброенае паўстанне, на соцыялістычную рэволюцыю.

Разгром карнілаўшчыны паказаў, што Советы рабочых і салдацкіх дэпутатаў, вызваляючыся ад здрадніцкага ўплыву меншавікоў і эсэраў, становяцца на шлях рэволюцыйнай барацьбы, што яны рашуча павярнулі да большэвікоў. Пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі рэволюцыйныя масы абаранілі рэволюцыю і разграмілі контррэволюцыйную карнілаўшчыну. У шырокіх масах горада і вёскі і ў саміх Советах нязмерна вырас уплыў большэвікоў. Разгарнулася паласа ўзнаўлення, большэвізацыі Советаў. Нарастаў новы ўздым рэволюцыі, і на чаргу дня зноў паўстаў лозунг—«Уся ўлада Советам!». Гэта ўжо не быў стары лозунг пераходу ўлады ў рукі Советаў, у якіх тады ў большасці былі меншавікі і эсэры. Гэта быў новы лозунг паўстання большэвіцкіх Советаў супроць буржуазнага Часовага ўрада. Гэта быў лозунг захопу ўлады Советамі, як органамі пралетарскай дыктатуры, якая кіравалася партыяй Леніна—Сталіна.

Пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна пераможнае узброенае паўстанне ў кастрычніку 1917 года ўцвердзіла ўладу Советаў.

На ўсей неабсяжнай краіне пачалося трыумфальнае шэсціе Совецкай улады.

---

*) Пратаколы VI з'езда РСДРП, стар. 233—234.

Советы, народжаныя ў агні першай рускай рэволюцыі 1905 года, былі правобразам Совецкай улады, якую пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна стварыў перамогшы пролетарыят у 1917 годзе.

> «Калі-б народная творчасць рускай рэволюцыі,—гаварыў Ленін,—прайшоўшая праз вялікі вопыт 1905 года, не стварыла Советаў яшчэ ў лютым 17-га года, то ні ў якім выпадку яны не маглі-б узяць уладу ў кастрычніку, паколькі поспех залежаў толькі ад наяўнасці ўжо гатовых арганізацыйных форм руху, ахапіўшага мільёны. Гэтай гатовай формай з'явіліся Советы...» *).

* * *

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя ўстанавіла дыктатуру пролетарыята, дзяржаўнаю формай якой з'явілася Совецкая улада.

Перамога дыктатуры пролетарыята азначала падаўленне буржуазіі, злом буржуазнай дзяржаўнай машыны, замену буржуазнай дэмакратыі новай, вышэйшай, пролетарскай дэмакратыяй. Трэба было ў першай фазе развіцця соцыялістычнай дзяржавы (перыяд ад Кастрычніцкай рэволюцыі да ліквідацыі эксплаататарскіх класаў) падавіць супраціўленне звергнутых эксплаататарскіх класаў, арганізаваць абарону Совецкай краіны ад нападзення інтэрвентаў і спроб рэстаўрацыі капіталізма, аднавіць прамысловасць і сельскую гаспадарку, падрыхтаваць умовы для ліквідацыі капіталістычных элементаў. Усямерна ўмацоўваючы саюз рабочага класа і сялянства, які з'яўляецца вышэйшым прынцыпам пролетарскай дыктатуры, Советы пад кіраўніцтвам партыі паспяхова вырашылі гэтыя задачы.

У сваёй класічнай рабоце «Аб асновах ленінізма» таварыш Сталін даў вычарпальнае азначэнне характэрных рыс Совецкай улады як новага тыпу дзяржавы, які забяспечвае поўнае вызваленне працоўных ад гнёту і эксплаатацыі, поўную перамогу соцыялізма.

Совецкая ўлада—найбольш масавая і найбольш дэмакратычная арганізацыя з усіх магчымых дзяржаўных арганізацый класавага грамадства. Совецкая ўлада, разрушаючы ўсякі нацыянальны гнёт і апіраючыся на супрацоўніцтва працоўных усіх нацыянальнасцей, з'яўляецца найбольш інтэрнацыяналісцкай, аблягчае аб'яднанне працоўных розных нацыянальнасцей у адзіным дзяржаўным саюзе. Совецкая ўлада па сваёй структуры аблягчае рабочаму класу, як найбольш згуртаванаму і найбольш свядомаму ядру Советаў, справу кіраўніцтва шырокімі масамі працоўных. Совецкая ўлада, разбіўшы і разбурыўшы канчаткова стары буржуазны дзяржаўны апарат, непасрэдна звязвае масы працоўных з новым дзяржаўным апаратам, вучыць іх справе кіравання дзяржавай. Совецкая ўлада ператварае армію са сродку прыгнечання ў сродак вызвалення народаў. Совецкая ўлада апіраецца на саюз рабочых і сялян, які з'яўляецца вышэйшым прынцыпам дыктатуры пролетарыята.

> «Советы ёсць прамое выражэнне дыктатуры пролетарыята. Праз Советы праходзяць усе і ўсякія мерапрыемствы па ўмацаванню дыктатуры і будаўніцтву соцыялізма. Праз Советы

*) Ленін, т. XXII, стар. 315.

ажыццяўляецца дзяржаўнае кіраўніцтва сялянствам з боку пролетарыята. Советы злучаюць мільённыя масы працоўных з авангардам пролетарыята» *).

Совецкая ўлада—адзіная ў свеце сапраўды народная і сапраўды дэмакратычная ўлада. У асобе Советаў быў створан новы тып дэмакратыі, пролетарскай дэмакратыі для працоўных.

> «Дэмакратыя ў капіталістычных краінах, дзе маюцца антаганістычныя класы, ёсць у канчатковым выніку дэмакратыя для сільных, дэмакратыя для маёмнай меншасці. Дэмакратыя у СССР, наадварот, ёсць дэмакратыя для працоўных, г. зн. дэмакратыя для усіх **).

Буржуазная дэмакратыя з'яўляецца формай дыктатуры буржуазіі. Канстытуцыі і буржуазныя законы буржуазна-дэмакратычных краін пабудаваны так, што працоўная большасць насельніцтва шляхам устанаўлення усякіх цэнзаў, абмежаванняў, агаворак фактычна пазбаўляецца магчымасці ўдзельнічаць у палітычным жыцці. «Сіла капітала—усе, біржа—усё, а парламент, выбары,—гэта марыянеткі, лялькі...» ***)

Совецкая ўлада заўсёды была нязмерна, «у мільён раз», па выражэнню Леніна, дэмакратычней любой буржуазна-дэмакратычнай рэспублікі, якая прыкрывае дыктатуру буржуазіі фігавым лістком фальшывай буржуазнай дэмакратыі. Увядзенне Сталінскай Канстытуцыі прывяло да расшырэння базы дыктатуры рабочага класа, якая ператварылася ў больш гібкую, а, стала быць, і больш моцную сістэму дзяржаўнага кіраўніцтва грамадствам; прывяло да найярчэйшага, [illegible] у гісторыі росквіту сапраўды усенароднай социялістычнай дэмакратыі. Новая Канстытуцыя СССР з'яўляецца адзінай у [illegible] канца дэмакратычнай канстытуцыяй.

У другой фазе развіцця социялістычнай дзяржавы (пасля [illegible] ліквідацыі капіталістычных элементаў горада і вёскі [illegible] перамогі социялістычнай сістэмы гаспадаркі і прыняцця новай Канстытуцыі СССР) Советы пад кіраўніцтвам партыі праводзяць [illegible] гаспадаркі, па ліквідацыі рэштак капіталістычных элементаў, па стварэнню магутнай сучаснай арміі для абароны СССР, па арганізацыі культурнай рэвалюцыі, па ўздыму матэрыяльнага і культурнага ўзроўню працоўных

Велічны гістарычны шлях перамог прайшлі за 22 гады пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна Советы.

Пад сцягам Советаў з адсталай, жабрацкай, непісьменнай наша краіна ператварылася [illegible] дзяржаву, у краіну передавой социялістычнай індустрыі, у краіну самага буйнага ў свеце социялістычнага земляробства, у краіну вышэйшай пісьменнасці і культуры, у краіну радаснага, шчаслівага, заможнага жыцця мільёнаў працоўных.

Совецкі Саюз—краіна перамогшага социялізма, краіна найярчэйшага росквіту новай, пролетарскай дэмакратыі.

У СССР знішчаны эксплаататарскія класы, знішчана і самая магчымасць эксплаатацыі чалавека чалавекам. Калі па Канстытуцыі

*) Сталін, „Пытанні ленінізма", стар. 119, выд. 11.
**) Там-жа, стар. 524.
***) Ленін, т. XXIV, стар. 376

РСФСР 1918 года пазбаўляліся выбарчых праў эксплаататарскія элементы, то цяпер гэтыя абмежаванні ўжо не патрэбны. Па Сталінскай Канстытуцыі ўстаноўлены ўсеагульныя, роўныя, прамыя і тайныя выбары ў Советы. Увесь совецкі народ удзельнічае ў выбарах Советаў дэпутатаў працоўных. У агульнай барацьбе за комунізм Советы яднаюць увесь народ—рабочых, сялян і совецкую інтэлігенцыю. У нашай краіне ўстаноўлены дружаственныя адносіны паміж двума класамі нашага грамадства—рабочым класам і сялянства. Створыўся і ўмацаваўся брацкі саюз усіх нацыянальнасцей. Велізарнейшае маральна-палітычнае адзінства нашага народа і совецкі патрыятызм з'яуляюцца магутнымі рухаючымі сіламі совецкага грамадства.

Рабочы клас, мільённыя масы працоўных, згуртаваныя вакол Советаў, дабіліся сусветна-гістарычных перамог толькі ў выніку кіраўніцтва вялікай і непераможнай партыі Леніна—Сталіна.

Асноўнай кіруючай сілай у сістэме дыктатуры пролетарыята заўсёды была, ёсць і будзе вялікая партыя Леніна—Сталіна, якой давярае і вакол якой згуртаваны ўвесь народ.

> «Без партыі, як асноўнай кіруючай сілы, немагчыма колькі-небудзь працяглая і моцная дыктатура пролетарыята» *).

Толькі большэвіцкая партыя, партыя новага тыпу, створаная, выкаваная і загартаваная вялікімі правадырамі Леніным і Сталіным, партыя, якая мае багаты вопыт трох рэволюцый і пераможнага соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР, магла і можа выканаць ролю асноўнага кіраўніка у сістэме дыктатуры пролетарыята, у барацьбе за комунізм. Толькі вялікая непераможная партыя, партыя Леніна—Сталіна, асвятляючая свой шлях рэволюцыйным вучэннем марксізма ленінізма, магла і можа быць прызнаным кіраўнікам, правадыром і настаўнікам народа.

Непераможнасць кіраўніцтва большэвіцкай партыі заключаецца ў тым, што яна правільна выражае тое, што народ усведамляе.

Непераможнасць большэвіцкага кіраўніцтва заключаецца ў тым, што партыя Леніна—Сталіна заўсёды цяснейшым чынам звязана з найшырэйшымі масамі працоўных.

Непераможнасць большэвіцкага кіраўніцтва заключаецца ў тым, што большэвіцкую партыю вядзе прадаўжальнік справы Леніна, правадыр і тэарэтык комунізма, [illegible] пролетарскай рэволюцыі вялікі Сталін, які ў баях супроць усіх ворагаў адстаяў марксісцка-ленінскую тэорыю і развівае яе далей, узбагачаючы гіганцкім вопытам соцыялістычнага будаўніцтва пасля смерці Леніна.

У прамове «Аб рабоце ў весцы» таварыш Сталін з [illegible] сілай марксісцка-ленінскай дыялектыкі паказаў значэнне кіраўніцтва большэвіцкай партыі работай Советаў.

Советы з'яўляюцца велізарнейшай заваёвай нашай рэволюцыі, заваёвай рабочага класа. Советы—соцыялістычная форма палітычнай арганізацыі. Аднак, усё залежыць ад таго, які змест будзе ўліт у гэту форму. Справа не толькі ў саміх Советах, але перш за ўсё ў тым, хто імі кіруе.

У ліпені 1917 года, калі Советамі кіравалі ў нас меншавікі і эсэры, Советы прыкрывалі контррэволюцыю супроць рэволюцыі. У канцы 1918 года, калі Советамі ў Германіі кіравалі соцыял-дэмакраты, гэтыя

*) Сталін „Пытанні ленінізма", стар 121 выд. 11.

Советы таксама прыкрывалі контррэволюцыю. У 1920 годзе ў часе Кранштацкага мецяжу глава рускай контррэволюцыі Мілюкоў выступіў з лозунгам «Советы без комуністаў».

Абагульняючы гэтыя гістарычныя факты, таварыш Сталін вучыць.

«...Справа не толькі ў Советах, як у форме арганізацыі, хоць сама гэта форма прадстаўляе найвялікшае рэволюцыйнае заваяванне. Справа, перш за ўсё, у змесце работы Советаў, справа ў характары работы Советаў, справа ў тым, хто іменна кіруе Советамі,—рэволюцыянеры ці контррэволюцыянеры» *).

Советы ў нашай краіне дабіліся сусветна-гістарычных перамог толькі таму, што іх работай кіравала большэвіцкая партыя, партыя Леніна—Сталіна, якая кіруецца рэволюцыйным вучэннем марксізма ленінізма, ведае, куды весці справу, умее перамагчы ўсе і ўсякія цяжкасці на нашым шляху.

Партыя Леніна—Сталіна выкрыла і разбіла ворагаў народа, трацкісцка-бухарынскіх і буржуазна-нацыяналістычных наймітаў капітала. Партыя Леніна Сталіна высока трымала і трымае вялікі сцяг комунізма.

Кіруючая роля Усесаюзнай Комуністычнай Партыі (большэвікоў) законадаўча замацавана ў Сталінскай Канстытуцыі.

У дакладзе таварыша Сталіна «Аб праекце Канстытуцыі СССР», які з'яўляецца найвялікшым тэарэтычным укладам у скарбніцу марксісцка-ленінскай навукі, былі ярка прадэманстраваны сусветна-гістарычныя перамогі соцыялізма, трыумф вышэйшай пролетарскай дэмакратыі ў нашай краіне.

Советы дэпутатаў працоўных з'яўляюцца палітычнай асновай соцыялістычнай дзяржавы. Яе эканамічную аснову складаюць соцыялістычная сістэма гаспадаркі і соцыялістычная ўласнасць на сродкі вытворчасці. У СССР ажыццяўляецца прынцып соцыялізма: «Ад кожнага па яго здольнасцях, кожнаму па яго працы».

Усім грамадзянам СССР забяспечваецца права на працу, права на адпачынак, права на асвету, права на матэрыяльнае забеспячэнне ў выпадку хваробы і ў старасці. Непахісным законам з'яўляецца роўнаправа грамадзян СССР незалежна ад расы і нацыянальнасці. Жанчына мае роўныя правы з мужчынамі. Выбары ўсіх органаў Советскай улады праводзяцца на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні.

Сталінская Канстытуцыя—канстытуцыя ўсенароднага дэмакратызма, гіганцкі крок наперад у развіцці соцыялістычнай дэмакратыі.

Сталінская Канстытуцыя замацавала той сусветна-гістарычны факт, што Советскі Саюз уступіў у паласу завяршэння будаўніцтва соцыялістычнага грамадства і паступовага пераходу да грамадства комуністычнага, кіруючым пачаткам якога будзе прынцып комунізма: «Ад кожнага па яго здольнасцях, кожнаму—па яго патрэбах».

Сусветна-гістарычныя перамогі соцыялізма ў нашай краіне заваяваны таму, што партыя Леніна—Сталіна, як асноўная кіруючая сіла ў сістэме дыктатуры пролетарыята, няўхільна і паслядоўна ажыццяўляла вялікае ленінска-сталінскае вучэнне аб пабудове соцыялізма ў адной краіне, вучэнне аб дзяржаве.

*) Сталін „Пытанні ленінізма“, стар. 404—405, выд. 11

* * *

Мы жывем ва ўмовах капіталістычнага акружэння, ва ўмовах напружанай міжнароднай абстаноўкі, калі ўжо разгарнулася другая імперыялістычная вайна. У гэтых умовах асаблівае значэнне набываюць пытанні далейшага ўмацавання нашай соцыялістычнай дзяржавы.

Краіна перамогшага соцыялізма, якая знаходзіцца ў варожым капіталістычным акружэнні і таму пастаянна падвергнута пагрозе ваеннага нападу звонку, павінна мець у сваім распараджэнні магутную, добра ўзброеную і абучаную армію, добра арганізаваныя карныя органы, моцную разведку. Каб абараняць заваевы соцыялізма ад нападу звонку, краіна Советаў павінна мець сваю магутную соцыялістычную дзяржаву.

Яшчэ ў 1915 годзе Ленін пісаў:

> «Нероўнамернасць эканамічнага і палітычнага развіцця ёсць безумоўны закон капіталізма. Адсюль следуе, што магчыма перамога соцыялізма першапачаткова ў нямногіх або нават у адной, асобна ўзятай, капіталістычнай краіне. Перамогшы пролетарыят гэтай краіны, экспрапрыіраваўшы капіталістаў і арганізаваўшы ў сябе соцыялістычную вытворчасць, паўстаў-бы супроць астатняга капіталістычнага свету, прыцягваючы да сябе прыгнечаныя класы іншых краін, узнімаючы ў іх дух паўстання супроць капіталістаў, выступаючы ў выпадку неабходнасці нават з ваеннай сілай супроць эксплаататарскіх класаў і іх дзяржаў» *).

Вызваленне брацкіх народаў Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ад гнёту польскіх паноў і капіталістаў прадстаўляе сабой бліскучае ажыццяўленне гэтага вялікага ленінскага прадбачання: соцыялістычная дзяржава дапамагла прыгнечаным народам.

Совецкі Саюз змог працягнуць брацкую руку дапамогі прыгнятаўшымся польскімі капіталістамі і панамі народам Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі толькі таму, што пад кіраўніцтвам вялікай партыі Леніна—Сталіна, пад кіраўніцтвам нашага вялікага правадыра таварыша Сталіна нязмерна вырасла міжнародная, палітычная, гаспадарчая і ваенная магутнасць першай у свеце соцыялістычнай дзяржавы.

Зараз пад вялікім сцягам Советаў ужо аб'яднана 183 мільёны совецкіх грамадзян. Значэнне гэтай новай перамогі Совецкай улады нязмерна. З неапісуемай радасцю і ўздымам сустрэлі Совецкую ўладу 13 мільёнаў працоўных Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. У гэтым гістарычным факце адлюстравалася сусветнае значэнне вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, як першага этапа сусветнай рэволюцыі і магутнай базы яе далейшага разгортвання.

> «...Само развіццё сусветнай рэволюцыі,—вучыць таварыш Сталін,—самы працэс адпадзення ад імперыялізма раду новых краін будзе адбывацца тым хутчэй і грунтоўней, чым грунтоўней будзе ўмацоўвацца соцыялізм у першай перамогшай краіне» **).

Шляхі далейшага будаўніцтва совецкай дзяржавы з вычарпальнай яснасцю і поўнатой вызначаны ў гістарычным дакладзе таварыша Сталіна на XVIII з'ездзе партыі.

---

*) Ленін, т. XVIII, стар. 232

**) Сталін, „Пытанні ленінізма", стар. 104, выд. 11.

Падводзячы вынікі аналізу двух фаз у развіцці соцыялістычнай дзяржавы, таварыш Сталін сказаў:

«Цяпер асноўная задача нашай дзяржавы ўнутры краіны заключаецца ў мірнай гаспадарча-арганізатарскай і культурна-выхаваўчай рабоце. Што датычыць нашай арміі, карных органаў і разведкі, то яны сваім астрыем звернуты ўжо не ва ўнутр краіны, а ў зне яе, супроць знешніх ворагаў.

Як бачыце, мы маем цяпер зусім новую, соцыялістычную дзяржаву, не бачаную яшчэ ў гісторыі і ў значнай меры адметную па сваёй форме і функцыях ад соцыялістычнай дзяржавы першай фазы.

Але развіццё не можа спыніцца на гэтым. Мы ідзем далей, уперад, да комунізма. Ці захаваецца ў нас дзяржава таксама і ў перыяд комунізма?

Так, захаваецца, калі не будзе ліквідавана капіталістычнае акружэнне, калі не будзе знішчана небяспека ваенных нападаў звонку, прычым зразумела, што формы нашай дзяржавы зноў будуць зменены, адпаведна са змяненнем унутранай і знешняй абстаноўкі.

Не, не захаваецца і адамрэ, калі капіталістычнае акружэнне будзе ліквідавана, калі яно будзе заменена акружэннем соцыялістычным.

Так абстаіць справа з пытаннем аб соцыялістычнай дзяржаве» *).

У гістарычным дакладзе таварыша Сталіна на XVIII з'ездзе партыі мы бачым геніяльную распрацоўку і развіццё марксісцка-ленінскага вучэння аб дзяржаве на аснове гіганцкага вопыту соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР.

* *

Ажыццяўляючы вялікую задачу паступовага пераходу да комунізма, мы будзем усямерна ўмацоўваць соцыялістычную дзяржаву, дзяржаву Советаў.

Згодна Канстытуцыі СССР (артыкул 97), Советы дэпутатаў працоўных «кіруюць мясцовым гаспадарчым і культурным будаўніцтвам». Адсюль зразумела рашаючая роля мясцовых Советаў у гаспадарча-арганізацыйнай і культурна-выхаваўчай рабоце, у справе комуністычнага выхавання працоўных і ажыццяўлення гіганцкіх гаспадарчых і палітычных задач трэцяй сталінскай пяцігодкі. На прадстаячых выбарах у Советы, указваў таварыш Молатаў, галоўнае месца павінны заняць пытанні штодзённага жыцця працоўных і палепшання работы мясцовых Советаў.

Советы дэпутатаў працоўных, як палітычная аснова СССР, растуць і ўмацоўваюцца, ахапляючы ўсё ў большых маштабах гаспадарча-арганізацыйную і культурна-выхаваўчую работу, умацоўваючы свае сувязі з мільённымі масамі працоўных, узнімаючы да дзяржаўнай работы новыя сотні тысяч дзяржаўных дзеячоў ленінска-сталінскага тыпу. Гэтым самым яшчэ больш умацоўваецца першая ў свеце соцыялістычная дзяржава, яшчэ больш расшыраецца адзіная, сапраўды народная совецкая дэмакратыя.

---

*) Сталін „Пытанні ленінізма", стар. 606, выд. 11.

На XVIII з'ездзе партыі таварыш Сталін, гаворачы аб задачах партыі ў галіне ўнутранай палітыкі, указаў:

> «Няўхільна праводзіць у жыццё нашу соцыялістычную Канстытуцыю, ажыццяўляць да канца дэмакратызацыю палітычнага жыцця краіны, умацоўваць маральна-палітычнае адзінства савецкага грамадства і дружалюбнае супрацоўніцтва рабочых, сялян, інтэлігенцыі, умацоўваць усямерна дружбу народаў СССР, развіваць і культывіраваць савецкі патрыятызм».

Выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных будуць новай бліскучай перамогай сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, новай магутнай дэманстрацыяй несакрушымага маральна-палітычнага адзінства совецкага грамадства. Выбары ў мясцовыя Советы з'явяцца далейшым крокам па шляху ўмацавання совецкай дзяржавы, завяршаючы перабудову ўсёй работы Советаў зверху да нізу, на аснове вялікай Сталінскай Канстытуцыі. На гэтых выбарах мільёны працоўных нашай краіны яшчэ цясней згуртуюцца пад сцягам Советаў вакол вялікай непераможнай партыі Леніна—Сталіна, вакол нашага ґеніяльнага настаўніка і правадыра таварыша Сталіна.

З надзеяй і любоўю, як на сцяг будучага вызвалення ад гнёту капітала, глядзяць на Совецкі Саюз мільёны пролетарыяў капіталістычных краін, прыгнечаныя народы калоній. Ва ўсім свеце няма куточка, дзе-б вялікае слова Совет не было родным і блізкім для працоўных і прыгнечаных.

Вучэнне Леніна—Сталіна аб Советах указвае ўсяму чалавецтву верны шлях вызвалення ад ланцугоў капіталізма, ад жахаў імперыялістычнага рабства, ад нацыянальнага гнёту. Вялікае, геніяльна развітае і абгрунтаванае вялікімі правадырамі комунізма Леніным і Сталіным, пацверджанае і праверанае вопытам пераможнага соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР ленінска-сталінскае вучэнне аб Советах служыць і будзе служыць пуцяводнаю зоркай для усяго прыгнечанага чалавецтва.

Ператвараючы ў жыццё вялікія прынцыпы ленінска-сталінскага вучэння аб Советах, народы Совецкага Саюза, пад кіраўніцтвам любімага правадыра народаў, геніяльнага прадаўжальніка справы Леніна вялікага Сталіна, пойдуць яснай і прамой дарогай да поўнай перамогі комунізма.

М. Драгілеў

Прадукцыйныя сілы і вытворчыя адносіны

1. Аб матэрыяльнай аснове развіцця грамадства

Розныя напрамкі буржуазнай філасофіі маюць тую агульную рысу, што яны не могуць даць сапраўды навуковага тлумачэння гістарычным з'явам. Буржуазная навука не можа ўскрыць сапраўдныя законы грамадскага развіцця, яна не ў сілах устанавіць сапраўдныя прычыны і корні гістарычных падзей. У яе асвятленні грамадства выглядае як грамадства «наогул», а не як грамадскі арганізм, які гістарычна развіваецца, праходзіць праз пэўныя ступені развіцця. Многія буржуазныя філасофскія школы ўгледжваюць рашаючую сілу гістарычнага развіцця ў ідэях, якія нямаведама адкуль прыходзяць у галовы вялікіх мысліцеляў. Усю гісторыю грамадства яны абрысоўваюць як працэс паступовага ўдасканальвання—у адпаведнасці з такога роду ідэямі—усіх грамадскіх форм, палітычных устаноў, грамадскай маралі, норм і звычак, якія рэгулююць узаемаадносіны паміж людзьмі, і т. д. Увесь змест папярэдняга развіцця яны ўяўляюць як падрыхтоўку сучаснага буржуазнага ладу, які,—як сцвярджаюць гэтыя «вучоныя» лакеі грашовага мяшка,—з'яўляецца найвышэйшай дасканаласцю. Законы буржуазнага грамадства яны аб'яўляюць вечнымі, незмяняемымі, неадалімымі.

Марксісцка-ленінская тэорыя камня на камні не пакінула ад гэтых «пабудоў» буржуазных філосафаў. Яна выкрыла фактычную абарону імі буржуазнага ладу. Буржуазнай соцыялогіі і яе скажонаму асвятленню гістарычнай рэчаіснасці яна проціпаставіла рэвалюцыйнае разуменне гісторыі, строга навуковае даследаванне яе.

Марксісцка-ленінская навука паказала, што няма грамадства «наогул». Даследаваўшы горы фактычнага матэрыялу, асновапаложнікі навуковага комунізма ўстанавілі паняцце грамадска-эканамічнай фармацыі. Яны даказалі, што развіццё такіх фармацый ёсць натуральна-гістарычны працэс.

Стала быць, грамадскія з'явы выклікаюцца да жыцця не па волі «крытычна-мыслячых асоб». І наогул, не ў галіне ідэалагічных адносін ляжыць першапрычына грамадскага развіцця.

Крытыкуючы суб'ектыўна-ідэалістычную філасофію Міхайлоўскага, Ленін указваў, што «суб'ектывісты, напрыклад, прызнаючы законаадпаведнасць гістарычных з'яў, не ў стане, аднак, былі глянуць на іх эвалюцыю, як на натуральна-гістарычны працэс,—і іменна таму, што спыняліся на грамадскіх ідэях і мэтах чалавека, не ўмеючы звесці

гэтых ідэй і мэт да матэрыяльных грамадскіх адносін»*). Марксісцка-ленінскае філасофскае вучэнне паказала, што корні грамадскіх ідэй, корні пануючых у грамадстве на данай ступені яго развіцця, тэорый, першапрычыну з'яўлення новых палітычных поглядаў, настрояў і ўстаноў трэба шукаць не ў іх саміх, а ў змяняючыхся ўмовах матэрыяльнага жыцця грамадства. У канчатковым выніку, не ідэі вызначаюць грамадскія адносіны людзей, а наадварот, грамадскія адносіны людзей вызначаюць пануючыя ў даным грамадстве ідэі. У сваю чаргу грамадскія адносіны паміж людзьмі змяняюцца ў залежнасці ад змянення матэрыяльных прадукцыйных сіл грамадства на розных стадыях грамадскага развіцця. Значыць, «не сазнание людзей вызначае іх быццё, а, наадварот іх грамадскае быццё вызначае іх сазнание» **).

Сказанае толькі што аб паходжанні грамадскіх ідэй, аб іх першакрыніцы, ніколі не змяншае іх ролі і значэння ў гістарычным развіцці грамадства. Новыя, перадавыя ідэі і тэорыі, якія выражаюць інтарэсы перадавых слаёў грамадства, узнікаюць толькі пасля таго як развіццё матэрыяльнага жыцця грамадства паставіла перад імі новыя задачы. Але, раз узнікшы, яны ў сваю чаргу, у парадку адваротнага ўздзеяння, уплываюць на развіццё грамадства, паскараючы яго прасоўванне ўперад.

> «Грамадскія ідэі, тэорыі, палітычныя ўстановы, узнікшы на базе наспеўшых задач развіцця матэрыяльнага жыцця грамадства, развіцця грамадскага быцця, самі ўздзейнічаюць потым на грамадскае быццё, на матэрыяльнае жыццё грамадства, ствараючы ўмовы, неабходныя для таго, каб давесці да канца вырашэнне наспеўшых задач матэрыяльнага жыцця грамадства і зрабіць магчымым далейшае яго развіццё» ***).

Але у канчатковым выніку, пануючыя на данай ступені развіцця грамадскія погляды, тэорыі, ідэі, палітычныя ўстановы, настроі, маральныя пачаткі, юрыдычныя формы і іншыя элементы духоўнага жыцця грамадства вядуць сваё паходжанне ад адпавядаючых данай **ступені развіцця ўмоў матэрыяльнага жыцця грамадства.**

* * *

Што мы маем на ўвазе пад паняццем—«умовы матэрыяльнага жыцця грамадства»?

Перш за ўсё сюды адносіцца геаграфічнае асяроддзе, інакш кажучы, уся сукупнасць натуральных умоў —зямля з яе нетрамі, водныя багацці, кліматычныя даныя, флора і фауна,—у якіх жыве чалавецтва.

Не падлягае сумненню, што геаграфічнае асяроддзе прадстаўляе сабой адну з неабходных і пастаянных умоў існавання і развіцця грамадства. Бо натуральная вытворчасць магчыма не інакш як у пэўным геаграфічным асяроддзі. Іменна ў навакольнай прыродзе чалавек чэрпае неабходныя матэрыяльныя ўмовы, без якіх працэс працы не можа адбывацца. «Праца,—указвае Маркс,—не адзіная крыніца

---

*) Ленін, т. I, стар. 61.
**) Маркс. Выбраныя творы, т. I, стар. 269.
***) „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)", стар. 111.

ўтвараемых ёю спажывецкіх вытворчасцей, матэрыяльнага быцця. Праца ёсць бацька багацця, як гаворыць Вільям Пэці, зямля—яго маці» *). Да таго-ж, і сам чалавек ёсць частка прыроды, а «праца ёсць працэс, які адбываецца паміж чалавекам і прыродай, працэс, у якім чалавек сваёй уласнай дзейнасцю абумоўлівае, рэгуліруе і кантраліруе абмен вяшчэстваў паміж сабою і прыродай»**).

Больш таго, у пэўным сэнсе геаграфічнае асяроддзе аказвае ўплыў на развіццё грамадства, паскараючы або замаруджваючы ход яго развіцця. Хіба можна адмаўляць, што неабдымныя прыродныя багацці нашай радзімы служаць вельмі істотным фактарам, які спрыяе хуткаму сацыялістычнаму прагрэсу яе?

Усё гэта так. Але пераацэньваць ролю і значэнне геаграфічнага фактара было-б таксама шкодна. Недапушчальна ігнараваць тую акалічнасць, што сіла ўплыву геаграфічнага асяроддзя, у прыватнасці прыродных багаццяў, на развіццё грамадства вызначаецца гістарычнымі ўмовамі. Тыя-ж багацейшыя натуральныя багацці нашай краіны аставаліся нявыкарыстанымі ў адсталай царскай Расіі. А ва ўмовах, створаных перамогшым сацыялізмам, гэтыя багацці адыграюць ролю аднаго з вельмі важных фактараў, з дапамогаю якіх народы нашай краіны ажыццявяць сваю асноўную эканамічную задачу—дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны таксама і ў эканамічных адносінах.

У гэтай-жа сувязі можна сказаць, што прыродныя ўмовы Брытанскай Індыі вельмі нагадваюць натуральныя даныя нашага совецкага Узбекістана. Аднак тая акалічнасць, што Узбекістан уваходзіць у склад вялікага Совецкага Саюза, абумовіла не толькі бурны росквіт у ім прадукцыйных сіл, але і пэўнае змяненне яго геаграфічных даных у бок далейшага падпарадкавання прыроды чалавеку. А эканоміка Індыі адчувае ўсе вынікі шматгадовага эксплаататарскага гаспадарання ў ёй англійскіх імперыялістаў.

Такім чынам, геаграфічнае асяроддзе ўплывае на ход развіцця грамадства, але яно ўплывае па-рознаму, у залежнасці ад грамадскага ладу, пануючага у дадзенай краіне. А самае галоўнае заключаецца ў тым, што яго ўплыў не з'яўляецца вызначаючым уплывам. Геаграфічнае асяроддзе можа ўплываць на грамадскае развіццё, але ні ў якім разе не вызначаць яго. Гэта тлумачыцца тым, што геаграфічнае асяроддзе развіваецца куды марудней, чым грамадства.

> «Для колькі-небудзь сур'ёзных змяненняў геаграфічнага асяроддзя патрэбны мільёны год, тады як нават для сур'ёзнейшых змяненняў грамадскага ладу людзей дастаткова некалькіх соцень або пары тысяч год.
>
> Але з гэтага вынікае, што геаграфічнае асяроддзе не можа служыць галоўнай прычынай, вызначаючай прычынай грамадскага развіцця, бо тое, што астаецца амаль нязменным на працягу дзесяткаў тысяч год, не можа служыць галоўнай прычынай развіцця таго, што перажывае карэнныя змяненні на працягу соцень год» ***).

Такім чынам геаграфічнае асяроддзе не з'яўляецца вызначаючым фактарам гістарычнага развіцця. Больш таго, само геаграфічнае асяроддзе падвяргаецца змяненням пад уплывам новых грамадска-

*) Маркс „Капітал", т. I, стар. 8.
**) Там-жа, стар. 119.
***) „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)", стар. 112.

гістарычных умоў. Найярчэй гэта акалічнасць выступае ў нашай краіне. Соцыялістычны лад у вялікай ступені змяніў геаграфічнае аблічча нашай радзімы. У Запаляр'і сталі вырошчвацца культуры, аб якіх раней там уяўлення не мелі. Глеба раду нечарназемных абласцей, якая лічылася ў дарэволюцыйны час непладароднай, цяпер служыць крыніцай калгаснага багацця. Мерапрыемствамі совецкага ўрада, намаганнямі працоўных рэзка павышана пладароднасць глебы гэтых абласцей. У дарэволюцыйнай Расіі меліся раёны, для якіх засуха лічылася іх неад'емнай геаграфічнай уласцівасцю. Мерапрыемствы совецкай улады па стварэнню лесаабаронных палос, па насаджэнню лясоў, па стварэнню ірыгацыйнай сеці, па пабудове гідраэлектрастанцый, разлічаных на абслугоўванне абвадняльнай сістэмы,—падарвалі ўсякую базу пад гэтай, з дазволу кажучы, «тэорыяй».

Сталінскі план злучэння пяці мароў з'яўляецца асабліва яркім выражэннем свядомага змянення геаграфічных умоў нашай краіны, што ажыццяўляецца совецкім урадам на карысць працоўных. Гэты план забяспечвае стварэнне глыбокаводнага шляху, які злучыць Чорнае, Азоўскае і Каспійскае моры з Белым і Балтыйскім. Народнагаспадарчае значэнне гэтага плана—грандыёзна. Яго істотным момантам з'явіцца стварэнне Волга-Данскога канала. З пабудовай гэтага канала будзе ліквідавана дапушчаная прыродай «недарэчнасць», якая заключаецца ў тым, што Волга—водная артэрыя сусветнага значэння—не мае натуральнай сувязі з адкрытым морам. Стварэнне гэтага канала дазволіць вырашыць цэлы рад гаспадарчых праблем выключнага значэння. Калмыцкая АССР будзе абводнена. Растоў ператворыцца ў марскі порт, хоць прырода, сама па сабе, умоў для гэтага не стварыла.

* * *

У паняцце «умовы матэрыяльнага жыцця грамадства» уваходзіць таксама такі фактар, як рост народанасялення, тая ці іншая шчыльнасць насельніцтва.

Зусім відавочна, што народанасяленне, як і геаграфічнае асяроддзе, з'яўляецца той неабходнай і пастаяннай матэрыяльнай умовай, па-за якою грамадства не можа існаваць. «Першая прадпасылка ўсякай чалавечай гісторыі, гэта, зразумела, існаванне жывых чалавечых асоб»,—пісалі Маркс і Энгельс у «Нямецкай ідэалогіі». Ва ўводзінах «Да крытыкі палітычнай эканоміі» Маркс указвае, што насельніцтва «ёсць аснова і суб'ект усяго грамадскага працэса вытворчасці». «Без наяўнасці пэўнага мінімума людзей не можа быць ніякага матэрыяльнага жыцця грамадства»,—чытаем мы таксама ў «Кароткім курсе гісторыі ВКП(б)».

Зразумела, гэты пэўны мінімум сумесна жывучых і сумесна вытвараючых людзей не ёсць нешта безадносінае да грамадскага ладу да дадзенай ступені грамадскага развіцця. К прыкладу кажучы, умовы жыцця ў першабытна-комуністычным грамадстве былі такія, што людзі павінны былі жыць толькі ў дробных абшчынах. Узровень матэрыяльнай вытворчасці быў тады настолькі нізкі, што, калі-б людзі жылі ў буйных грамадскіх адзінках, яны не маглі-б пракарміцца. Ад прыроды, якая людзей акружала, яны ўмелі тады браць вельмі мала. Капіталізм-жа ў радзе пунктаў зямного шара неабходна стварае велізарныя скапленні людзей.

Вядома, народанасельніцтва, яго большая або меншая шчыльнасць, яго рост або скарачэнне, аказваюць той ці іншы ўплыў на развіццё грамадства, аблягчаючы або замаруджваючы яго рух уперад. Так, напрыклад, першабытна-абшчыннаму ладу, з прычыны тагочаснага нізкага ўзроўню прадукцыйнасці працы, была ўласціва вельмі нязначная шчыльнасць насельніцтва. Гэта-ж акалічнасць, якая азначае раз'яднанасць паміж рознымі родамі і плямёнамі, абумовіла, акрамя раду іншых прычын, выключна марудныя тэмпы развіцця ў тую эпоху. А па меры росту прадукцыйнасці працы шчыльнасць насельніцтва ўзрасла. Завязаліся сувязі паміж плямёнамі, развіваўся абмен, што ў сваю чаргу паскарала грамадскае развіццё.

Але ўплыў росту народанасельніцтва на развіццё грамадства не можа быць вызначаючым уплывам. Бо не ў росце-ж народанасельніцтва мы знаходзім тлумачэнне характэрным рысам дадзенага грамадскага ладу, а, наадварот, спецыфічныя асаблівасці дадзенай грамадска-эканамічнай фармацыі вызначаюць уласцівую ей своеасаблівасць адноснага росту народанасельніцтва.

Няма і не існуе законаў народанасельніцтва наогул. Даследуючы ў «Капітале» прычыны, якія абумоўліваюць стварэнне пры капіталізме сталай прамысловай рэзервнай арміі, Маркс заўважае: «... усякаму асабліваму гістарычнаму спосабу вытворчасці у сапраўднасці ўласцівы свае асаблівыя, маючыя гістарычнае значэнне законы насельніцтва. Абстрактны закон насельніцтва існуе толькі для раслін і жывёл, пакуль у гэтую галіну гістарычна не ўмешваецца чалавек»*). Таму, як указвае Ленін, крытыкуючы Сісмондзі, неабходна «даследаваць законы народанасельніцтва кожнай гістарычнай сістэмы гаспадаркі асобна і вывучаць яго сувязь і суадносіны з данай сістэмай» **).

Вышэй мы бачылі, што шчыльнасць насельніцтва, аказваючы пэўны ўплыў на развіццё грамадства, у канчатковым выніку сама залежыць ад характару грамадскага ладу. Але гэта адносіцца не толькі да шчыльнасці насельніцтва. У не меншай меры гэта датычыць смяротнасці і нараджаемасці, а, значыць, і прыросту насельніцтва.

Жабрацтва, на якое працоўныя абракаюцца пры капіталізме, стварае высокую смяротнасць у працоўным насельніцтве асабліва сярод дзяцей. У капіталістычных краінах адбываецца сістэматычнае змяншэнне натуральнага прыросту насельніцтва. У Савецкім Саюзе, як указваў таварыш Сталін на XVI партз'ездзе, на аснове карэннага палепшання матэрыяльных умоў жыцця працоўных, ужо к 1930 году «смяротнасць насельніцтва зменшылася ў параўнанні з даваенным часам на 36 проц. па агульнай і на 42,5 проц. па дзіцячай лініі». Дзякуючы няўхільнаму росту ўзроўню матэрыяльнага дабрабыту нашай краіны, дзякуючы мерапрыемствам савецкага ўрада па павелічэнню сеці дзіцячых устаноў, па аказанню дапамогі многадзетным сем'ям і т. п., значна павялічылася нараджаемасць у нашай краіне, а гэта абумовіла павелічэнне прыросту насельніцтва.

Вось што па гэтаму поваду гаварыў таварыш Сталін у 1935 годзе на нарадзе перадавых камбайнераў:

«У нас цяпер усе гавораць, што матэрыяльнае становішча працоўных значна палепшылася, што жыць стала лепш, весялей.

*) Маркс „Капітал", т. I, стар. 502.

**) Ленін, т. II, стар. 45

> Гэта, зразумела, верна. Але гэта вядзе да таго, што насельніцтва стала размнажацца значна хутчэй, чым у стары час, смяротнасці стала менш, нараджаемасці больш, і чыстага прыросту атрымліваецца непараўнальна больш».

Такога штогодняга прыросту насельніцтва, які мае месца ў нас, не ведала царская Расія, не ведае і ні адна капіталістычная краіна. Такі прырост насельніцтва магчым толькі ва ўмовах перамогшага соцыялізма.

Капіталістычнаму грамадству неабходна ўласцівы такі закон народанасельніцтва, як закон адноснага перанасялення, які заключаецца ў тым, што ў меру развіцця капіталістычных адносін няўхільна расце колькасць (паколькі гутарка ідзе аб агульнай тэндэнцыі развіцця) прамысловай рэзервнай арміі, няўхільна расце беспрацоўе. У нас, у СССР, ужо ёсць пакаленне людзей, якому слова «беспрацоўе» толькі знаёма, але якое, дзякуючы перамозе соцыялізма ў нашай краіне, ніколі на сабе не адчувала жахаў беспрацоўя.

Такім чынам, працэсы ў галіне народанасельніцтва самі вызначаюцца характарам данага грамадска-эканамічнага ладу. Рост народанасельніцтва, хоць і ўплывае на грамадскае развіццё, не з'яўляецца, аднак, вызначаючай сілай яго. Не у росце народанасельніцтва мы знаходзім ключ да разумення таго, чаму даны грамадскі лад змяніўся такім-то новым ладам, а не якім-небудзь іншым.

> «Калі-б рост народанасельніцтва з'яўляўся вызначаючай сілай грамадскага развіцця, больш высокая шчыльнасць насельніцтва абавязкова павінна была-б выклікаць да жыцця адпаведна больш высокі тып грамадскага ладу» *).

Тым часам у сапраўднасці мы гэтага не бачым. Шчыльнасць насельніцтва ў Кітаі ў чатыры разы вышэй чым у ЗША. Але ніхто не стане сур'ёзна сцвярджаць, што з пункту погляду грамадскага развіцця ЗША стаяць ніжэй Кітая. Гаксама відавочна, што хоць у Бельгіі шчыльнасць насельніцтва ў 26 раз вышэй чым у СССР, Бельгія адстала ад нашай краіны на цэлую гістарычную эпоху, бо там пануе капіталізм, а ў нас перамог соцыялістычны лад.

* * *

Такім чынам, каб высніць, што з'яўляецца галоўнай сілай грамадскага развіцця, каб устанавіць, што з'яўляецца фактарам, які вызначае характар грамадскага ладу, які вызначае, так сказаць, фізіяномію грамадства, прыходзіцца звяртацца не да геаграфічнага асяроддзя і не да народанасельніцтва.

Што-ж усё-такі з'яўляецца той галоўнай сілай у сістэме матэрыяльных умоў існавання грамадства, якая вызначае яго развіццё ўперад ад аднаго грамадскага ладу да другога, якая тлумачыць характар кожнага данага грамадскага ладу?

Гэтай сілай з'яўляецца спосаб вытворчасці матэрыяльных жыццёвых каштоўнасцей, спосаб здабывання сродкаў да жыцця, неабходных для існавання людзей.

> «Згодна матэрыялістычнаму разуменню гісторыі,—гаворыць Энгельс у сваёй кнізе «Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці

*) „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)", стар. 113.

і дзяржавы»,—вызначаючым момантам гісторыі ў канчатковым выніку з'яўляецца вытворчасць і ўзнаўленне непасрэднага жыцця».

Каб жыць, трэба мець усе матэрыяльныя каштоўнасці, якія задавальняюць жыццёвыя патрэбы людзей. А каб іх мець, трэба іх вытвараць. Для іх вытворчасці трэба мець прылады вытворчасці. Апошнія трэба не толькі мець, трэба ўмець яшчэ карыстацца імі і трэба ўмець вытвараць іх. Значыць, грамадскі працэс вытворчасці з'яўляецца крыніцай самых неабходных сродкаў для жыцця чалавека. Ён прадстаўляе сабою галоўную і асноўную умову існавання чалавечага грамадства.

«Праца, як тварэц спажывецкіх вартасцей,—гаворыць Маркс, як карысная праца, з'яўляецца незалежнай ад усякіх грамадскіх форм умовай існавання людзей, вечнай натуральнай неабходнасцю: без яе не быў-бы магчымым абмен рэчываў паміж чалавекам і прыродай, г. зн. не было-б магчымым само чалавечае жыццё» *).

Пры тэтым, чым вышэй прадукцыйнасць працы, тым больш улада чалавека над прыродай, тым значней матэрыяльныя багацці грамадства. Узровень-жа прадукцыйнасці працы, няйма наступных у даным укладзе грамадскіх адносін, залежыць яшчэ ад таго, наколькі дасканалы вытворчыя сілы грамадства.

У паняцце «прадукцыйныя сілы грамадства» уваходзяць «прылады вытворчасці, пры дапамозе якіх вырабляюцца матэрыяльныя здабыткі», і «людзі, якія прыводзяць у рух прылады вытворчасці і ажыццяўляюць вытворчасць матэрыяльных благ дзякуючы пэўнаму вытворчаму вопыту і навыкам да працы» **). Класікі навуковага комунізма асабліва значэнне надаюць менавіта людзям, чыёй дзейнасцю ажыццяўляецца функцыяніраванне прадукцыйных сіл. Маркс указвае, што найбольшай прадукцыйнай сілай з усіх прылад вытворчасці з'яўляецца сам рэвалюцыйны клас, які складаецца з людзей, рухаючых грамадскі вытворчы працэс уперад.

Вядома, з якою сілай таварыш Сталін неаднакроць падкрэсліваў значэнне кадраў у нашым сацыялістычным будаўніцтве. Працоўны чалавек уваходзіць (зразумела, не у фізічным сэнсе слова, а ў яго грамадскім значэнні) у якасці галоўнага элемента у паняцце «прадукцыйныя сілы грамадства».

З дапамогаю прылад вытворчасці працоўны чалавек уздзейнічае на вешчаства прыроды, надаючы яму тую форму, у якой яно можа стаць прадметам задавальнення чалавечых патрэб. Стала быць, у працэсе працоўнага ўздзеяння чалавека на прыроду, у працэсе працы, фігуруюць, як гаворыць Маркс у 5 раздзеле першага тома «Капітала», тры моманты: «1) мэтазгодная дзейнасць, або самая праца, 2) прадмет, на які дзейнічае праца, і 3) прылады, якімі яна дзейнічае».

Калі гавораць «прылады вытворчасці», маюць на мэце той прадмет або комплекс прадметаў, які чалавек памяшчае паміж сабою і вешчаством прыроды і якія абслугоўваюць чалавеку ўздзеянне на вешчаство прыроды. Прылада вытворчасці з'яўляецца як-бы органам працоўнай дзейнасці чалавека, органам, які чалавек «далучае да

*) Маркс „Капітал" т. I, стар. 8.
**) „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)", стар. 114.

органаў свайго цела, падаўжваючы, такім чынам, наперакор біблii, натуральныя памеры апошняга» (Маркс).

У больш шырокім сэнсе слова, да прылад вытворчасці прылічваюцца ўсе матэрыяльныя ўмовы, неабходныя для таго, каб мог працякаць працэс працы: рабочыя будынкі, каналы, дарогі, унутры заводскі транспарт і т. д.

Уменне вытвараць прылады вытворчасці і ўжываць іх у працэсе працы ёсць спецыфічная уласцівасць іменна чалавечага працэса працы. Маркс спасылаючыся цытуе Франкліна, які вызначыў чалавека, як жывёлу, якая робіць прылады. Прылада вытворчасці ўваходзіць у склад прадукцыйных сіл толькі тады, калі яна ўступае у кантакт з жывою працай, якая скарыстоўвае гэту прыладу. Машына сама па сабе, калі яна не прымае удзелу ў працэсе працы, бескарысна разрушаецца. Яе драўляныя часткі гніюць, яе жалезныя часткі пакрываюцца іржой, з цягам часу яна, як машына, перастае існаваць. Калі-ж машына выкарыстоўваецца ў працэсе працы, то, хоць яна таксама разрушаецца, яе разрушэнне суправаджаецца, аднак, стварэннем матэрыяльных каштоўнасцей. Гэта такое разрушэнне машыны, якое адбываецца ў працэсе вытворчасці. Праца, у свой час затрачаная на стварэнне машыны, не бясследна знікае, яна ўваскрасае ў тых новых каштоўных прадметах, якія з яе дапамогай ствараюцца.

Але калі прылады вытворчасці становяцца элементам прадукцыйных сіл грамадства, толькі ўступаючы ў сувязь з жывою працай, то, з другога боку, прадукцыйныя сілы абавязкова мяркуюць прылады вытворчасці як свой складаны элемент. Няма вытворчасці без прылад вытворчасці. Узровень развіцця прылад вытворчасці адпавядае вытворчаму вопыту і працоўным навыкам людзей, якія імі карыстаюцца. У цэлым прадукцыйныя сілы выражаюць меру ўлады чалавека над сіламі прыроды, меру развіцця чалавечай рабочай сілы.

Аднак, як гаворыць Маркс, «сродкі працы не толькі мярыла развіцця чалавечай рабочай сілы, але і паказчык тых грамадскіх адносін, пры якіх адбываецца праца» *).

У гісторыі чалавецтва ніколі не было такога перыяда, калі-б чалавек працаваў, займаўся вытворчай дзейнасцю ў адзіночку. Чалавек заўсёды працаваў побач і супольна з другімі людзьмі. У сваёй кнізе «Да крытыкі палітычнай эканоміі» Маркс высмейвае «пазбаўленыя фантазіі выдумкі 18 века», якімі займаліся буржуазныя эканамісты, рыхтуючы сцвярджэнне, быццам чалавек ранніх гістарычных эпох жыў і працаваў адзінотна,—гэткім Рабінзонам.

> «Вытворчасць адасобленага індывіда па-за грамадствам,—гаворыць Маркс,—такая-ж бяссэнсіца, як развіццё мовы без сумесна жывучых і размаўляючых паміж сабою індывідаў... Калі гутарка ідзе аб вытворчасці, то заўсёды аб вытворчасці на пэўнай ступені грамадскага развіцця—аб вытворчасці грамадскіх індывідаў» **).

Натуральна, што, працуючы не ў адзіночку, а ў грамадстве, чалавек уступае ў пэўныя адносіны не толькі да вешчаства прыроды, але і да іншых людзей. У працэсе вытворчасці людзі ўздзейнічаюць не толькі на прыроду, але і адзін на другога. Паміж людзьмі завязваюцца ў працэсе грамадскай вытворчасці пэўныя сувязі, устанаўлі-

*) Маркс „Капітал", т. I, стар. 121.
**) Маркс „Да крытыкі палітычнай эканоміі", стар. 10, выд. 1935 г.

ваюцца пэўныя адносіны і толькі знаходзячыся ў гэтых адносінах адзін да другога, людзі могуць уздзейнічаць на прыроду. Гэтыя адносіны паміж людзьмі ёсць вытворчыя адносіны. Яны матэрыяльны, бо складаюцца аб'ектыўна, незалежна ад свядомасці і волі людзей, не праходзячы праз іх сазнанне.

Адзначаючы парочную ідэю, якая ляжыць у аснове «грамадскага дагавора» Жан-Жака Русо, Ленін у сваёй кнізе «Што такое «прыяцелі» народа і як яны ваююць супроць соцыял-дэмакратаў» указвае:

> «Ніколі гэтага не было, ды і цяпер гэтага няма, каб члены грамадства ўяўлялі сабе сукупнасць тых грамадскіх адносін, пры якіх яны жывуць, як нешта пэўнае, цэласнае, прасякнутае нейкім пачаткам; наадварот, маса прыладжваецца несвядома да гэтых адносін і да такой ступені не мае ўяўлення аб іх, як аб асобых гістарычных грамадскіх адносінах, што, напрыклад, тлумачэнне адносін абмену, пры якіх людзі жылі многія стагоддзі, было дана толькі ў самы апошні час» *).

Толькі ў нашай краіне перамогшага соцыялізма працоўныя свядома будуюць новыя грамадскія адносіны.

Адносіны, якія складаюцца паміж людзьмі ў працэсе вытворчасці, могуць быць рознымі. Яны могуць быць адносінамі супрацоўніцтва, яны могуць насіць характар узаемнай дапамогі людзей, вольных ад эксплаатацыі. Такога роду вытворчыя адносіны існуюць пакуль толькі ў грамадскай вытворчасці СССР. Але вытворчыя адносіны могуць быць і адносінамі панавання і падпарадкавання, адносінамі эксплаатуючых і эксплаатуемых, як гэта ў розных формах мела і мае месца ў кожным грамадстве, заснаваным на класавай процілегласці. Урэшце, вытворчыя адносіны могуць быць адносінамі і пераходнага тыпу, як гэта мае месца ў перыяды пераходу ад адных форм вытворчых адносін да другіх.

Але якімі-б ні былі па свайму характару дадзеныя вытворчыя адносіны, яны ў такой-жа меры ёсць неабходны элемент грамадскай вытворчасці, як і прадукцыйныя сілы грамадства. Як нельга сабе ўявіць матэрыяльную грамадскую вытворчасць інакш, як аснаванай на функцыянаванні прадукцыйных сіл грамадства, так нельга яе сабе ўявіць па-за характэрнымі для данай ступені развіцця вытворчасці адносінамі паміж людзьмі.

> «Значыць, вытворчасць, спосаб вытворчасці ахапляе як прадукцыйныя сілы грамадства, так і вытворчыя адносіны людзей, з'яўляючыся, такім чынам, увасабленнем іх адзінства ў працэсе вытворчасці матэрыяльных здабыткаў» **).

Наогул кажучы, паміж людзьмі складаюцца пэўныя адносіны ў самых рознастайных формах грамадскага жыцця. У галіне палітыкі, маралі, рэлігійных поглядаў, навукі, права сутыкаюцца рознародныя, супярэчлівыя, процілеглыя інтарэсы, погляды, перакананні, традыцыі, нормы і правілы, завязваюцца сувязі, узнікае барацьба, адным словам, складваецца ўся тая складаная рознастайнасць адносін, якая заўсёды мае месца ў грамадстве. Але ў аснове гэтай рознастайнасці адносін ляжаць вытворчыя адносіны людзей.

*) Ленін, т. I, стар. 60.
**) „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)“, стар. 114

Вытворчыя адносіны, знаходзячыся, у сваю чаргу, у залежнасці ад гістарычнага ўзроўню прадукцыйных сіл, складаюць галоўную і вырашаючую галіну грамадскага жыцця. Сярод усей складанай сукупнасці грамадскіх адносін яны з'яўляюцца першапачатковымі, асноўнымі. Імі, у канчатковым выніку, жывяцца грамадскія тэорыі, у іх караняцца розныя інтарэсы розных грамадскіх груп. Вытворнымі ад іх выступаюць з'явы, якія адносяцца да палітыкі, права і г. д.

> «Сукупнасць гэтых вытворчых адносін складае эканамічную структуру грамадства, рэальны базіс, на якім узвышаецца юрыдычная і палітычная надбудова і якому адпавядаюць пэўныя формы грамадскай свядомасці. Спосаб вытворчасці матэрыяльнага жыцця абумоўлівае соцыяльны, палітычны і духоўны працэсы жыцця наогул» *).

Асабліва трэба падкрэсліць класавы характар вытворчых адносін ва ўсякім грамадстве, бо вытворчыя адносіны з'яўляюцца па сутнасці справай адносінамі людзей па ўладанню сродкамі вытворчасці, т. зн. адносінамі ўласнасці. Той ці іншы ўзровень прадукцыйных сіл паказвае, якімі прыладамі вытворчасці людзі здабываюць неабходныя для іх існавання жыццёвыя каштоўнасці. А характар вытворчых адносін ёсць пытанне аб тым, каму належаць выкарыстоўваемыя ў працэсе працоўнай дзейнасці сродкі вытворчасці. Гэта ёсць пытанне аб тым, хто імі ўладае. Распараджаецца імі ўсё грамадства ў цэлым у інтарэсах усіх працоўных, ці яны знаходзяцца ў валоданні паасобных класаў, груп і людзей, якія эксплаатуючы працоўных, выкарыстоўваюць іх у мэтах свайго ўзбагачэння.

* * *

Нішто ў прыродзе не існуе ў стане спакою і нерухомасці, застою і нязменнасці. Усё існуючае пастаянна прабывае ў стане бесперапыннага руху і змянення. Усё гэта ў поўнай меры адносіцца і да грамадскай вытворчасці, якая таксама заўсёды знаходзіцца ў стане змянення і развіцця. Развіваюцца і ўдасканальваюцца прылады працы і разам з гэтым узбагачаюцца вытворчыя навыкі людзей. У працэсе грамадскай вытворчасці чалавек уздзейнічае на прыроду і змяняе яе. Адначасова ён змяняе і ўласную прыроду. Няма патрэбы даказваць, якая гіганцкая адлегласць існуе паміж прымітыўнымі вытворчымі навыкамі першабытнага паляўнічага і вытворчым вопытам і навыкамі сучаснага рабочага, які працуе, скажам, па мантажу складаных машын. Праўда, паралельна з гэтым мы назіраем, як капіталізм да празмернасці абядняе змест працоўнай дзейнасці многіх рабочых. Так, напрыклад, на заводах Форда рабочыя зведзены амаль што да становішча аўтаматаў, бо кожны з іх выконвае толькі некалькі вельмі нескладаных вытворчых рухаў. Але гэта толькі адна з супярэчнасцей капіталістычнай сістэмы. Наколькі-ж гутарка ідзе аб сучасных прыладах вытворчасці, як гэтакіх, то яны абумоўліваюць вельмі высокі ўзровень вытворчага вопыту і вытворча-тэхнічных навыкаў рабочага.

Асноўным пунктам развіцця матэрыяльнай грамадскай вытворчасці з'яўляюцца змяненні, якія адбываюцца ў сферы прадукцыйных сіл грамадства, і перш за ўсё змяненні, якія адбываюцца адносна

---

*) Маркс „Да крытыкі палітычнай эканоміі“ стар. 6, [illegible]

прылад вытворчасці. Іменна ў гэтым заключаецца самая глыбокая прычына таго, што адбываюцца змены аднаго спосабу вытворчасці другім, адной гістарычнай эпохі другой.

> «Эканамічныя эпохі,—пісаў Маркс,—адрозніваюцца не тым, што вырабляецца, а тым, як вырабляецца, якімі сродкамі працы. Сродкі працы не толькі мярыла развіцця чалавечай рабочай сілы, але і паказчык тых грамадскіх адносін, пры якіх адбываецца праца» *).

Змяненні прылад вытворчасці немінуча цягнуць за сабой змены і ў галіне вытворчых адносін паміж людзьмі, а гэта вядзе да таго, што раней ці пазней змяняецца ўвесь жыццёвы уклад людзей.

Кіруючыся гэтым марксісцкім прынцыпам, партыя Леніна-Сталіна рашыла задачу рэвалюцыйнага стварэння новых соцыялістычных адносін.

Пачынаць разварот соцыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне пасля таго, як скончыўся аднаўленчы перыяд нэпа, трэба было з рашэння праблемы соцыялістычнай індустрыялізацыі, каб атрымаць новы, непараўнаўча больш высокі ўзровень прадукцыйных сіл, чым той, які мела дарэвалюцыйная Расія. На падставе соцыялістычнай індустрыялізацыі стварылася магчымасць укараніць у сельскую гаспадарку навейшых прылад вытворчасці — трактароў, камбайнаў і іншых сельскагаспадарчых машын. Па меры іх пранікнення ў нашу сельскую гаспадарку ў вёсцы разрасталася новая катэгорыя работнікаў: трактарыстаў, камбайнераў, машыністаў усякага роду і г. д. Новыя прылады вытворчасці абумовілі стварэнне ў весцы новых кадраў з новымі працоўнымі навыкамі і вытворчым вопытам. Сталінская соцыялістычная індустрыялізацыя стварыла такім чынам у сельскай гаспадарцы новыя соцыялістычныя прадукцыйныя сілы.

Тым часам у весцы ўсё яшчэ колькасна пераважала дробная прыватная аднаасобная сялянская гаспадарка. Супярэчнасць, якая пры гэтым утварылася паміж новымі соцыялістычнымі прадукцыйнымі сіламі і вытворчымі адносінамі аднаасобнай гаспадаркі, супярэчнасць, ні ў якім разе не нечаканая для партыі, магла быць вырашана толькі рэвалюцыйным шляхам, толькі на пачатках масавай калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Усякая спроба як-небудзь інакш вырашыць гэту супярэчнасць немінуча прывяла-б да рэстаўрацыі капіталізма ў нашай краіне.

Калектывізацыя сельскай гаспадаркі прадстаўляла сабою «найглыбейшы рэвалюцыйны пераварот, скачок са старога якаснага стану грамадства ў новы якасны стан, раўназначны па сваіх выніках рэвалюцыйнаму перавароту ў кастрычніку 1917 года» **). Гэты рэвалюцыйны пераварот ліквідаваў самы шматлікі эксплоататарскі клас у нашай краіне — клас кулакоў. Ён забяспечыў панаванне соцыялістычных прадукцыйных сіл і ў сельскай гаспадарцы.

Такім чынам, змена адной грамадскай формы другою адбываецца так, што перш за ўсё змяняюцца прылады вытворчасці, а, значыць, і прадукцыйныя сілы грамадства ў цэлым. Гэта абумоўлівае адпаведныя змены і ў вытворчых адносінах людзей. Стала быць, першынство тут належыць прадукцыйным сілам. Не змены ў галіне вытворчых адносін вызначаюць сабою змены ў галіне прадукцыйных сіл.

---

*) Маркс „Капітал“, т. I, стар. 121.
**) „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)“, стар. 2[illegible]

а, наадварот, —развіццё прадукцыйных сіл грамадства вызначае адпаведнае развіццё вытворчых адносін людзей.

Ці азначае гэта, што вытворчыя адносіны толькі пасіўна следуюць за развіццём прадукцыйных сіл, ніяк не ўплываючы на гэтыя апошнія? Ці азначае гэта, што вытворчыя адносіны ніяк не уплываюць на характар развіцця прадукцыйных сіл? Зусім не. Вытворчыя адносіны развіваюцца у залежнасці ад развіцця прадукцыйных сіл. К прыкладу кажучы, вытворчыя адносіны капіталізма не маглі набыць пануючага значэння да таго часу, пакуль найвялікшае распаўсюджанне мела сярэдневяковая ручная тэхніка. Гэта значэнне яны набылі толькі на базе машыннай тэхнікі. Але, раз узнікшы і склаўшыся на аснове пэўнага узроўню прадукцыйных сіл і набыўшы характар, адпаведны гэтаму ўзроўню, вытворчыя адносіны, у сваю чаргу, набываюць здольнасць, у парадку адваротнага уздзеяння, уплываць на ход развіцця прадукцыйных сіл, паскараючы або замаруджваючы іх развіццё. Так, у наш час, напрыклад, капіталістычныя вытворчыя адносіны тармозяць, затрымліваюць развіццё прадукцыйных сіл, а ў нашай краіне социялістычныя вытворчыя адносіны забяспечваюць гіганцкі размах прадукцыйных сіл Савецкага Саюза.

Гэтага ніяк не хацелі і не хочуць прызнаць рэакцыйныя лідэры II Інтэрнацыянала і іх рускія меншавіцкія падпрацімцы тыпу Суханава Апошні, узводзячы варожы паклеп на нашу рэволюцыю, адмаўляючы яе социялістычны характар, сцвярджаў, што «Расія не дасягнула такой вышыні развіцця прадукцыйных сіл, пры якой магчым социялізм».

Міжнародны апартунізм лічыць, што ўзнікненне социялістычных вытворчых адносін ёсць *пасіўны* рэзультат найвышэйшага развіцця прадукцыйных сіл. Адсюль рэакцыйныя правадыры II Інтэрнацыянала робяць вывад, што існаванне социялізма магчыма толькі ў такой краіне, прадукцыйныя сілы якой дасягнулі найвышэйшага ўзроўню развіцця, у краіне, дзе дасягнута высокая ступень цывілізаванасці і культурнасці. У гэтых сцвярджэннях апартуністы выходзяць з адмаўлення той акалічнасці, што узнікненне социялістычных адносін ёсць вынік актыўнай рэволюцыйнай барацьбы пролетарыята. Контррэволюцыйны сэнс гэтых сцвярджэнняў відавочны. Яны абракаюць пролетарыят на пасіўнае чаканне таго, што развіццё прадукцыйных сіл прывядзе, моў, да ўзнікнення социялістычных адносін як да свайго аўтаматычнага рэзультата. Гэта ёсць адмаўленне гістарычнай неабходнасці социялістычнай рэволюцыі.

Ленін і Сталін з усёй уласцівай ім рэволюцыйнай страсцю бічавалі гэтыя «тэарэтычныя пабудовы» міжнародных згоднікаў. Класікі навуковага комунізма падкрэслівалі актыўны характар вытворчых адносін, асабліва социялістычных адносін, як формы развіцця прадукцыйных сіл у пераходны перыяд. Зразумела, каб у данай краіне магла адбыцца социялістычная рэволюцыя, пэўны ўзровень развіцця прадукцыйных сіл у ёй неабходны. Але пролетарская рэволюцыя стварае новыя социялістычныя вытворчыя адносіны, якія пры даным узроўні прадукцыйных сіл становяцца прадпасылкай і спрыяючым фактарам іх далейшага развіцця.

Крытыкуючы і выкрываючы меншавіка Суханава, Ленін у сваім артыкуле «Аб нашай рэволюцыі» пісаў:

> «Калі для стварэння социялізма патрабуецца пэўны ўзровень культуры... то чаму нам нельга пачаць спачатку з заваяв

вання рэвалюцыйным шляхам прадпасылак для гэтага пэўнага ўзроўню, а потым ужо, на аснове рабоча-сялянскай улады і савецкага ладу, рушыць даганяць іншыя народы.

Для стварэння соцыялізма,—гаворыце вы,—патрабуецца цывілізаванасць. Вельмі добра. Ну, а чаму мы не маглі спачатку стварыць такія прадпасылкі цывілізаванасці ў сябе, як выгнанне памешчыкаў і выгнанне расійскіх капіталістаў, а потым ужо пачаць рух да соцыялізма?» *).

Такім чынам, вытворчыя адносіны, раз узнікшы на базе пэўнага, гістарычна абумоўленага ўзроўню развіцця прадукцыйных сіл, набываюць, у сваю чаргу, здольнасць пэўным чынам уплываць на прадукцыйныя сілы грамадства, паскараючы або замаруджваючы іх развіццё. Але першынствуючую ролю ў гістарычным развіцці грамадскай матэрыяльнай вытворчасці адыгрываюць прадукцыйныя сілы.

«Значыць, прадукцыйныя сілы з'яўляюцца не толькі найбольш рухомым і рэвалюцыйным элементам вытворчасці. Яны з'яўляюцца разам з тым вызначаючым элементам развіцця вытворчасці.

Якія прадукцыйныя сілы,—такімі павінны быць і вытворчыя адносіны» **).

2. Аб асноўных тыпах вытворчых адносін

Чалавек першабытнай эпохі меў у сваім распараджэнні вельмі прымітыўныя прылады працы. Дрэнна завостраная палка, палка з прымацаваным да яе неадшліфаваным каменным наканечнікам, якое-небудзь вельмі недасканалае кайле — вось той набор прылад, пры дапамозе якіх першабытны чалавек вёў барацьбу за існаванне на самай зары чалавечай гісторыі. Потым паяўляюцца лук і стрэлы, грубыя каменныя прылады замяняюцца адшліфаванымі. Чалавек адкрывае карысныя ўласцівасці агня. Ён пачынае вырабляць драўляную і гліняную пасуду.

Прымітыўныя прылады вытворчасці абумовілі вельмі нізкую прадукцыйнасць працы чалавека першабытна-абшчыннай эпохі. У адзіночку ён не здолен быў здабываць сабе сродкі для існавання і абараняцца ад драпежных звяроў. Толькі калектыўныя формы работы, толькі аб'яднанне ў абшчыны дазваляла людзям першабытна-абшчыннага ладу змагацца з прыродай. Умовы жыцця і вытворчасці штурхалі яго, такім чынам, да агульнай калектыўнай працы.

Але ўсё, што калектыўна вытваралася, тое калектыўна і ўжывалася. Як прадметы спажывання, так і прылады і ўмовы працы складалі аб'ект грамадскай уласнасці. Прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці першабытнае грамадства не ведала. Значыць, яно не ведала і эксплаатацыі чалавека чалавекам. Чужым яму быў і класавы падзел грамадства.

Развіццё ў першабытную эпоху ішло вельмі марудна. Праходзілі сотні, а можа быць і тысячы год, перш чым наступалі важныя змены ў характары прылад працы. Раз'яднанасць паміж першабыт-

*) Ленін, т. XXVII, стар. 400 і 401.
**) „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)", стар. 1

нымі абшчынамі, адсутнасць колькі-небудзь рэгулярных менавых і іншых сувязей паміж імі прыводзіла да таго, што вытворчы вопыт, вытворчыя навыкі і адкрыцці адных абшчын вельмі марудна станавіліся здабыткам другіх. Кожная абшчына амаль зусім самастойна, навошчуп даходзіла да тых ці іншых удасканаленняў у сваёй вытворчасці.

Але як ні марудна ішло развіццё, яно ўсё-ж ішло. Ад збірання раслін і пладоў чалавек пераходзіў да іх культывавання. Ад выпадковага палявання за жывелай чалавек пераходзіў да яе прыручэння і развядзення, да жывёлагадоўлі. Земляробства і жывёлагадоўля набывалі ўсё большае распаўсюджанне. [illegible] першае буйнае грамадскае раздзяленне працы—аддзяленне жывелагадоучых плямён ад земляробчых. Ускладняліся з цягам часу прылады працы. Гэта [illegible] да таго, што не кожны аказваўся здольным іх выпрацоўваць. Пачалі вылучацца людзі, якія спецыялізаваліся на вытворчасці [illegible] і прадметаў [illegible]. [illegible] розныя рамёслы. Расло, такім чынам, унутры абшчыны грамадскае раздзяленне працы. Адбывалася другое буйнае грамадскае раздзяленне працы—выдзяленне рамяства.

З'яўляючыся вынікам развіцця прылад працы, рамяство ў сваю чаргу спрыяе іх далейшаму развіццю. Паяўляюцца металічныя прылады працы. Каменны тапор змяняецца жалезным. Набывае пашырэнне саха з жалезным лемехам. Разам з гэтым зяншаецца рабская залежнасць чалавека ад стыхійных сіл прыроды. На аснове прымянення больш дасканалых прылад узрастае прадукцыйнасць працы. Знікае неабходнасць у выкананні вытворчых аперацый значнымі па колькасці калектывамі людзей. Аказваецца магчымым выконваць іх невялікімі групамі ў некалькі чалавек, а потым і зусім у адзіночку. Так, калі раней узрыхленне зямлі, якое рабілася завостранымі палкамі, патрабавала адначасовай работы на невялікім участку дзесяткаў людзей, то паяўленне сахі з жалезным лемехам, якую цягнула жывёла, дазваляе і аднаму чалавеку спраўляцца з ворывам. Так паяўленне новых прылад працы стварыла аснову для яе індывідуалізацыі.

Індывідуалізацыя працэса працы выклікала паяўленне прыватнай уласнасці на яе вынікі. Роўным чынам, прылады вытворчасці, прымяняемыя ў індывідуальнай працы, таксама замацоўваюцца ў прыватнай уласнасці. Пашырэнне прыватнай уласнасці на прылады, умовы і вынікі працы стварае маемасную няроўнасць паміж людзьмі. А гэта выклікае з'яўленне эксплаатацыі чалавека чалавекам.

Узбагачэнне некаторай колькасці асобных гаспадароў параджае ў іх патрэбу ў прымяненні працы дадатковых рабочых у дадатак да працуючых членаў сям'і. Гэта карэнным чынам змяняе адносіны да ваеннапалонных, колькасць якіх у першабытную эпоху заўсёды была значнай з прычыны пастаянных сутычак паміж рознымі абшчынамі. Калі раней іх папросту забівалі, паколькі нізкая прадукцыйнасць працы рабіла нявыгаднай іх эксплаатацыю, то цяпер, на параўнаўча высокім узроўні прадукцыйнасці працы, эксплаатаваць іх ужо выгадна і ў дадатак у гэтым ёсць неабходнасць. Цяпер ужо ваеннапалонныя не забіваюцца, а ператвараюцца ў рабоў. З цягам часу з абшчын вылучаюцца нямногія, рознымі узурпатарскімі шляхамі разбагацеўшыя людзі, кожны з якіх мае значную колькасць рабоў. Узнікае, такім чынам, першы класавы падзел

грамадства. Утвараецца першае класавае грамадства рабаўладальніцкае грамадства.

Так, у выніку развіцця прадукцыйных сіл вытворчыя адносіны эпохі першабытна-абшчыннага ладу змяняюцца вытворчымі адносінамі, спецыфічнымі для рабаўладальніцкага грамадства.

Рабаўладальніцкі лад асноваван на прыватнай уласнасці рабаўладальніка на сродкі вытворчасці. Неад'емнаю адзнакай гэтага ладу з'яўляецца пашырэнне ўласнасці на непасрэднага вытворцу, на раба.

Для першабытна-абшчыннага ладу тыповымі былі каменныя прылады, для рабаўладальніцкага грамадства металічныя прылады вытворчасці.

У эпоху першабытна-абшчыннага ладу жывёлагадоўля і земляробства толькі зараджаліся. У рабаўладальніцкім грамадстве яны набываюць вельмі значнае пашырэнне.

Ст[illegible] працы рабоў, былі [illegible] прыладамі.

У першабытна-абшчынным грамадстве рамяство [illegible]. У рабаўладальніцкім грамадстве рамяство [illegible] стаўлялі сабою буйныя прамысловыя прадпрыемствы, заснаваныя на масавым прымяненні ручной працы рабоў.

Першабытна-абшчынны лад амаль не ведаў абмену, бо ён з'явіўся толькі на канцы гэтага ладу. У эканоміцы рабаўладальніцкага грамадства абмен займае вельмі істотнае месца. У рабаўладальніцкім грамадстве абмен выходзіць за рамкі абшчыны, роду, племені. Узнікае караванны і марскі гандаль паміж рознымі краінамі Захада і Усхода. Узнікаюць і развіваюцца таварна-грашовыя адносіны. Утвараецца асобы клас купцоў і ліхвяроў.

Пры абшчынным ладзе ўзнікненне гарадоў ледзь толькі намецілася. У рабаўладальніцкім грамадстве гарады становяцца цэнтрамі эканамічнага, грамадска-палітычнага, навуковага і культурнага жыцця. Аддзяляецца горад ад вёскі.

Такім чынам, пераход ад першабытна-абшчыннага ладу да рабаўладальніцкага адзначаў для таго часу велізарнае развіццё грамадскай матэрыяльнай вытворчасці і ўсіх форм грамадскага жыцця. Для перадавых краін старажытнага свету рабаўладальніцкі спосаб вытворчасці быў новай, больш высокай ступенню развіцця.

Рабаўладальніцкі спосаб вытворчасці заснаваўся на прымяненні працы велізарных мас рабоў. Гэта надало вытворчасці каласальны па таму часу размах.

> «Рабства стварыла магчымасць больш шырокага раздзялення працы паміж земляробствам і прамысловасцю і, дзякуючы яму, росквіту старагрэчаскага свету. Без рабства не было-б грэчаскай дзяржавы, грэчаскага мастацтва і навукі» *)

Вытворчыя адносіны рабаўладальніцкага грамадства, да пэўнага перыяда, служылі формай развіцця прадукцыйных сіл. Масавае прымяненне працы рабоў дазваляла надаваць вытворчасці той размах, выконваць такія па маштабу вытворчыя аперацыі (як, напрыклад, [illegible]), якія па ўмовах першабытна-абшчыннага ладу былі немагчымы.

*) Энгельс „Анты-Дзюрынг", стар. 167, выд. [illegible]

Але ў прыродзе рабаўладальніцкага ладу з самага пачатку былі закладзены ўнутраныя супярэчнасці.

Раб быў істотай бяспраўнай. Чалавекам яго не лічылі. Рабаўладальнікі ставілі раба на адну ступень з іншымі элементамі вытворчага працэса. Яго разглядалі як «гаворачую прыладу» побач з жывёлай—«мычашчай прыладай» і прыладамі вытворчасці—«нямою прыладай». Раб з'яўляўся поўнай уласнасцю свайго пана і падвяргаўся бязлітаснай эксплаатацыі. У перыяд росквіту рабаўладальніцкага грамадства рабаўладальніку было выгадней выцягнуць з раба максімум магчымага за больш кароткі тэрмін, хоць-бы цаною скарачэння працягласці яго жыцця (набыць новага раба можна было за адносна невысокую плату), чым атрымаць той-жа эфект за больш працяглы час і быць тым самым вымушаным даўжэй карміць раба.

Будучы пастаўлен на адну ступень з мёртвымі рэчамі і з жывёлай, раб аказваўся зусім незацікаўленым у павышэнні прадукцыйнасці сваёй працы. Колькі-небудзь значнае ўдасканаленне прылад працы было немагчыма, паколькі раб «дае адчуць жывёле і прыладзе працы, што ён не падобен ім, што ён чалавек. Дрэнна абыходзячыся з імі і з сапраўднай асалодай падвяргаючы іх папсуццю, ён дасягае ўсведамлення свайго адрознення ад іх. Таму лічыцца эканамічным прынцыпам такога спосабу вытворчасці—прымяняць толькі найбольш грубыя, найбольш нязграбныя прылады працы, якія якраз з прычыны сваёй грубасці і нязграбнасці больш цяжка падвяргаюцца папсуццю» *). Таму да колькі-небудзь значнага ўдасканалення прылад працы, якія ўжываліся ў рабаўладальніцкай гаспадарцы, справа прыйсці не магла. Рамкі, у межах якіх прадукцыйнасць працы магла павышацца, былі даволі абмежаваны. Да пары да часу гэта павышэнне прадукцыйнасці працы ішло, галоўным чынам, за лік максімальнага ўзмацнення эксплаатацыі рабоў. Гэта ўдавалася рабаўладальнікам з дапамогаю асобай, створанай імі ваенна-палітычнай машыны—рабаўладальніцкай дзяржавы. Але па меры росту эксплаатацыі расла і астрала класавых супярэчнасцей рабаўладальніцкага грамадства. Усе больш жорстка працякала класавая барацьба рабоў супроць рабаўладальнікаў, гарадской і вясковай беднаты супроць рабаўладальнікаў і багачоў—гандляроў і ліхвяроў.

Урэшце наступіў такі перыяд, калі магчымасці далейшага павышэння ступені эксплаатацыі рабоў былі ў асноўным вычарпаны. Няспынная эксплаатацыя скарачала працягласць жыцця рабоў. З гэтым можна было не лічыцца, пакуль праца была таннай. Таннасць-жа яе стваралася магчымасцю лёгкага замяшчэння выбываючых рабоў шматлікімі ваенна-палоннымі, якіх рабаўладальнікі захватвалі ў безупынных войнах з навакольнымі народамі.

Але рабаўладальніцкае грамадства заключала ў сабе такія супярэчнасці, развіццё якіх у канчатковым выніку прывяло да падрыву яго ваеннай магутнасці. Войны сталі ўсё радзей канчацца пераможна. Стала быць, пачалі вычэрпвацца крыніцы таннай каштуючых рабоў. Гэта пачало падрываць устоі, на якіх трымалася буйная рабаўладальніцкая гаспадарка. Яна станавілася эканамічна ўсё менш рэнтабельнай, бо раней уся яе перавага заключалася ў масавым прымяненні працы рабоў. Абвастрыўшаяся класавая барацьба расхіствала палітычныя асновы рабаўладальніцкага грамад

*) Маркс „Капіта[illegible]

ства. Усё астрэй праяўляўся паразітызм класа рабаўладальнікаў, якія з пагардаю адносіліся да працы, як да ўдзелу рабоў, затрымлівалася развіццё прадукцыйных сіл грамадства.

Рабаўладальніцкае грамадства зжыла сябе. Спецыфічныя для яго вытворчыя адносіны сталі тормазам далейшага развіцця прадукцыйных сіл. Рабаўладальніцкія латыфундыі пачалі раскладацца.

«Развіццё рымскай сельскай гаспадаркі ў эпоху імператараў,—піша Энгельс,—вяло... да раздрабнення маёнткаў на дробныя арэндныя ўчасткі, населеныя калонамі. У выніку гэтага развіцця атрымала перавагу карлікавая гаспадарка залежных сялян, папярэднікаў больш позніх прыгонных, атрымаў перавагу, такім чынам, спосаб вытворчасці, у якім ужо ў зародку заключаўся спосаб вытворчасці, стаўшы пануючым у сярэднім вякі».

Такім чынам, яшчэ ў нетрах рабаўладальніцкага ладу зарадзіліся новыя адносіны, спецыфічныя для феадальна-прыгонніцкай эпохі. Але мірным шляхам пераход ад рабаўладальніцкага грамадства да феадальна-прыгонніцкага адбыцца не мог. Ён адбыўся шляхам рэвалюцыі. «Рэвалюцыя рабоў ліквідавала рабаўладальнікаў і адмяніла рабаўладальніцкую форму эксплаатацыі працоўных»*). Тым самым рэвалюцыя рабоў расчысціла глебу для пераходу да наступнай грамадска-эканамічнай фармацыі —да феадальна-прыгонніцкага ладу.

На змену рабаўладальніцкаму ладу прыйшоў феадальна-прыгонніцкі лад, заснаваны таксама на эксплаатацыі. Але ён знаменаваў сабою больш высокі ўзровень развіцця прадукцыйных сіл, для якіх у феадальную эпоху характэрна: «далейшае паляпшэнне плаўкі і апрацоўкі жалеза; распаўсюджанне жалезнага плуга і ткацкага станка; далейшае развіццё земляробства, гародніцтва, вінаробства, масларобства; паяўленне побач з рамесніцкімі майстэрнямі мануфактурных прадпрыемстваў» **).

Феадальна-прыгонніцкі лад прадстаўляе сабою крок наперад у параўнанні з рабствам. Праўда, і тут асноўным уласнікам на сродкі вытворчасці з'яўляецца эксплаататар-феадал. У пэўнай форме ён з'яўляецца таксама ўласнікам непасрэднага вытворцы-прыгоннага. Але ўласнасць феадала на працаўніка [illegible] ужо [illegible] ўласнасцю. Ён не мае ўлады на жыццё прыгоннага. У прыгоннага ёсць сваю прыватную гаспадарку, няхай сабе і мізэрную, але заснаваную на асабістай працы. Гэта акалічнасць зацікаўлівае работніка ў павышэнні прадукцыйнасці сваёй працы. Гэта стварае большую прастору для развіцця прадукцыйных сіл, чым пры рабстве. А ў горадзе прамысловай дзейнасці пануючае значэнне набывае прыватная гаспадарка дробных рамеснікаў, якія, хоць і залежны ад феадалаў, гаспадараць самастойна і, значыць, таксама зацікаўлены ў павышэнні прадукцыйнасці сваей працы.

Вось чаму эпоха феадалізма прывяла да буйных зрухаў ва многіх галінах вытворчасці. Паявілася многа новых вынаходак, развілося грамадскае раздзяленне працы, узнік рад новых галін вытворчасці, пачалося друкаванне кніг, рад навін пранік і ў сельскую гаспадарку і т. д.

*) Сталін, „Пытанні ленінізма“, стар 417
**) „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)“, стар. 119.

Аднак, інтарэсы далейшага развіцця прадукцыйных сіл натыкаліся на перашкоды, якія заключаліся ў самой сістэме вытворчых адносін феадалізма.

Характарызуючы асаблівасці прыгонніцкай гаспадаркі, Ленін у сваёй кнізе «Развіццё капіталізма ў Расіі» устанавіў наступныя яго рысы.

Зямля кожнай памешчыцкай вотчыны дзеліцца на дзве часткі на барскую і сялянскую землі. Сялянская зямля апрацоўваецца працай і інвентаром сялян. На ёй сяляне вырабляюць неабходны прадукт. Значная частка вытвараемага сялянамі на сялянскай зямлі прадукта аддаецца памешчыкам у форме аброку. Барская зямля, на якой вытвараецца дадатковы прадукт, апрацоўваецца працай і інвентаром тых-жа сялян. Значыць, тут вытворца надзелен сродкамі вытворчасці. Таму аб'ектам эксплаатацыі з боку прыгонніка ён можа стаць толькі ў парадку «унеэканамічнага прымусу». Вось чаму, хоць у параўнанні з эпохай рабаўладальніцкіх адносін прадукцыйнасць працы пры феадалізме стаяла, у тым ліку і ў сельскай гаспадарцы, на больш высокім узроўні, усё-ж «умовай і вынікам апісваемай сістэмы гаспадаркі быў надта нізкі і руцінны стан тэхнікі, бо вядзенне гаспадаркі было ў руках дробных сялян, задушаных нястачай, прыніжаных асабістай залежнасцю і разумовай цемрай» *).

Як барская, так і сялянская гаспадарка вяліся з дапамогай сялянскага інвентара. Умовамі прыгонніцкай эксплаатацыі сяляне былі асуджаны на жабрацтва, Натуральна, што магчымасці для развіцця прадукцыйных сіл у сельскай гаспадарцы феадальнай эпохі, хоць і больш шырокія, чым пры рабстве, заставаліся ўсё-ж дастаткова абмежаванымі. А цэхавая рэгламентацыя адносна рамяства, існаваўшая ўсюды ў эпоху феадалізма, затрымлівала развіццё прадукцыйных сіл у галіне прамысловай дзейнасці. А тыповыя для феадальнай гаспадаркі натуральна-гаспадарчыя адносіны, абумоўленыя замкнутасцю феадальных вотчын, затрымлівалі развіццё абмену.

Такім чынам, на пэўнай ступені развіцця, прадукцыйныя сілы грамадства уступілі у канфлікт з вытворчымі адносінамі феадальна-прыгонніцкага ладу. Гэты канфлікт праявіўся ў форме рэвалюцый прыгонных сял н супроць памешчыкаў. Рэвалюцыі прыгонных сялян, кіруемыя буржуазіяй, знішчылі феадальны лад, які стаў аковамі далейшага развіцця. Тым самым гэтыя рэвалюцыі, буржуазныя рэвалюцыі эпохі закату феадалізма, расчысцілі глебу для развіцця капіталістычных адносін.

Гэта, вядома, не значыць, што капіталістычныя адносіны зарадзіліся толькі пасля буржуазных рэвалюцый.

> «Буржуазная рэвалюцыя,—гаворыць таварыш Сталін—пачынаецца звычайна пры наяўнасці больш ці менш гатовых форм капіталістычнага укладу, вырасшых і даспеўшых яшчэ да адкрытай рэвалюцыі ў нетрах феадальнага грамадства...
>
> Асноўная задача буржуазнай рэвалюцыі зводзіцца да таго, каб захваціць уладу і прывесці яе ў адпаведнасць з наяўнай буржуазнай эканомікай» **)

---

*) Ленін, т. II, стар. 141

**) Сталін „Пытанні ленінізма“, стар. 111, выд. 11.

Асновай капіталістычных вытворчых адносін з'яўляецца буржуазная ўласнасць на сродкі вытворчасці. Непасрэдны вытворца аддзелен ад сродкаў вытворчасці. Ён уладае толькі сваёй рабочай сілай. Будучы пазбаўленым сродкаў вытворчасці, ён тым самым эканамічна вымушан ператварыцца ў аб'ект капіталістычнай эксплаатацыі. Пагроза галоднай смерці вымушае яго ствараць дадатковую вартасць капіталісту. Ва ўмовах капіталізма існуе таксама прыватная дробная гаспадарка, аснаваная на асабістай працы вызваленых ад **прыгоннай залежнасці селяніна і рамесніка.**

У капіталістычную эпоху прадукцыйныя сілы дасягаюць высокай ступені развіцця. Пры феадалізме тыповымі ў галіне прамысловай дзейнасці з'яўляюцца рамесніцкія майстэрні. Толькі на заходзе феадальна-прыгонніцкай эпохі паяўляюцца мануфактурныя прадпрыемствы. Для капіталізма характэрны велізарныя фабрыкі і заводы. Феадальная тэхніка з'яўляецца пераважна ручной, разлічанай на індывідуальнае прымяненне. Капіталістычная тэхніка ёсць тэхніка машынная, якая мяркуе аб'яднаную дзейнасць вялікіх калектываў.

«Замест самапралкі, ручного ткацкага станка, кавальскага молата паявіліся прадзільныя машыны, механічны ткацкі станок, паравы молат, замест маленькіх майстэрань—велізарныя фабрыкі, якія патрабуюць аб'яднанай працы соцень і тысяч рабочых» *).

Для эпохі прыгонніцтва характэрны дваранскія маёнткі, аснаваныя на выкарыстанні працы прыгонных сялян і іх прымітыўнага інвентара. Пры капіталізме ўсё большае пашырэнне набываюць сельскагаспадарчыя прадпрыемствы капіталістычнага тыпу, аснаваныя на прымяненні працы наёмных рабочых. У гэтых прадпрыемствах шырока прымяняецца агратэхніка, зямля ў іх апрацоўваецца з дапамогай сельскагаспадарчых машын.

Новы тып прадукцыйных сіл мяркуе і іншага работніка.

«Новыя прадукцыйныя сілы патрабуюць, каб работнікі вытворчасці былі больш культурнымі і кемлівымі, чым забітыя і цёмныя прыгонныя, здольнымі зразумець машыну і правільна абыходзіцца з ёю. Таму капіталісты лічаць за лепшае мець справу са свабоднымі ад прыгонных узаў наёмнымі рабочымі, дастаткова культурнымі для таго, каб правільна абыходзіцца з машынамі» **).

Капіталізм знішчае ўласцівую феадалізму раздробленасць і замкнутасць. Вытворчасць усё ў большай меры набывае характар грамадскай вытворчасці. Яна «ператварылася з раду разрозненых намаганняў адзінак у рад грамадскіх дзеянняў, а прадукты з твораў асобнага чалавека—у творы ўсяго грамадства» ***).

Але пры ўсім гэтым прысваенне застаецца прыватным, бо як умовы і сродкі працы, так і яе вынікі—гатовыя прадукты, зна-

*) Энгельс „Анты-Дзюрынг", стар. 253.
**) „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)", стар. 120.
***) Энгельс „Анты-Дзюрынг", стар. 253—254.

ходзіцца ў прыватнай уласнасці капіталістаў. Гэта стварае тую супярэчнасць, якая з'яўляецца асноўнай і спецыфічнай для капіталізма,—процілегласць паміж грамадскім характарам вытворчасці і прыватнаю формай прысваення. З гэтай супярэчнасці вынікае цэлы рад іншых, якія з'яўляюцца вытворнымі ад гэтай галоўнай і асноўнай супярэчнасці.

Вырастаўшы да жыцця каласальных размераў прадукцыйныя сілы, капіталізм аказаўся не здольным з імі справіцца, заблытаўшыся ў невырашымых для яго супярэчнасцях. Вытворча-тэхнічны апарат капіталізма здолен выпускаць велізарныя масы тавараў. Абуралаемыя прагнасцю усё большай прыбыткі, падхлестваемыя узаемнай канкурэнцыяй, якая усё больш абвастраецца, капіталісты яшчэ больш павялічваюць магчымасці вытворчасці, затрачваючы дадатковыя капіталы на пабудову новых прадпрыемстваў, на ўстаноўку новых станкоў. Але, з другога боку, капіталізм разарае і ператварае ў пролетарыяў усё большую колькасць дробных і сярэдніх уласнікаў. Ступень эксплаатацыі пролетарыяў усё больш узрастае. Гэта зніжае пакупальную здольнасць мас. Тавары не знаходзяць сабе належнага збыту. Узнікаюць перыядычныя крызісы перавытворчасці, якія расхістваюць капіталістычную сістэму. Абвастраюцца класавыя супярэчнасці капіталізма.

Паміж характарам прадукцыйных сіл і капіталістычнымі вытворчымі адносінамі ўзнікаюць непрымірымыя супярэчнасці. Асаблівай астрыні яны дасягаюць на вышэйшай стадыі капіталістычнага развіцця—у эпоху імперыялізма. На гэтай стадыі пануючае значэнне набываюць капіталістычныя манаполіі, якія тармозяць развіццё прадукцыйных сіл. На гэтай стадыі асабліва рэльефна выступае паразітычны характар класа капіталістаў, асаблівага напружання дасягаюць класавыя канфлікты, якія ў канчатковым выніку завяршаюцца рэвалюцыяй пролетарыята, падтрымліваемага паўпролетарскімі элементамі горада і вёскі.

> «Гэта значыць, што капіталістычныя вытворчыя адносіны перасталі адпавядаць стану прадукцыйных сіл грамадства і сталі ў непрымірымую супярэчнасць з імі.
>
> Гэта значыць, што капіталізм чравам рэволюцыяй, заклікаңай замяніць цяперашнюю капіталістычную ўласнасць на сродкі вытворчасці соцыялістычнай уласнасцю»*).

У агні пролетарскай рэволюцыі нараджаецца рэволюцыйная ўлада рабочага класа, яго дыктатура. Падаўляючы супраціўленне эксплаататарскіх класаў, бязлітасна выкарчоўваючы іх агентуру, умацоўваючы саюз з працоўным сялянствам і сувязі з пролетарыямі іншых краін, выкарыстоўваючы сваю ўладу для ўмацавання абароназдольнасці краіны, дыктатура рабочага класа будуе на развалінах капіталізма новае, соцыялістычнае грамадства. Яно пабудавана ўжо пакуль толькі ў СССР.

Асновай соцыялістычных парадкаў у СССР з'яўляецца соцыялістычная сістэма гаспадаркі і соцыялістычная ўласнасць на прылады і сродкі вытворчасці.

---

*) „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)“, стар. 120.

Капіталістычная ўласнасць на сродкі вытворчасці ў СССР ліквідавана. Гэтым самым у СССР знішчана самая аснова і магчымасць эксплаатацыі чалавека чалавекам. Таму ў нашай краіне няма ні эксплаататараў, ні эксплаатуемых. Савецкае грамадства пабудавана на садружастве двух класаў—рабочага класа і калгаснага сялянства. У адзіным з імі працоўным страі ідзе і сацыялістычная інтэлігенцыя. Чым далей мы прасоўваемся па шляху да камунізма, тым больш сціраюцца класавыя грані, тым больш згладжваюцца палітычныя супярэчнасці паміж рабочымі, сялянамі і інтэлігенцыяй.

Усе багацці, ствараемыя рабочым класам у капіталістычнай вытворчасці, прысвойваюцца буржуазіяй. Частку гэтых багаццяў капіталісты расходуюць на задаволенне сваіх асабістых паразітычных патрэб, другая частка ідзе на пакрыццё спажытых у вытворчасці сродкаў вытворчасці, каб капіталістычны працэс вытворчасці ішоў бесперапынна. Трэцяя частка накіроўваецца ў фонд капіталістычнага накаплення, каб працэс здабывання дадатковай вартасці ішоў на расшыранай аснове. І толькі нязначная частка ствараемых багаццяў дастаецца іх стваральнікам рабочым у выглядзе заработнай платы.

У нашай краіне ўсе ствараемыя багацці ідуць на задаволенне патрэб працоўных і толькі іх. Частка гэтых багаццяў расходуецца на задаволенне асабістых патрэб працоўных. Гэтыя багацці ў іншых сваіх частках выкарыстоўваюцца для аднаўлення зношанага абсталявання, расшырэння вытворчасці, умацавання абароназдольнасці краіны, палепшання культурнага абслугоўвання працоўных, на ахову здароўя і т. д. Паразітычнае існаванне ў СССР знішчана. У нашай краіне ажыццёўлены прынцыпы сацыялізма: «Хто не працуе, той не есць», «Ад кожнага па яго здольнасцях, кожнаму—у меру колькасці і якасці яго працы».

Капіталістычныя вытворчыя адносіны прасякнуты індывідуалізмам і эгаізмам, праследаваннем асабістых мэт за кошт эксплаатацыі іншых. Адносіны паміж рознымі капіталістамі ёсць адносіны жорсткай канкурэнцыі. Над рабочымі пануе дысцыпліна голаду, эканамічнага прымусу.

Сацыялістычная рэвалюцыя стварыла ў нашай краіне зусім новую арганізацыю працы, заснаваную на свядомай дысцыпліне працоўных. Паміж вольнымі ад эксплаатацыі работнікамі устанавіліся адносіны таварыскага супрацоўніцтва і сацыялістычнай узаемадапамогі. Усяго ярчэй гэтыя адносіны праявіліся ў сацыялістычным спаборніцтве і стаханаўскім руху. Стаханаўцы не робяць сакрэту са сваіх дасягненняў. Наадварот, сіла і веліч стаханаўскага руху, паміма ўсяго іншага, заключаецца ў тым, што стаханаўцы усяляк дапамагаюць другім авалодваць перадавымі метадамі работы. Раўняцца па перадавых, дапамагаць адстаючым, агульнымі сіламі паскараць наш рух да камунізма—вось асноўны прынцып сацыялістычнага спаборніцтва. Праца з цяжкай павіннасці ператварылася ў нашай краіне ў справу чэсці, справу славы, справу доблесці і геройства.

Вытворчыя адносіны сацыялізма поўнасцю адпавядаюць становішчу і характару прадукцыйных сіл. Грамадскаму характару працэса вытворчасці адпавядае грамадская ўласнасць на сродкі

вытворчасці. Вось чаму ў нас знішчаны і анархія вытворчасці, і перыядычныя крызісы перавытворчасці, і звязаныя з імі галеча і голад мас, і беспрацоўе і ім падобныя ўласцівыя капіталізму з'явы.

Наша соцыялістычная вытворчасць вядзецца дзяржавай рабочых і сялян па навукова распрацаванаму плану Партыя Леніна—Сталіна, мабілізуючы энергію працоўных на яго выкананне, кіруецца пры гэтым мэтай—сістэматычна павялічваць багацці нашай краіны, каб можна было ўсе паўней задавальняць растучыя матэрыяльныя і культурныя запатрабаванні працоўных, каб можна было тым больш умацаваць абараназдольнасць і незалежнасць нашай радзімы.

Новыя соцыялістычныя вытворчыя адносіны ствараюць магчымасці для нябачанага развіцця прадукцыйных сіл. Нідзе і ніколі вытворчасць не развівалася такімі хуткімі тэмпамі, як у нашай краіне. Па тэмпах развіцця наша прамысловасць заняла першае месца ў свеце. Роўным чынам і па тэхніцы вытворчасці мы дагналі і перагналі галоўныя капіталістычныя краіны. Соцыялізм у асноўным мы пабудавалі, і цяпер, як гэта ўказана ў рашэннях XVIII з'езда ВКП(б), наша радзіма ўступае ў паласу развіцця—у паласу завяршэння будаўніцтва бескласавага соцыялістычнага грамадства і паступовага пераходу ад соцыялізма да комунізма. Цяпер на чарзе рашэнне асноўнай эканамічнай задачы СССР—дагнаць і перагнаць найбольш развітыя капіталістычныя краіны таксама і ў эканамічных адносінах, г. зн. у сэнсе размеру вытворчасці на душу насельніцтва.

* • *

Такім чынам, гісторыя грамадска-эканамічных фармацый паказвае, што развіццё вытворчых адносін адбываецца ў залежнасці ад развіцця прадукцыйных сіл грамадства. Змены, якія адбываюцца з імі, рана ці позна выклікаюць адпаведныя змены ў вытворчых адносінах.

> «Набываючы новыя прадукцыйныя сілы, людзі змяняюць свой спосаб вытворчасці, а са зменай спосабу вытворчасці, спосабу забеспячэння свайго жыцця,—яны змяняюць усе свае грамадскія адносіны» *).

Пры гэтым справа абстаіць не такім чынам, што ўзнікненне новых прадукцыйных сіл і адпаведных вытворчых адносін адбываецца недзе ў баку ад старога ладу. Роўным чынам было-б памылкай уяўляць справу так, што спачатку знікае стары лад, а потым узнікаюць прадукцыйныя сілы і вытворчыя адносіны, характэрныя для новага ладу. На самой справе развіццё адбываецца так, што новае ўзнікае яшчэ ў нетрах старога. Яшчэ задоўга да буржуазных рэвалюцый, замяніўшых феадальна-прыгонніцкі лад капіталістычным, у нетрах феадальнага грамадства зарадзіліся і развіваліся капі-

---

*) Маркс і Энгельс, т. V, стар. 364

цыялістычныя адносіны: расслаенне дробных вытворцаў прывяло да выдзялення багацеючых гаспадароў, якія ўсё часцей прыбягаюць да эксплаатацыі наёмнай працы, з'явіліся першыя мануфактурныя прадпрыемствы, пачаўся працэс пролетарызацыі дробных вытворцаў і інш. Яшчэ да таго, як была зламана магутнасць старадаўняга Рыма, рабаўладальніцкія латыфундыі пачалі распадацца на дробныя гаспадаркі, і рабаўладальнікі пачалі ператвараць рабоў у калонаў—папярэднікаў больш позніх прыгонных сялян.

Важна таксама падкрэсліць прыведзеную ўжо вышэй мысль, што ўзнікненне новых прадукцыйных сіл і адпаведных ім вытворчых адносін адбываецца не ў сілу свядомай, праднамеранай дзейнасці людзей, а зусім стыхійна, незалежна ад волі і свядомасці людзей. Людзі не могуць свабодна, па сваёй волі выбіраць сабе той ці іншы спосаб вытворчасці, бо «кожнае новае пакаленне, уступаючы ў жыццё, застае ўжо гатовыя прадукцыйныя сілы і вытворчыя адносіны, як рэзультат работы мінулых пакаленняў, з прычыны чаго яно павінна прыняць на першы час усё тое, што застае ў гатовым выглядзе ў галіне вытворчасці, і прыстасавацца да іх, каб атрымаць магчымасць вырабляць матэрыяльныя здабыткі». Да таго-ж, «паляпшаючы тую ці іншую прыладу вытворчасці, той ці іншы элемент прадукцыйных сіл, людзі не ўсведамляюць, не разумеюць і не задумваюцца над тым, да якіх грамадскіх рэзультатаў павінны прывесці гэтыя паляпшэнні, а думаюць толькі аб сваіх будзённых інтарэсах, аб тым, каб аблягчыць сваю працу і дабіцца якой-небудзь непасрэднай, адчувальнай выгады для сябе» *).

І калі, у канчатковым выніку, такія палепшанні, што ўтвараюцца над прыладамі вытворчасці, прыводзяць да буйных грамадскіх змяненняў у сэнсе ўзнікнення новых прадукцыйных сіл і адпаведных ім грамадскіх адносін, то гэта зусім не з'яўляецца вынікам загадзя пастаўленай і свядома дасягаўшайся мэты.

Але так развіццё можа працякаць толькі да пэўнай мяжы. Пасля таго, як новыя прадукцыйныя сілы даспяваюць і існуючыя вытворчыя адносіны пачынаюць тармазіць іх далейшае развіццё, клас, пануючы ў грамадстве, для якога характэрны ўстарэўшыя вытворчыя адносіны, які змагаецца ўсімі сіламі за іх захаванне, павінен быць скінут з гістарычнага шляху. Інакш як рэволюцыяй гэта не можа быць зроблена. Але рэволюцыя мяркуе свядомую дзейнасць класаў, якія яе здзяйсняюць.

Калі існуючыя вытворчыя адносіны з форм развіцця прадукцыйных сіл ператвараюцца ў іх аковы, калі на гэтай глебе ўзнікае канфлікт паміж новымі прадукцыйнымі сіламі і старымі вытворчымі адносінамі, то гэты факт знаходзіць сваё праяўленне ў барацьбе класаў. Рэакцыйныя класы імкнуцца захаваць былыя вытворчыя адносіны, каб тым самым захаваць сваё панаванне. Рэволюцыйныя-ж класы, выражаючы новыя эканамічныя патрэбы грамадства, змагаюцца за знішчэнне старых, прагніўшых вытворчых адносін. Грамадскія ідэі, палітычныя перакананні, тэорыі, пад сцягам якіх гэтыя класы змагаюцца, авалодваюць масамі і дазваляюць ім свядома знішчыць сілаю старыя парадкі і ўстанаўляць новыя.

Так было ў вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі ў нашай краіне. Натхняемыя вялікімі ідэямі Маркса—Энгельса—

*) „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)", стар. 122—123.

Леніна—Сталіна, працоўныя масы нашай радзімы, пад кіраўніцтвам вялікай партыі Леніна—Сталіна, выкарчавалі старыя капіталістычныя парадкі, устанавілі новыя, соцыялістычныя адносіны і цяпер, узброеныя гістарычнымі рашэннямі XVIII з'езда ВКП(б), пераможна ідуць да комунізма.

Ад рэдакцыі

У № 10 журнала «Большэвік Беларусі» заўважаны наступныя памылкі друку: 1) На стар. 48, у трэцім радку зверху, надрукавана «разумеюць»— трэба чытаць «не разумеюць»; 2) На стар. 84, у дваццаць восьмым радку зверху трэба чытаць «ад 7 лістапада».

Уп. Галоўліта БССР № 673.
Тыраж 10.000 экз.
352 150 друк. зн. (5½ арк.).
Здана ў набор 27/XI-39 г.
Падпісана да друку 11/XII-39 г.

РЭДКАЛЕГІЯ.

Друкарня імя Сталіна, Мінск, Дом Друку. Зак. № 1164.

ЦАНА 40 кап.